# ПЕРШАЯ НАВУКА ЗАКОНУ БОЖАГА

## З БЕЛАРУСКА-СЛАВЯНСКІМ БУКВАРОМ.

### Пасобнік для беларускае школы і сям'і.

Выданьне другое, папраўленае
і дапоўненае, пад рэдакцыяй кандыдата
багаслоўя С. К. Паўловіча.

Прагледжана Віленскай Камісіяй па разгляду
беларускіх падручнікаў Закону Божага.

ВАРШАВА.
Друкарня Сынадальная.
1 9 3 6.

vytoki.net

# Першая навука Закону Божага

## з беларуска-славянскім букваром.

---

беларускае школы і сям'і.

Выданьне другое, папраўленае
і папоўненае, пад рэдакцыяй кандыдата
багасловія С. К. Паўловіча.

Прагледжана Віленскай Камісіяй па разгляду
беларускіх падручнікаў Закону Божага.

асіліць

---

ВАРШАВА.
Друкарня Сынадальная.
1 9 3 6.

vytoki.net

З багаслаўленьня ЯГО БЛАЖЭНС
Блажэньнейшага ДЗІАНІСІЯ Мітрап
Варшаўскага і ўсяе Польшчы.



# Да дзяцей.

Добрыя дзеткі жадаюць быць разумнымі і хочуць вучыцца. Гэта прыгожа. Я буду вас вучыць, дзеткі, а вы старайцеся ўважна слухаць і добра вучыцца. Пачнём-жа з Божай помаччу. Давайце, дзеткі, памолімся шчыранька, каб Бог памог нам хутка асіліць усю азбуку і навучыцца чытаць.

---

Пры вучэньні дзяцей дома няхай маці або хто яе заступае ў сям'і — падчас заняткаў з дзяцьмі гутарыць з імі аб Богу і жыцьці набожным і навучае іх малітвам. Кожную малітву трэба навучыць чытаць правільна, без ніякае памылкі. Ка... дзіця можа ўжо само чытаць, хай карыстаецца гэтай кніжка... як малітвеньнікам, чытаючы па ёй малітвы штодня, рана... ўвечары. Пасьля гэтага без асаблівых труднасьцяў выву...аць дзеці малітвы напамяць.

vytoki.net

## аА

а-а-а [1)]

## уУ

у-а
уа

а-у-у-у [2)]

## мМ

му-му ма-ма
ам-ам мама

## хХ

му-ха ха-ха-ха
муха ах, ух

## сС

с-с-с [3)] саха
са-ха суха
су-ха сума (су-ма)

## рР

аса р-р-р [4)]
раса рама (ра-ма)
рама раса (ра-са)

## ыЫ

рама-рамы нара
сыр-сыры мара
мур-муры рама

## нН

сын-сыны
насы (на-сы)
нара (на-ра)

Мы у мамы. У мамы сын. Сума у Рамана. Муха на сыры. Рама суха. Саха суха. Ах, аса!

1) Як у калыханцы.
2) Як выцьцё ваўка.
3) Як сычэньне гускі.
4) Як вурчаньне сабакі.

vytoki.net

## шШ

мыш-мышы
шаша
шына
машына
(ма-шы-на)
шнуры

## лЛ

ласы на сыр
Раман лысы
Шура шыла

ласы (ла-сы)
лысы (лы-сы)
Лыса
шыла
шула
Шура

Мама, аса на сыры. Нара мышы. Лыса ласуха. Наш шнур малы. У мамы мала сала. Шыны у машыны. На шашы рушыла машына.

## оО

ох-ох-ох
мох
рос
нос-насы
Сымон
услон

## кК

каса-коска
кош-кошык
саха-сошка
шнуры
скуры

рама крама
раса кол-калы
краска куры (ку-ры)
Лыса каша (ка-ша)
Лыска рука (рук)
Сымонка крук

Рака шырака. На суку сарока. Калыска у Лукаша. У кошыку салома. У мурох шашок. Шарык ласы на малако. Мама насушыла моху. У нары шолах мышы. У крамах косы, скуры, кашы. Каса на круку.

## вВ

## іІ

вока (во-ка) валы (ва-лы) насы насі
вуха вілы сані сіні
вусы міска - міскі коні
валасы (ва-ла-сы) вішні імшары Крынкі
сава хворы валошкі

Конік сівы. Мухі кусалі карову. Сымонавы сушылі віку. Вышлі хмары на нашы валокі. Мама шаравала лавы і вокны. Сымонка, насі вішні. Іван і Міколка Хролавы лавілі ракі. У мурох совы і шашкі. Варона каркала на суку: кар... кар... кар...

Іона. Іоанн. Ісус. Наш храм харошы. У Крынках харошы храм і школа.

---

## пП

## тТ

лапа - лапы - лап кот кут кот - каты
капа - копы - коп кнот куст плот - платы
снапы - сноп кот путы кут - куток
пух крот пуста тата
паша карыта тутун
аполак капыта асот
піла - пілка плыт - плыты капыта
Курта ніткі

Снапы у копах. У паху рана. Рана раса на пракосах. Нашы палоскі па раку. Палашка палола мак. Лыка пашло на пасталы. На таку акалот. Тут хата Антонова, а там Астапава. У лапуху рапуха. Апанас куры пас. Карова пашла на атаву. Шпак-птушка. Каршун таксама птушка.

Ісус Хрыстос. Апостал Іоанн. Апосталы Сіман, Піліп і Хама. Пасха Хрыстова. У манастыры храмы. На храмах купалы. У храмах іконы.

---

## бБ

## еЕ

рама
брама

баба бок елка пасека
рыба абібок аер палена
бурак абрубак сена бубен
босы аброк лоб - лоба серп бусел
буслы шыба Ева кубел
боты рыбак торба вербы
работа парабак труба Менск.

Лыска рабы, а Бобік белы. У школе летам пуста. Сарока - белабока. У кутку скрабла мышка. Летам у лесе шмат кветак і птушак. Бабка наварыла міску бобу і мы елі. Усе паселі навакол стала. Рука руку мые.

vytoki.net

Хлеб белы. На Беларусі шмат лесу. Направа ад лесу было балота.

Вера. Барбара. Бутрым.

---

# Жж Дд

жаба лужа
жыта сажа
жонка кажух
жорны кажан
ніва - жніва

дом
дым
дуб
доктар

дуда - дудка
калода - калодка
молат
малады-малодка
дужы

сады - сад
пуды - пуд
жалуды - жолуд
вуда-вудка

Пад дубам жалуды. У жука вусы. Наш Жук — добры сабака. Бабы жалі жыта. У холад кожын молад. Дохтарка дала хвораму парашкі. Вожык ласы на вужы, на мышы. Беларус шануе родны дом. На лужынах тужліва кумкалі жабы. Тутун у кажусе. Дровы паклалі на двары. Па шашы ехалі самаходы.

Ні мукі пылінкі, ні солі драбінкі, ні пітва расінкі.

# Зз Гг

замок мароз воз
зорка музыка вузка
заслона
збан козы кусака
зубы казлы кузака

воз
гвозд
луг
плуг

гара
губа
гоні
гуз
гарох

гарод
горад
пуга
дуга - дужка
дарога-дарожка

Беларус — добры гаспадар. Мама зрабіла тры градкі пад гуркі. За садам наш гарод. Ззаду гумна была абора. Ганка пашла замуж у Грынкі за Тараса Гарбуза. Вада размыла дарогу. Згінула гора, згінула туга. З коміна дым угару — на пагоду. Мама казала казку. Век казуркі кароткі.

У другім аддзеле зараз Закон Божы. Бяз Бога ні да парога.

«Спары, Божа!» казалі работнікам на полі.

## Каза.

Па - за садам, блізка лесу, вырасла лаза. Прышла каза. Шмат каза папсавала лазы. Лаза засохла, і мала ежы казе.

# цЦ

цапы пацук хлапец
цыбук па - ц - ук шавец
цыган дубец
вецер ланцуг кравец
зацірка лан - ц - уг акраец

купец — купца
дубец — дубца

# ь

стол вугол брат булка
столь вуголь брацьбульба

молат - малоць

каса мех
Коська асіна сьмех
косьць асьміна сьмецьце
зьвер Кузьма
Зьміцер

Багаты Цімошка: сабака ды кошка. Жабы жывуць на балоце. Усе мае зборы — лапці ды аборы. Кошцы жартушкі, а мышцы сьмерць на вуме. Цаліну вельмі трудна гараць. Малацьбіты цапамі малацілі пшаніцу. Бацька і маці дасталі з кішані гасьцінцы. «Сыць, Божа!» — кажуць у нас, калі есьць хто за сталом. Полацак — стары горад Беларусі, таксама Слуцак і Клецк. На пожні цьвіркалі скакунцы, або конікі. Збожжа адсыпалі на насеньне. У вушох зазьвінела. М... ...ец самы малы.

vytoki.net



# Ў

роў лаўка
кроў Аўген
каўнер Рудаўка
каўбаса здароўе
стаўбун жыў
Стоўпцы пісаў

# эЭ

цела — цэлы цэп
цені — цэны гарэх
шэры трэска
шэршань стрэл
жэўжык
крэсіва набэдрыкі жэрдка

Конь быў у аўсе. Воўк вырваў аўцу са стада і павалок у лес. Ні швец, ні жнец, ні ў дуду ігрэц. Жураўлі нізка — зіма блізка. Мароз — сто пудоў на воз. Праўда і крыўда ў сварцы жывуць. Рэдкі сьмехі і пацехі ў бедака. Папаў, як у нерат: ні ўзад, ні ўперад. Вужака грэецца на сонцы.

Хто гарэ, хто барануе — усіх Бог параўнуе. Хто рана ўстае, таму Бог дае... Трэба шанаваць бацькоў. Нікому не рабеце злога. Грэх завідаваць. Сьвет цэлы ў руках Божых.

---

# яЯ

яма Венік - вянок
ягня блыха - бляха
язык

# чЧ

сук - сучок
чыж лешч
чуб шчака
чорт шчаціна

ягада знаць - зьняць
мяжа смык - смычок
цяля воля грэбля
жняя доля Пярэста Шаулічы

чарот прозьвішча
чарод Шаркаўшчына
чарапок Бацькаўшчына
калач Зарэчча

У бары што хочаш бяры. На яду мастак, на работу сяк-так. Хрушчы вельмі нішчаць дрэвы. Ярмо для вала, аброць для каня. Поўсьць у ваўка даўгая, густая, шэрая. Наўбоччы сяла стаяла старэнькая царква. Ільля наробіць гнільля. Прыйшла Прачыста — стала поле чыста. Поўнач пеўні пракрычалі. Вільня — вялікае места. Янка Купала і Якуб Колас — беларускія паэты. Свая сярмяжка нікому не цяжка.

**Загадка.** Чатыры чатырнічкі, на кожным чатырнічку пяць пяцернічкаў. Беленькія курачкі з падпечча глядзяць.

Богу памаліся, ды за работу бярыся. Божа, памажы, а ты, нябожа, не ляжы. У Вялікі Чацьвер сьвяшчэньнік прычасьціў усіх нас, вучняў. Спас — усяму час.

vytoki.net



# Й

кіі - кій мой хвойка
раі - рой май байка
гнаі - гной дай лейка
вей шыйка
краіна - край сей жуйка
паіць - пойла Сяргей вясной
заіка - зайчык вясялей

Беларусь — мой родны край. Хоць і ў родным краі, але не ў раі. Няхай Бог крые нас ад усялякага няшчасьця. Слухайце настаўнікаў вашых. Хлопча, захоўвай чыстату — не качайся ў пяску, не бяры рукамі гразі. Перад ежай і пасьля ежы мый зубы. Ня тры вачэй кулаком, дый яшчэ нямытым. Кулік чайку ўзяў за чубайку. Андрэй за ўсіх мудрэй. У вырай рана птушачкі ляцяць. Калі кошка мыецца лапай — гасьцей варажыць. Працуй да поту, а еж у ахвоту. Прыйшоў Пятрок — адпаў лісток; прыйшоў Ільля — адпала два.

———

Першы чалавек і гаспадар у Польшчы — Прэзыдэнт. Цяпер Прэзыдэнтам прафэсар Ігнат Масьціцкі.

# ДЗЬ ДЗ ДЖ ЮЮ

| | | | |
|---|---|---|---|
| дзеці | дождж | уюн | маю |
| дзень | сяджу | цюцька | мыю |
| дзьверы | хаджу | юшка | чую |
| рэдзька | барджэй | юргіня | п[illegible] |
| дзядзька | ураджай | Юлька | клею |

Сядзіць на кані, а пытаецца, дзе конь. Годзе табе бібікі біць, казаў бацька. Не ўважай на ўраджай, а жыта сей. Два суседы едуць, дзьве суседкі ядуць. Званок у полі дзын-дзын. Вужакі і жабы абуджаюцца на вясну. Дзякуем за хлеб, за соль, за кашу, дый за міласьць вашу. Барбара масьціць, а Мікола гвазьдзіць. Луста ды капуста, ня будзе ў жываце пуста. Паўлюк сеў на крук. Юры пасець каровы, а Мікола — коні. Надзьмуўся, як мыш на крупы. Аднаго Юрку ўпусьцілі, і ўся хата заюрылася. На Узьвіжаньня пару — гадзіны і вужакі хаваюцца ў нару.

**Прыказка.** Каб ня ежка, не адзежка, дык была-бы грошай дзежка.

**Загадка.** Маю рогі, маю ногі, як багаты, так убогі ля мяне ўсе сядаюць, — дык скажы, як называюць. Каля ямы сядзяць з кіямі.

### Каток і козьлік.

Там коцік вусаты па садзіку бродзіць,
а козьлік рагаты за коцікам ходзіць...
І лапачкай коцік ловіць свой хвосьцік,
а козьлік — сівою трасець барадою.

vytoki.net



# ёЁ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| пень | возера | сястра | вясло | есьць |
| пянёк | вазёры | сёстры | вёслы | ёсьць |

| | | |
|---|---|---|
| лёд | жывёла | кацянё |
| клён | калёсы | мышанё |
| цёпла | самалёт | шчанё |

На Беларусі шмат ёсьць вёсак з назовам «Навасёлкі». Калі ёсьць у мяшку, будзе ў гаршку. Есьць за вала, робіць за камара. Кукарэку — баба ў рэку, а дзед за ёю — з качаргою. Сёлета ўсё на полі добра: і жыта ядраное, і ячмень — вусач і авёс — касмач. Наш Васіль на работу ня сіл, а як клёцкі ў малацэ — за чацьвярых валачэ. Там,у гары, з-па-над Нёмна сяло глядзела з сіня — цёмна. Прыйшлі куры на хаўтуры: варабейка памёр. Сьвяты Пётра ў косы звоніць, а сьвяты Павал граблі робіць. Сёмуха — вясёлае сьвята.

**Загадка.** Летам ёлка, а зімою цёлка.

———

Першы Маршал Польшчы — Язэп Пілсудскі. Ён адбудаваў сучасную Польшчу. Памёр 12 траўня 1935 г. Пахаваны ў Кракаве. Каля Кракава сыплюць на чэсьць Яго вялізарны курган.

## Фф апостроф ’ (слав. Ъ)

| | | |
|---|---|---|
| фасоля | фатаграфія | аб‘езд |
| фабрыка | торф | ад‘езд |
| фэльчар | фальварак | пад‘ яжджаць |
| флюс | Мітрафан | зрэб‘е |
| фігура | Дарафей | надвор‘е |

| | |
|---|---|
| сям‘я | п‘е |
| Дзям‘ян | п‘яны |
| Лук‘ян | звар‘яцеў |
| пер‘е | д‘ябал |
| узгор‘е | Забор‘е |

Мурза зафыркала на сабаку. Фанераю абіваюць шафы, шуфляды. На жабраку адно зрэб‘е. Зачыні ўжо фортку. Ёсьць павер‘е: ня можна ката вазіць на возе. На Грамніцы нап‘ецца певень вадзіцы, а на Юр‘я наесцца вол травіцы. Ня я б‘ю, вярба б‘е: за тыдзень Вялікдзень. Хто сее ў лёд, той п‘е мёд. Як прыйдзе Юр‘ева раса — не патрэбна коням аўса. Плакаў, плакаў — усё Бог аднакаў, а як (Пятрук) пачаў скакаць, тады Бог пачаў даваць.

**Загадка.** Два вяпры між сабою б‘юцца, сякуцца, аж з іх пена цячэ.

Соф‘я, Вера, Надзея і Любоў. Іх сьвята — 17-30 верасьня. Мар‘і — 1-14 красавіка.

vytoki.net



## ПРАКТЫКАВАНЬНІ Ў ЧЫТАНЬНІ.

**Поры году:** вясна, лета, восень, зіма.

**Назовы месяцаў:** год мае дванаццаць месяцаў: студзень, люты, сакавік, красавік, травень, чэрвень, ліпень, жнівень, верасень, кастрычнік, лістапад і сьнежань.

**Дні тыдня:** нядзеля, панядзелак, аўторак, серада, чацьвер, пятніца і субота.

**Краі сьвету:** усход, захад, паўдзён, поўнач.

**Перамены месяца:** маладзік, поўня, сход, ветах.

### Квактуха - сакатуха.

Квактуха - сакатуха яечкі клала,
малых гадавала, добра даглядала.
Вырасьлі дзеткі,па шлі на палеткі,
сталі матку пакідаці, сваё гнязьдзечка
будаваці.

### Самавукам.

Мне 9 гадоў. Хацеў хадзіць у школу, але не прынялі: няма месца. Тата кажа: «будзеш сам вучыцца. Верка будзе табе памагаць». Назаўтра Верка прынясла «Беларускі буквар». Я пачаў чытаць; мама, муха, саха... Часам Верка бярэ выразаныя і на-

клееныя на тоўстую паперу буквы і кажа мне складаць словы. Мяне вельмі цікавіла, як з асобных букваў выходзяць словы, а пасьля і сказы. Мой малодшы брацік заўсёды прыглядаецца, як я вучуся: перабірае буквы, штосьці ні то піша, ні то малюе, пасьля дэклямуе падслуханыя вершы. Пазьней Верка толькі пакажа мне новую букву, а я ўжо сам чытаю. Не прайшло і двох месяцаў, як скончыў я буквар. А пісаць навучыўся сам. Пісаныя буквы падобныя да друкованых. Цяпер я ўжо пішу па кніжцы: «Пішы самадзейна».

Хутка я пачаў вучыць браціка і суседаву дачку, маю равесьніцу.

## Мурза.

У кошыку ляжыць Мурза з малым кацянём. Раптам убегла суседняя кошка. Наша Мурза як схопіцца, як пачне тузаць... Ледзь-ледзь вынясла ногі няпрошаная госьцейка.

Аднаго цёплага дня гаспадыня ўзяла кацянё і вынесла першы раз на панадворак. Спадабалася малому кацяняці на сонейку: скача між кветкамі, забаўляецца... А Мурза сядзіць, ня зводзіць вочак з свайго дзіцяці.

Другім разам гаспадыня ня мела часу выйсьці ў садочак. А Мурза ўсё чагось плача, нібы кліча. Такая неяк неспакойная.

vytoki.net



Але за работаю гаспадыні не да Мурзы. Нядоўга думаючы, Мурза раптам бярэ кацянё за карак і праз адчыненае вакно — скок уніз. А да зямлі мэтраў два. Думалі — забілася малое кацянё. Ажно глядзімо — сядзіць наша Мурза на лавачцы, а каля яе, моцна прытуліўшыся да маці, малое кацянё. Гадзіны дзьве гэтак сядзелі, не варухнуліся: пэўна такі падбіліся...

## Мядзьведзь і жнейка (казка).

Лета. Жніво. Жнейка жне на полі жыта. Раптам — з лесу прэ мядзьведзь, чамусьці на трох лапах; чацьвертую нясе, падняўшы да гары. Бачыце, хадзіў Мішка касалапы па мёд, і вось загнаў вялікую страмяку. Пайшоў з лесу шукаць помачы. — Жнейка спалохалася, і ну наўцёкі... Але-ж мядзьведзь йдзе і йдзе. Даганіў жнейку і выцягвае да яе хворую лапу. Жнейка бліжэй, бліжэй да медзьведзя, і выняла страмяку. Мішка аблізаў рану і пайшоў... але ня ў лес, а на вёску: зьняў з плоту вядро, вярнуўся да вульля, набраў поўнае вядро мёду і прыпёр жнейцы ў падзяку.

## Асёл.

Аслова нявуцтва ня раз служыла дурням на паказ; дык возь нарэшце ўзялі асла ў навуку аддалі. І сталі вучыць яго чытаць,

вучылі нават і пісаць. Асёл так шчыра вучыцца ўмеў, што кніжкі ўсе, як сена, зьеў, і стольki ў гэтым скарыстаў, што больш убоістым ён стаў...

### Каток.

У Савосева суседа
быў пярэсьценькі каток;
выхаванец Паўла-дзеда,
такі слаўны пястунок.
Нос чарнявы,
задзірасьценькі,
кіпцік-шчыпчык
заграбасьценькі;
лапкі-драпкі
машастовыя,
а шарсьцiначкi
шаўковыя.
Губкі-зубкі
адмысловыя.
Вусы-русы-патарчастыя,
тая сьпінка, як націнка,
выгінастая.
Вушкі-слушкі
ня мыляюцца,
вочкі ўночку запаляюцца.

Я. Колас.

## Зязюля.

Зязюля першы раз кукуе на Юр'я. Кукуе да Пятровага дня. Кукуе далей ад хатаў, у лесе, каля ракі, над ракітавым кустом. Калі ў чыім садзе закукуе, там — кажуць — вясельле будзе. Зязюлька ня ўе ўласнага гнязда, і сама не гадуе дзяцей. Свае яйкі падкідвае ў чужыя гнёзды.

vytoki.net



### Вясковая хата.

Стрэшка саламяная
мохам парасла,
Ў вокнах алавяная
мучыцца туга.
Шыбы дык пабітыя
летам і зімой
Дзіры іх прыкрытыя
вопраткой старой...
Ды хляўцы з паветкаю,
на узбоччы клець.
Ўсюды беднасьць сьведкаю,
як мужык жывець.

Хатачка вясковая,
матка беднаты,
цесная, убогая,
чым мне люба ты?

М. Машара.

---

Бог стварыў неба і зямлю. На небе сонца, месяц і зоры. На зямлі жывёлы і расьліны. Бог — Уседзяржыцель: Ён усё ўтрымлівае ўладай Сваёй і ўсім сьветам кіруе. Бяз Бога — ані да парога, а з Богам хоць за мора.

Бог любіць нас і мы павінны любіць Яго ўсім сэрцам, усёю душою, усім розумам сваім.

---

Сьвятая Тройца: Бог Ацец, Бог Сын і Бог Дух Сьвяты — ня тры Багі, але адзін Бог у трох Асобах.

Прасьвятая Багародзіца ёсьць Маці Сына Божага, Госпада нашага Ісуса Хрыста. Хрыстос нарадзіўся ў месьце Віфлееме. Маці Яго, Дзева Марыя, спавіла і палажыла Дзі-

цятка ў яcьлях. У Віфлеем прыходзілі пакланіцца Дзіцяці-Хрысту мудрацы з падаркамі. Трыццацёх гадоў Ісус Хрыстос хрысьціўся ў рацэ Іордане. Яго хрысьціў Іоанн Хрысьціцель.

———

Пасьля хрышчэньня Хрыстос пачаў навучаць людзей, каб яны пакаяліся, папраўіліся, не грашылі і абяцаў ім за тое царства нябеснае. Добрыя людзі любілі Яго і ахвотна слухалі, а ліхія ненавідзелі. Ворагі засудзілі Хрыста бяз віны на сьмерць і расьпялі. Ён мог-бы ня дацца ворагам на мукі, але Сам захацеў за нас грэшных адпакутаваць, каб мы ня мучыліся вечна за грахі свае.

———

Хрыстос памёр на храсьце і на трэці дзень уваскрос (ажыў). Многія з верных бачылі ўваскросшага Хрыста і радаваліся Яго ўваскрасеньню. У саракавы дзень Гасподзь сабраў Апосталаў і вучняў Сваіх, багаславіў іх і ўзьнёсься на неба. Па запаведзі Ісуса Хрыста, Апосталы разыйшліся па ўсім сьвеце, каб абвясьціць людзям вучэньне Хрыстова. Так пачалася вера хрысьціянская. Хрысьціян мучылі за веру, як і Самога Хрыста, але яны ўсё перамагалі за Хрыста, каб заслужыць Царства нябеснае і быць вечна з Хрыстом на небе.

———

vytoki.net



## Беларускі альфабэт (азбука).

Аа Бб Вв Гг Дд Ее Ёё
Жж Зз Іі Йй Кк Лл Мм
Нн Оо Пп Рр Сс Тт Уу
Ўў Фф Хх Цц Чч Шш
Ыы Ьь Ээ Юю Яя

## Лічбы.

1, 2, 3, 4, 5, 6, 7, 8, 9, 10.
адзін, два, тры, чатыры, пяць, шэсьць, сем, восем, дзевяць, дзесяць.
I, II, III, IV, V, VI, VII, VIII, IX, X.

## Практыкаваньні ў чытаньні і пісаньні.

*Аа Бб Вв Гг Дд Ее Ёё Жж*

*Зз Іі Йй Кк Лл Мм Нн Оо*

*Пп Рр Сс Тт Уу Ўў Фф Хх*

*Цц Чч Шш Ыы Ьь Ээ*

*Юю Яя*

## ЛІТАРЫ СЛАВЯНСКІЯ І БЕЛАРУСКІЯ.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Аа | Бб | Вв | Гг | Дд | Єє | Жж | Ѕѕ | Зз | Ии | Йй | Іі |
| а | б | в | г | д | е | ж | з | з | і | й | і |
| Кк | Лл | Мм | Нн | Ѡѡ | Ѻѻ | Оо | Пп | Рр | Сс | Тт | |
| к | л | м | н | о | о | о | п | р | с | т | |
| Ѹѹ ү | Фф | Хх | Ѿѿ | Цц | Чч | Шш | Щщ | Ъъ | | | |
| у | ф | х | от | ц | ч | ш | шч | — | | | |
| Ыы | Ьь | Ѣѣ | Юю | Ꙗꙗ | Ѧѧ | Ѯѯ | Ѱѱ | Ѳѳ | Ѵѵ | | |
| ы | ь | е | ю | я | я | кс | пс | ф | і(ы) | | |

## СЛОВЫ ПАД СКАРОТАМІ (ТІТЛАМІ).

Агг҃лъ Ангелъ
Бг҃ъ Богъ
Бж҃е Боже
Бц҃а Богородица
Бл҃гви Благослови
Вл҃ка Владыка
Вл҃ца Владычица
Гд҃ь Господь
Дх҃ъ Дѹхъ

Дш҃е Дѹше
Дв҃а Дѣва
Іи҃съ Іисѹсъ
Нб҃о Небо
Нб҃ный Небесный
Оц҃ъ Отецъ
Оч҃е Отче
Ст҃ый Свѧтый
Хр҃тосъ Христосъ





Багаславеньне дзяцей

vytoki.net

## Уступная гутарка з дзяцьмі.

— Дзеці! Што знаходзіцца ў вас у хаце на покуце?

— **Сьвятыя абразы.**

— Што гэта сьвятыя абразы?

— Сьвятыя абразы — гэта **сьвяшчэнныя ізабражэньні ці малюнкі** на дрэве, на палатне, на паперы **Госпада нашага Ісуса Хрыста, Божай Мацеры, Сьвятых Угоднікаў Божых.**

— Ці вашыя бацькі, дзедка, бабка паважаюць сьвятыя абразы?

— Нашыя бацькі **шануюць** сьвятыя абразы, ўтрымліваюць іх у чыстаце, прыбіраюць кветкамі, запальваюць перад імі лампадкі, рана й вечар, — перад ядою і пасьля яды **моляцца** перад імі і цалуюць іх. Мы таксама, як навучаюць нас тата і мама, дзедка і бабка, любім сьвятыя абразы, молімся перад імі і цалуем іх.

— Што вы робіце, молячыся перад сьвятымі абразамі?

— Мы **хрысьцімся** і б'ём **паклоны.**

— А куды ў нядзелю ці ў сьвята ідуць маліцца вашыя бацькі і вы з імі?

— У **храм Божы, ў царкву.** Царква для нас самы сьвяты, самы дарагі будынак. У царкве ўжо не адзін, ня два, ня тры абразы, як у нас у хаце, але многа, многа. У царкве добра і прыемна маліцца.

— Хто адпраўляе службу Божую ў храме?

—**Бацюшка, свяшчэньнік.** Ён голасна, каб усе чулі, гаворыць малітвы, ён прызывае на нас міласьць Божую, **багаслаўляе** нас **імем Госпадніім** і навучае, як трэба жыць і захоўвацца багабойным хрысьціянам.

— Ад каго бацюшка атрымаў гэтую сьвяшчэннаю ўладу?

Ён атрымаў яе ад **Уладыкі Архірэя.**

— Чым выказваюць вашыя бацькі і, за прыкладам іх, вы сваю пашану да сьвяшчэньніка за тое, што ён моліцца за вас, багаслаўляе і вучыць вас імем Госпадніім?

— Мы любім і слухаем яго, як сваіх бацькоў, і цалуем руку, якая нас багаслаўляе.

— Хто ж загадаў нам хадзіць у царкву, маліцца, шанаваць сьвятыя абразы і хрэст сьвяты, жыць па праўдзе і ў згодзе між сабою?



— **Гасподзь Бог.** Ён цераз Апосталаў і Сьвятых Угоднікаў перадаў нам Свой Закон, дзе ўсё гэта напісана.

— Вось гэтага Закону Божага мы і будзем вучыцца з вамі, дзеці.

## Гутарка аб Богу.

Бог ёсьць Дух нявідочны. Бог адзін, але ў трох асобах: першая асоба — Бог Ацец, другая — Бог Сын, трэцяя — Бог Дух Сьвяты, Тройца Адзінаістотная і Неразьдзельная. Мы павінны імкнуцца да пазнаньня Бога, Яго любіць і праслаўляць. Усё трэба рабіць дзеля славы Божай, у імя Божае. Таму хрысьціся і маліся кожнага дня.

Бог нас бязконца любіць. Бог Ацец паслаў на зямлю Свайго Адзінароднага Сына, Госпада нашага Ісуса Хрыста дзеля спасеньня людзей. Бог Сын прыходзіў на зямлю, вучыў людзей, як жыць багабойна. За грэшнае чалавецтва Ён быў мучаны і памёр, потым уваскрос, узьнёсься на неба і паслаў на зямлю веруючым людзям Духа Сьвятога. Дух Сьвяты заўсёды з намі ў Царкве Сьвятой. Ён нас кіруе на дабро, навучае, спацяшае, ачышчае ад грахоў і збаўляе нашыя душы. Яму мы павінны пастаянна маліцца.

Бога мы ня бачым і бачыць ня можам, бо Ён ёсьць **Дух,** духоўная, бесьцялесная Істота. Ня было такога часу, калі Бога ня было, й ня будзе часу, калі Бога ня будзе. Бог як заўсёды існаваў, так і будзе заўсёды існаваць. Дзеля гэтага мы і называем Бога **вечным,** г. ё. заўсёды існуючым.

Бог поўны усякай дабраты і робіць нам адно толькі дабро. Нават гора, бяду, няшчасьці пасылае на нас дзеля нашай карысьці, таму мы называем Бога **ўсядобрым,** г. ё. вельмі добрым, міласьцівым.

Бог ведае ўсё, што было, што ёсьць і што будзе. Ён ведае ня толькі тое, што мы робім ці гаворым, але нават што думаем. Дзеля таго мы й называем Бога **усяведаючым,** г. ё. ўсё знаючым.

Бог поўны усякай праўды: няма ў Ім ніякага не-

vytoki.net

дастаку, ніякаго граха. Сам поўны праўды, Ён і ў людзях любіць адну толькі праўду, кіруецца праўдай і кожнаму дае паводле ўчынкаў яго: добрых людзей нагароджае, а благіх карае. Дзеля гэтаго мы называем Бога **ўсеправедным**, г. зн. сьвятым і правасудным.

Бог усё можа зрабіць, што захоча. Для Яго няма нічога немагчымага. Так, напрыклад, захацеў Ён па дабраце Сваёй стварыць сьвет, і стварыў яго з нічога, адным словам Сваім. Таму называем мы Бога **ўсемагутным**.

Бог усюды знаходзіцца. Няма месца, дзе-б Бога ня было і нікуды мы ня можам ад Яго схавацца. Дзеля гэтага завём мы Бога **паўсюдным**, г. зн. усюды прабываючым.

Бог ніколі не мяняецца ў істоце Сваёй, у Сваіх дзеяньнях і жаданьнях. Які быў Бог спрадвеку, такім Ён цяпер, такім застанецца на заўсёды. Дзеля гэтага называем мы Бога **нязьменным**.

Бог нічога не патрабуе, — наадварот, Сам дае ўсім істотам жыцьцё і ўсё для іх неабходнае, і таму завём мы Бога **ўсездаволеным**.

Бог ня знае ніякае тугі, ніякага гора, Ён заўсёды шчасьлівы. Дзеля таго мы і называем Бога **ўсеблажэнным**, г. зн. шчасьлівым.

Была пара, калі гэтага сьвету ня было: ня было ні нашай зямлі, ні сонца, ні месяца, ні зорак на небе. Усё гэта, ўвесь гэты сьвет створаны Богам, па Яго дабраце, сілаю Яго магутнасьці. Дзеля гэтаго мы называем Бога **Тварцом сьвету**.

Стварыўшы сьвет, Бог не пакідае яго без Свае апекі, але заўсёды апякуецца ім (прамышляе аб ім), сьцеражэ яго, і ўсё створанае Ім кіруе на добрае. Дзеля гэтага мы называем Бога **Апякуном (Прамысьліцелем) сьвету**.

Гэтак, мы, хрысьціяне, веруем, што Бог ёсьць **Дух вечны, ўсядобры, ўсяведаючы, ўсеправедны, ўсемагутны, паўсюдны, нязьменны, ўсездаволены, шчасьлівы. Ён—Тварэц і Апякун сьвету.**

## Навучаньне малітваў.

### Аб малітве.

Усё, што мы маем і чым карыстаемся, атрымліваем ад Бога. Бог дбае аб нас, як дзецях Сваіх, сьцеражэ нашае жыцьцё, пасылае на нашыя палі дождж і расу, сьвятло

vytoki.net



і цяпло. Мы зварочваемся да Яго з сваімі малітвамі, славім Яго ў іх, просім помачы на справы добрыя й багабойныя і дзякуем Яму за Ягоныя міласьці.

Апрача Бога, ў малітвах сваіх мы прызываем Мацер Божую, Сьвятых Ангелаў і Сьвятых Людзей, але не як Бога, а як Угоднікаў Божых, якія блізкі да Бога і просяць за нас перад Ім.

**Пытаньні:** Чаму мы зварочваемся да Бога з малітвамі? Што мы звычайна выказваем у сваіх малітвах? Да каго, апрача Бога, зварочваемся ў малітвах сваіх?

### Аб вонкавых знаках малітвы.



Паводле старадаўнага звычаю, ў часе малітвы мы **хрысьцімся знакам храста**. Дзеля гэтага тры пальцы правай рукі канцамі злучаем разам—на **чэсьць** Прасьвятой Тройцы, Адзінаістотнай і Неразьдзельнай, а два апошнія прыгінаем к далоні. Потым, зложаныя такім чынам пальцы, кладзём спачатку на **чало**, потым на **грудзі** і далей на **правае плячо** і **левае**.

Знакам храста мы выказваем нашу веру ў расьпятага на храсьце за грахі нашыя Госпада Ісуса Хрыста.

Знак храста кладзём: на чале, каб пасьвяціць розум; на грудзёх, каб пасьвяціць сэрца; на правым і левым плячы каб пасьвяціць цялесныя сілы і нашую працу.

Нахіленьнем галавы і паклонамі ў часе малітвы мы паказваем нашую пакору і паслухмянасьць перад Богам.

**Пытаньні:** Як зложыць пальцы, каб перахрысьціцца? Як мы хрысьцімся? Што азначае знак храста сьвятога? Чаму хрысьцячыся мы кладзём знак храста на **чало, грудзь, правае і левае плячо?** Дзеля чаго молячыся мы нахіляем галаву і кладзём паклоны?

## Аб малітве дома перад абразамі і ў царкве.

Маліцца Богу належыць у сябе ў хаце і ў царкве. Дома трэба маліцца: **рана**, як прачынаемся; **ўвечары**, як лажымося спаць; перад **абедам** і **па абедзе; пачынаючы** дзела й **канчаючы** яго. Дома, звычайна, мы молімся перад іконамі або **сьвятымі абразамі.** Яны напамінаюць нам аб Богу і аб Сьвятых Праведніках і Угодніках Божых. Молячыся перад абразом, мы павінны маліцца ня дрэву ці фарбам, але той асобе, якая на абразе намалёвана. У нядзелі і сьвяточныя дні, які ў буднія, калі час маем, павінны мы хадзіць маліцца ў **храм Божы**, на багаслужэньне. У царкве трэба стаяць уважна і маліцца Богу шчыра, з разуменьнем тых слоў, якія ёсьць у малітве.

Храмам Божым, альбо царквой, называецца пэўны будынак, альбо асобнае ў будынку памешканьне, ў якім адпраўляюцца ўсе царкоўныя службы, перш за ўсё абедня (літургія). Храм розьніцца ад іншых будынкаў сваім вонкавым выглядам. Ён будуецца то ў відзе храста, то ў відзе кола, то ў відзе карабля. Над сярэдняй часткай храму памяшчаецца купал, які завершваецца храстом. Уваход у царкву, звычайна, робіцца з заходняе стараны, а аўтар — галоўная частка сьвятыні, заўсёды скірованы на ўсход. З заходняга ж боку прыбудоўваецца асобная вежа, альбо званіца, на якой вісяць званы. Храм аздабляецца як з вонкавай стараны, так асабліва з унутранай — сьвятымі абразамі. Аўтар, усходняя частка царквы, аддзяляецца ад сярэдняе часьці асобнай сьцяной, прыбранай абразамі. Між абразамі ёсьць трое дзьвярэй, якія вядуць у аўтар: сярэднія — царскія; з правага боку — паўдзённыя, з левага — паўночныя.

У храме Божым нявідзіма прысутным ёсьць Сам Гасподзь, асабліва ў таінстве сьвятога прычашчэньня (на літургіі), калі прыгатаваныя для пасьвячэньня хлеб і віно перατвараюцца ў запраўднае Цела й запраўдную Кроў Хрыстову. Разам з Госпадам, таксама нявідзіма ёсьць прысутнымі Сьвятыя Ангелы. Уваходзіць у храм Божы належыць з праўдзіваю вераю і страхам Божым. Стаяць у царкве трэба як перад аблічам Бога, з уваж- ...аючы, што сьпяваюць і чытаюць. Усялякая

vytoki.net



няўважнасьць і гутаркі ў царкве прагняўляюць Бога. Молячыся ў храме, мы павінны хрысьціцца, класьці паклоны і станавіцца на калені. Калі чуем словы сьвяшчэньніка: „Мір усім“, трэба пакланіцца, калі ж пачуем: „Галавы вашыя схілеце перад Госпадам“, належыць нахіліць галаву. Нахіліць галаву трэба також пры чытаньні Сьв. Евангельля.

**Пытаньні:** Дзе трэба маліцца Богу? У якую пару належыць маліцца дома? Што такое абраз? Каму мы молімся, кланяючыся перад абразом? Куды трэба хадзіць ў нядзелю, сьвяточныя дні і буднямі, калі ёсьць час? Што такое храм Божы? Чым розьніцца ён ад іншых будынкаў? Якой ёсьць унутраная яго старана? Як належыць захоўвацца ў царкве? Што трэба рабіць у царкве ў часе малітвы?

## Аб багаславеньні сьвяшчэньніка.

Сьвяшчэньнік багаслаўляе набожных хрысьціян імем Госпада нашага Ісуса Хрыста, дзеля чаго пальцы правай рукі сваей складае так, каб яны паказвалі літары скарочаных слоў **Іс. Хр.** (Ісус Хрыстос).



Цераз багаславеньне сьвяшчэньніка падаецца нам міласьць Госпада Бога і таму прымаць яго трэба з набожнасьцяй, шчырасьцяй і верай, цалуючы пры гэтым багаслаўляючую руку.

**Пытаньні:** Чым імем сьвяшчэньнік багаслаўляе набожных хрысьціян? Як дзеля гэтага складваем пальцы правай рукі сваей? Што атрымліваем мы цераз багаславеньне і як яго трэба прымаць?

# ШТОДЗЕННЫЯ МАЛІТВЫ.

## Малітвы пачатковыя.

| | |
|---|---|
| **Во и҆́мѧ ѻ҆ц҃а̀ и҆ с҃на̀ и҆ ст҃а́гѡ д҃ха. А҆ми́нь.** | Ва імя Айца і Сына і Сьвятога Духа. Амінь. |

Во и҆́мѧ — значыць: на чэсьць, на хвалу, славу; а҆ми́нь — праўдзіва, так.

| | |
|---|---|
| **Г҃и, і҆и҃се х҃рте, с҃не б҃жі́й, поми́луй на́съ.** | Госпадзі, Ісусе Хрысьце, Сыне Божы, памілуй нас. |
| **Г҃и, і҆и҃се х҃рте, с҃не б҃жі́й, моли́твами пречⷭ҇тыѧ твоеѧ̀ м҃тре и҆ всѣ́хъ ст҃ы́хъ, поми́луй на́съ. А҆ми́нь.** | Госпадзі, Ісусе Хрысьце, Сыне Божы, дзеля малітваў Найчысьцейшае Твае Маці і ўсіх сьвятых, памілуй нас. Амінь. |

У гэтай малітве мы просім Сына Божага, каб Ён зьмілаваўся над намі дзеля малітваў Прачыстай Сваей Мацеры і ўсіх Сьвятых.

| | |
|---|---|
| **Сла́ва тебѣ̀, бж҃е на́шъ, сла́ва тебѣ̀.** | Слава Табе, Божа наш, слава Табе. |

Гэтай малітвай мы, славячы Госпада Бога, выказваем асаблівую багабойнасьць перад Ім, як Істотай Найвышэйшай.

| | |
|---|---|
| **Г҃и, поми́луй.** | Госпадзі, памілуй. |

Гэтымі словамі мы выражаем сьвядомасьць сваей грахоўнасьці перад Богам і просім Яго зьмілавацца над намі.

vytoki.net



| | |
|---|---|
| **Г҃и, благослови̂.** | Госпадзі, багаславі. |

У гэтай малітве мы просім багаславеньня Божага на пачатак дзела.

| | |
|---|---|
| **Бж҃е, млⷭ҇тивъ бꙋ́ди мнѣ̀ грѣ́шномꙋ.** | Божа, будзь міласьцівы дамяне грэшнага. |

Гэтую малітву перадаў нам Гасподзь наш І. Хрыстос у прыповесьці аб мытніку і фарысэю, расказваючы аб тым, якая малітва можа дагадзіць Богу. У малітве гэтай просім мы Госпада быць міласьцівым да нас грэшных і не асуджаць нас цяжка за грахі нашыя.

**Мытнік** — зборшчык дзяржаўных падаткаў.

## Малітва Сьвятому Духу.

| | |
|---|---|
| **Цр҃ю нбⷭ҇ный, ᲂу҆тѣ́шителю, дш҃е и҆́стины, и҆́же вездѣ̀ сы́й и҆ всѧ̀ и҆сполнѧ́ѧй, сокро́вище бл҃гихъ, и҆ жи́зни пода́телю, пріи҆дѝ и҆ всели́сѧ въ ны̀, и҆ ѡ҆чⷭ҇ти ны̀ ѿ всѧ́кіѧ скве́рны, и҆ сп҃сѝ, бл҃же, дꙋ́шы на́шѧ.** | Цару нябесны, Уцяшыцель, Дух ісьціны, Каторы паўсюды ёсьць і ўсё напаўняе, Скарбніца дабра і Падаўца жыцьця! прыйдзі і пасяліся ў нас і ачысьці нас ад усяго злога і спасі, Добры, душы нашы. |

У гэтай малітве мы зварочваемся да Духа Сьвятога з просьбай, каб Ён прышоў і пасяліўся ў нас, ачысьціў нас ад усякай грахоўнай нечысьці і даў нам збаўленьне.

Словы: Царю́ небе́сный — азначаюць, што Сьвяты Дух, таксама як Бог Айцец і Бог Сын, пануе над сусьветам—над небам і зямлёю.

Оу҆тѣ́шитель — што Ён падае нам уцеху ў тузе і няшчасьцях.

Дꙋ́ше и҆́стины — бо Ён даў нам праўдзівую веду і заўсёды навучае ўсяму добраму.

И҆́же вездѐ сы́й и҆ всѧ̀ и҆сполнѧ́ѧй — Каторы ўсюды ёсьць і ўсё напаўняець Сваёю міласьцяй і ўсякім дабром. Дух Сьвяты, як Бог, паўсюды і няма мейсца, дзе-б Яго не было.

Сокро́вище бла́гихъ — значыць: крыніца, скарб усякага дабра.

И҆ жи́зни пода́телю — Падаўца жыцьця. Так называецца Сьвяты Дух таму, што разам з Богам Айцом і Сынам дае жыцьцё ўсякаму стварэньню, асабліва-ж духоўнае жыцьцё ў таінстве хрышчэньня, памагаючы людзям спаўняць запаведзі Божыя і жыць набожна.

Ѡ҆чи́сти ны̀ ѿ всѧ́кїѧ скве́рны — ачысьць нас ад усякае нячыстасьці, г. ё. ад усіх грахоў.

И҆ спаси́, Бла́же, дꙋ́шы на́шѧ — збаў, Добры, Міласэрны, душы нашыя, г. ё. дай ім спасеньне і шчасьце.

Душою называецца істота нявідочная, разумная і несьмяротная; прабываючы ў нашым целе, душа ажыўляе яго і кіруе нашымі паступкамі.

**Пытаньні:** Як гаворыцца малітва Сьвятому Духу?—З якой просьбай зварочваемся да Сьвятога Духа ў гэтай малітве?— Што азначаюць словы: Царю́ небе́сный? — Оу҆тѣ́шителю? — Дꙋ́ше и҆́стины? — И҆́же вездѐ сы́й и҆ всѧ̀ и҆сполнѧ́ѧй? — Сокро́вище бла́гихъ? — Чаму Дух Сьвяты называецца Пода́тель жи́зни? Што значыць: Ѡ҆чи́сти ны̀ ѿ всѧ́кїѧ скве́рны? Як разумець словы: и҆ спаси́, Бла́же, дꙋ́шы на́шѧ? Што называецца **душою нашаю?**

vytoki.net



# Ангельская песьня.

Ангелы на небе заўсёды Бога выхваляюць. І мы з імі павінны Бога славіць і маліцца Яму.

Аднаму добраму хлопчыку Бог даў пачуць ангельскі сьпеў на небе ў такіх словах:

**Ст҃ы́й Б҃же, ст҃ы́й крѣ́пкїй, ст҃ы́й безсмѣ́ртный.**

Сьвяты Божа, Сьвяты Крэпкі, Сьвяты Несьмяротны, памілуй нас.

Падняты бурай угару ў часе землятрасеньня, хлопчык сам навучыўся гэтага сьпеву, і калі спусьціўся з неба, дык перадаў людзям. Усе пачалі такімі-ж словамі маліцца, дадаўшы ад сябе:

**поми́лꙋй на́с.**

І Бог зьмілаваўся над людзьмі: зямля перастала трасьціся.

# Праслаўленьне Бога.

**Сла́ва Ѻ҆ц҃ꙋ̀ и҆ С҃нꙋ и҆ С҃то́мꙋ Дх҃ꙋ, и҆ ны́нѣ и҆ при́снѡ, и҆ во вѣ́ки вѣкѡ́въ. А҆ми́нь.**

Слава Айцу і Сыну і Сьвятому Духу, цяпер, і заўсёды, і ў векі вечныя. Амінь.

Ны́нѣ — цяпер. При́снѡ — заўсёды. Во вѣ́ки вѣкѡ́въ — на векі вечныя, да канца сьвету.

## Малітва да Прасьвятой Тройцы.

Пресвѧтаѧ тр҃це, помилꙋй насъ: гд҃и, ѡчи́сти грѣхи̑ на́шѧ: вл҃ко, прости беззакѡ́нїѧ на́шѧ: ст҃ый, посѣти и исцѣли нѣмѡщи на́шѧ, и́мене твоегѡ ра́ди.

Найсьвяцейшая Тройца, памілуй нас: Госпадзі, ачысьці грахі нашы; Уладыка, даруй няпраўды нашы. Сьвяты, адведай нас і аздараві немачы нашы, дзеля Твайго імя.

Пресвѧтаѧ — найсьвяцейшая. Беззакѡ́нїѧ — няпраўды, нарушэньне закону. Посѣти — адведай, пазнай. Нѣмощь — немач, хвароба (душэўная і цялесная). Ра́ди — дзеля.

Гэта малітва — да Найсьвяцейшае Тройцы. Просім мы ў ёй, каб Адзіны ў Тройцы Госпадзь (Бог Айцец) ачысьціў ад грахоў, Ён-жа, Уладыка (Бог Сын), выбачыў няпраўды нашыя, якімі саграшылі мы проціў закону Яго; Той-жа, Сьвяты (Дух), пазнаў і аздаравіў нас ад немачаў, г. ё. хваробаў нашых духоўных і цялесных.

Гд҃и, поми́лꙋй, гд҃и, поми́лꙋй, гд҃и, поми́лꙋй.

Госпадзі, памілуй. (Тройчы).

(Да ўсіх трох асобаў Прасьвятой Тройцы).

vytoki.net



Сла́ва ѻ҆ц҃ꙋ̀ и҆ сн҃ꙋ, и҆ ст҃о́мꙋ дх҃ꙋ, и҆ ны́нѣ, и҆ при́снѡ, и҆ во вѣ́ки вѣкѡ́въ. А҆ми́нь.

## Малітва Гасподняя*).

Вучні Госпада Ісуса Хрыста прасілі навучыць іх маліцца, Ён ім сказаў: Маліцеся так:

Ѻ҆́ч҃е на́шъ, и҆́же є҆сѝ на небесѣ́хъ! да свѧти́тсѧ и҆́мѧ твоѐ, да прі̓и́детъ црⷭ҇твїе твоѐ: да бꙋ́детъ во́лѧ твоѧ̀, ꙗ҆́кѡ на нб҃сѝ и҆ на землѝ. Хлѣ́бъ на́шъ насꙋ́щный да́ждь на́мъ дне́сь: и҆ ѡ҆ста́ви на́мъ до́лги на́шѧ, ꙗ҆́коже и҆ мы̀ ѡ҆ставлѧ́емъ должникѡ́мъ на́шымъ: и҆ не введи̑ на́съ во и҆с-

Отча наш, Каторы ёсьць у нябёсах. Няхай сьвяціцца імя Тваё, няхай прыйдзе Царства Тваё, няхай будзе воля Твая, як у небе, так і на зямлі. Хлеб наш штодзенны дай нам сягоньня, і даруй нам даўгі нашы, як і мы даруем даўжнікам нашым, і ня ўводзь нас у спа-

*) Малітва гэтая чытаецца перад абедам і вячэрай.

| | |
|---|---|
| кꙋше́нїе, но и҆зба́ви на́съ ѿ лꙋка́вагѡ. | кушэньне, але збаў нас ад злога. |
| Ꙗ҆́кѡ твоѐ є҆́сть ца́рство, и҆ си́ла, и҆ сла́ва, во вѣ́ки. А҆ми́нь. | Бо Тваё ёсьць царства і сіла і слава на векі. Амінь. |

Насꙋ́щный — неабходны для існаваньня, штодзенны. Да́ждь — дай. Дне́сь — сягоньня. До́лги — даўгі, грахі. Лꙋка́вый — злы, благі, ліхі, хітры. Ꙗ҆́кѡ — бо, дзеля таго што.

Малітва гэтая называецца **Гасподняю,** бо так маліцца навучыў вучняў Сваіх Сам Гасподзь наш Ісус Хрыстос.

Ѻ҆́тче на́шъ — Отча́ наш (Айцец наш).

И҆́же є҆сѝ на небесѣ́хъ — Каторы ёсьць у нябёсах.

Да свѧти́тсѧ и҆́мѧ Твоѐ. Гэтымі словамі мы просім Бога, каб памог утрымаць сьвятое Яго імя ў розуме і сэрцы, каб даў нам жыць паводле Ягоных законаў, праслаўляючы Госпада ўсім жыцьцём Сваім.

Да прїи́детъ ца́рствїе Твоѐ. У гэтых словах мы просім, каб Бог памог нам быць праўдзівымі хрысьціянамі, каб міласьць Ягоная была з намі і кіравала сэрцы нашыя на дабро, да вечнага шчасьця.

Да бꙋ́детъ во́лѧ Твоѧ́, ꙗ҆́кѡ на небесѝ и҆ на земли̑. Тут мы просім Айца Нябеснага, каб памог Ён нам выпаўніць на зямлі Яго сьвятую волю, як на нябёсах выпаўняюць яе Ангелы.

Ꙗ҆́кѡ — азначае тут „як“.

Хлѣ́бъ на́шъ насꙋ́щный да́ждь на́мъ дне́сь — г. ё. дай нам неабходное для жыцьця, як ежу, адзежу, памешканьне, таксама і неабходнае для душы.

И҆ ѡ҆ста́ви на́мъ до́лги на́шѧ, ꙗ҆́коже и҆ мы̀ ѡ҆ставлѧ́емъ должникѡ́мъ на́шымъ. Значыць — даруй нам даўгі нашыя, як і мы даруем даўжнікам нашым. Пад даўгамі разумеюцца тут грахі. Даўжнікамі нашымі завуцца людзі чым-колечы вінаватыя перад намі, напрыклад, крыўдзя- …ыціскаючыя і наагул робячыя нам прыкрасьці.

vytoki.net



И҆ не введи̑ на́съ во и҆скꙋше́нїе — не спакушай нас, аддалі ад нас небясьпечныя рэчы, якімі мы можам спакусіцца і саграшыць.

Но и҆зба́ви на́съ ѿ лꙋка́вагѡ, значыць — захавай нас ад усяго злога, асабліва-ж ад д'ябла, спакушаючага нас на грэх. Дяблам завецца злы дух.

Ꙗ҆́кѡ Твоѐ є҆́сть ца́рство, и҆ си́ла, и҆ сла́ва, во вѣ́ки. А҆ми́нь. Словы гэтыя выяўляюць усю веліч Айца Нябеснага, Яго магутнасьць і славу.

## Ангельскае прывітаньне Мацеры Божай.

Бліжэй усіх да Бога — Мацер Божая. Яна бязустанку моліцца за нас Богу. Яе выслаўляюць на небе Ангелы і Сьвятыя Угоднікі Божыя, а на зямлі ўсе хрысьціяне — за тое, што Яна радзіла Збавіцеля душ нашых. Архангел Гаўрыіл, пасланы ад Бога да Прасьвятой Дзевы Марыі з весткай, што ад Яе родзіцца Сын Божы, так навучыў нас славіць Мацер Божую.

| | |
|---|---|
| Бцⷣе дв҃о ра́дꙋйсѧ, бл҃года́тнаѧ мр҃і́е, гдⷭ҇ь съ тобо́ю: бл҃гослове́нна ты̀ въ жена́хъ, и҆ бл҃гослове́нъ пло́дъ чре́ва твоегѡ̀, ꙗ҆́кѡ сп҃са родила̀ є҆сѝ дꙋ́шъ на́шихъ. | Багародзіца Дзева, радуйся, дабрадатная Марыя, Гасподзь з Табою: багаслаўлёна Ты паміж жанчын і багаслаўлёны народжаны Табою, бо Ты радзіла Спасіцеля душ нашых. |

Малітва гэтая названа **Ангельскім прывітаньнем** таму, што яна складзена са слоў Архангела Гаўрыіла, якімі ён прывітаў Прасьвятую Дзеву Марыю, дабравяшчаючы Ёй аб зачацьці і нараджаньні ад Яе Збавіцеля.

**Богоро́дица** — так Сьвятая Дзева Марыя называецца дзеля таго, што роджаны праз Яе Ісус Хрыстос ёсьць праўдзівы Бог.

**Ра́дуйся** — азначае прывітаньне.

**Благода́тная** — значыць поўная міласьці Божай.

**Благослове́нна Ты въ жена́хъ** — праслаўленая між усімі жанчынамі.

**Пло́дъ чре́ва Твоегѡ̀** — разумеецца Ісус Хрыстос, сплоджаны Ею.

**Ꙗ҆́кѡ Спа́са родила̀ є҆сѝ ду́шъ на́шихъ** — у гэтых словах тлумачыцца сэнс папярэдніх слоў: Сьвятую Дзеву Марыю праслаўляем дзеля таго, што Яна радзіла Збавіцеля душ нашых.

## Малітва за бацькаўшчыну.

**Спаси́, г҃ди, лю́ди твоѧ̑, и҆ бл҃гослови́ достоѧ́нїе твоѐ, побѣ́ды благовѣ́рнымъ на сопроти́вныѧ да́руѧ, и҆ твоѐ сохранѧ́ѧ кресто́мъ твои́мъ жи́тельство.**

Спасі, Госпадзі, людзей Тваіх і багаславі дзяржаву Тваю, падаючы дабраверным перамогу на супраціўнікаў і баронячы Храстом Тваім краіну нашу.

**Достоѧ́нїе** — спадчына. **Сопроти́вныѧ** — праціўнікі, ворагі. **Жи́тельство** — грамадзянства, гаспадарства, бацькаўшчына.



**Спаси́, Го́споди, лю́ди Твоѧ̑.** Гэтымі словамі мы просім Госпада Ісуса Хрыста аб збаўленьні нас, людзей Ягоных, ад тугі і бедаў. **Людзьмі** Госпада Ісуса Хрыста мы, хрысьціяне, называемся таму, што адкуплены ад грэху сьмерцяй Яго на храсьце.

**И҆ благослови́ достоѧ́нїе Твоѐ** — словы гэтыя належыць разумець так: багаславі спадчыну, маемасьць Тваю, г. ё. краіну, ў якой мы жывём, нашае гаспадарства, бацькаўшчыну. **Багаславіць** — значыць пажадаць дабра, абдарыць шчасьцем, даць дабрабыт.

**Побѣ́ды благовѣ́рнымъ на сопроти́вныѧ да́руѧ.** Тут мы просім Бога даць бацькаўшчыне нашай, гаспадарству, дзе жывём, перамогу над ворагамі ўнутранымі й вонкавымі.

**Благовѣ́рный** — шчыра веруючы чалавек, багабойны.

**Твоѐ сохранѧ́ѧ кресто́мъ Твои́мъ жи́тельство** — г. ё., бараны сілай храста Твайго нашу бацькаўшчыну, нашае гаспадарства і народ, які жыве з Богам.

## Малітва Праведнага Іава Многапакутнага.

**Бу́ди и҆́мѧ госпо́дне благослове́нно ѿ ны́нѣ и҆ до вѣ́ка.**

Няхай імя Гасподняе будзе багаславена ад сяньня і да веку.

Праведны Іоў жыў на ўсходзе, задаўга да Ража-ства Хрыстовага. Ён быў вельмі багаты і шчасьлівы ў сям'і сваей. У яго было сем сыноў і тры дачкі, многа жывёлы і слугаў. Але вось, па злабе д'ябла, ў кароткім часе страціў Іоў усё багацтва і дзяцей. Пасьля такой цяжкой страты апанавала яго страшная заразьлівая хвароба — праказа. Усё цела Іова пачало гніць і ён змушаны быў жыць за местам на сьметніку, пакінуты ўсімі людзьмі. Ня гледзячы на ўсё гэтае, Іоў не наракаў на Бога. І калі быў шчасьлівым, і ў няшчасьці ён аднолькава хваліў Бога.

За прыкладам Іова, і мы ўва ўсіх выпадках жыцьця нашага павінны зварочвацца да Бога з гэткаю малітваю.

vytoki.net

## Малітва багабойнага разбойніка.

| | |
|---|---|
| Помѧни мѧ гдⷭ҇и, егда прійдеши во царствіи твоемъ. | Успомні мяне, Госпадзі, калі прыйдзеш у царства Тваё. |

егда — калі.

З гэтаю малітваю зварочваўся да Ісуса Хрыста адзін з расьпятых разам са Хрыстом разбойнікаў, які на храсьце пакаяўся, чаму і малітва гэтая завецца **малітвай багабойнага разбойніка.**

## Сімвал (вызнаньне) Праваслаўнае Веры.

Мы павінны верыць так, як навучыў нас Сам Бог і Сьв. Апосталы. Вось наша вера.

| | |
|---|---|
| 1. Вѣрую во единаго Бга Оца вседержителѧ, творца нбу и земли, видимымъ же всѣмъ и невидимымъ. | Верую ў адзінага Бога Айца, Уседзяржыцеля, Творца неба і зямлі, усяго відзімага і нявідзімага. |
| 2. И во единаго Гда Іиса Хрта, Сна Бжіѧ, единороднаго, иже ѿ Оца рожденнаго прежде всѣхъ вѣкъ: свѣта ѿ свѣта, Бга истинна ѿ Бга истинна, рожденна, несотворенна, единосущна Оцу, имже вся быша. | І ў адзінага Госпада Ісуса Хрыста, Сына Божага, адзінароднага, ад Айца спрадвеку народжанага, як Сьвятло ад Сьвятла, Бога ісьціннага ад Бога ісьціннага, — народжанага, а нястворанага, адзінаістотнага з Айцом, праз Якога ўсё сталася. |



| | |
|---|---|
| 3. Насъ ради человѣкъ, и нашегѡ ради спсенія сшедшаго съ небесъ, и воплотившагосѧ ѿ Дха Ста и Марии Двы, и вочлвѣчшасѧ. | Дзеля нас, людзей, і дзеля нашага збаўленьня зыйшоўшага з нябёс, і прыняўшага плоць ад Духа Сьвятога і Дзевы Марыі, і стаўшага чалавекам. |
| 4. Распѧтаго же за ны при Понтійстѣмъ Пілатѣ, и страдавша, и погребенна. | Расьпятага за нас пры Панційскім Пілаце, і мучанага, і пахаванага. |
| 5. И воскресшаго въ третій день по писаніемъ. | І ўваскросшага ў трэці дзень, згодна з Пісаньнем. |

vytoki.net

6. **И҆ возше́дшаго на нб҃са̀, и҆ сѣдѧ́ща ѡ҆десну́ю ѻ҆ц҃а̀.**

І ўзыйшоўшага на неба і седзячага праваруч Айца.

7. **И҆ па́ки грѧду́щаго со сла́вою, суди́ти живы̑мъ и҆ ме́ртвымъ, є҆гѡ́же црⷭ҇твїю не бу́детъ конца̀.**

І маючага зноў прыйсьці ў славе, каб судзіць жывых і мёртвых, — Якога Царству ня будзе канца.

8. **И҆ въ дх҃а ст҃а́го, гдⷭ҇а, животворѧ́щаго, и҆̀же ѿ ѻ҆ц҃а̀ и҆сходѧ́щаго, и҆̀же со ѻ҆ц҃е́мъ и҆ сн҃омъ спокланѧ́ема и҆ сла́вима, гл҃го́лавшаго пр҃ро́ки.**

І ў Духа Сьвятога, Госпада, Жыцьцятворчага, ад Айца выходзячага, Якому належыць пакланеньне і слаўленьне нароўні з Айцом і Сынам, Які гаварыў праз прарокаў.

9. **Во є҆ди́ну ст҃у́ю, собо́рную и҆ а҆п҃то́льскую цр҃ковь.**

У адзіную Сьвятую, Саборную і Апостальскую Царкву.



10. **И҆сповѣ́дую є҆ди́но крещє́нїе во ѡ҆ставле́нїе грѣхѡ́въ.**

Прызнаю адно хрышчэньне дзеля ачышчэньня ад грахоў.

11. **Ча́ю воскр҃нїѧ ме́ртвыхъ:**

Чакаю ўваскрашэньня мёртвых:

12. **И҆ жи́зни бу́дущагѡ вѣ́ка. А҆ми́нь.**

і жыцьця будучага веку. Амін.

**Вседержи́тель** — гэта азначае, што Бог ёсьць Істотай усемагутнай; усё зьдзержвае сілай Сваёй.

**Ви́димымъ же всѣ́мъ и҆ невиди́мымъ** — словамі гэтымі падчырківаецца ўсемагутнасьць Тварца, Які стварыў усе істоты і рэчы — ня толькі тыя, каторыя перад вачыма нашымі, але й тыя, якіх мы ня бачым.

**Є҆диноро́днаго** — значыць адзінага зроджанага з Істоты Бога Айца.

**Пре́жде всѣ́хъ вѣ́къ.** Тут праводзіцца думка, што Ісус Хрыстос, як Бог, радзіўся тады, калі яшчэ нічога ня было, нават час ня быў створаны.

**Рожде́нна, несотворе́нна** — г. ё. Ісус Хрыстос быў зроджаны, але ня створаны, што сьведчыць аб Яго боскім паходжаньні.

**И҆̀мже всѧ̑ бы́ша,** цераз Якога, г. ё. Ісуса Хрыста, ўсё было створана.

**На́съ ра́ди человѣ̑къ** — дзеля нас людзей.

**Воплоти́вшагосѧ** — прыняўшага плоць, цела.

**Вочелвѣ́чшагосѧ** — стаўшага чалавекам. Ведама, што Ісус Хрыстос, радзіўшыся ад Дзевы Марыі, быў запраўдным чалавекам, не перастаючы быць Богам.

**Распѧ́таго же за ны̑** — расьпятага не за Свае грахі, а за нас.

vytoki.net

**При Понтíйстѣмъ Пілáтѣ** — словамі гэтымі падчыркнуты час сьмерці Госпада Ісуса Хрыста, іменна, калі Юдэяй кіраваў Понтый Пілат.

**По писанíємъ** — як аб гэтым сьведчылі прарокі ў Сьв. Пісаньні.

**И҆ возше́дшаго на небеса̀** — Сын Божы па ўваскрасеньні ўзышоў на неба, узьнёсься.

**И҆ сѣдѧ́ща ѡ҆десну́ю ѻ҆ц҃а̀.** Узыйшоўшы да Бога Айца Ісус Хрыстос сядзіць праваруч, з правага боку Яго, што азначае, што Сын Божы мае аднолькавую з Богам Айцом уладу і сілу.

**И҆ па́ки грѧду́щаго** — мы верым, што Сын Божы яшчэ раз, ізноў прыйдзе, тады ўжо судзіць людзей.

**Животворѧ́щаго** — ажыўляючага, бо Дух Сьвяты дае сілу, жывіць, ажыўляе верныя Богу істоты.

**И҆же ѿ ѻ҆ц҃а̀ и҆сходѧ́щаго** — Каторы ад Бога Айца выходзіць. Гэтым Дух Сьвяты адрозьніваецца ад іншых асобаў Сьв. Тройцы.

**И҆же со ѻ҆ц҃е́мъ и҆ Сы́номъ спокланѧ́ема и҆ сславима** — Якога нароўні з Богам Айцом і Сынам выслаўляем і паважаем.

**Глаго́лавшаго проро́ки** — Які гаварыў цераз пракарокаў (абвяшчаўшых волю Божую).

**Це́рковь** — Царква. У даным выпадку слова гэтае азначае ня месца службы Божай — храм або царкву, але грамаду людзей, злучаную аднэй верай праваслаўнай, законам (правам) Божым, старшынай (іерархіей) царкоўнай і царкоўнымі таінствамі.

**Собо́рнаѧ** — зборная, сабраная з веручых людзей усіх краёў, часоў і народаў.

**А҆по́стольскаѧ** — бо праз апосталаў распаўсюджана, зацьверджана, ўпарадкавана.

**И҆сповѣ́дꙋю** — вызнаю, прызнаю.

**Во ѡ҆ставле́нїе грѣхѡ́въ** — дзеля адпушчэньня ці дараваньня грахоў.

**Ча́ю воскресе́нїѧ ме́ртвыхъ** — будзе некалі час, што душы ўсіх памёршых людзей злучацца са сваімі целамі, і ўсе памёршыя людзі ізноў ажывуць.

vytoki.net



**Жи́зни бꙋ́дꙋщагѡ вѣ́ка** — чакаю жыцьця ў будучым веку.

**Пытаньні:** Як мы павінны верыць? Дзе зьмяшчаецца вызнаньне веры, якую даў нам Сам Бог і Сьвятыя Апосталы? На колькі часьцін дзеліцца Сімвал Веры нашай? Як Сімвал Веры вымаўляецца?

## Дзесяць запаведзяў Закону Божага.

Бог даў нам цераз прарока Майсея 10 запаведзяў, каб мы іх спаўнялі і заслужылі ў Бога царства нябеснае. Вось гэтыя запаведзі:

| | |
|---|---|
| 1. **А҆́зъ є҆́смь гд҃ь бг҃ъ тво́й: да не бꙋ́дꙋтъ тебѣ̀ бо́зи и҆́нїи ра́звѣ менѐ.** | 1. Я—Гасподзь Бог Твой, хай ня будзе ў цябе іншых багоў, апрача Мяне. |
| 2. **Не сотвори́ себѣ̀ кꙋмі́ра и҆ всѧ́кагѡ подо́бїѧ, є҆ли̑ка на небесѝ горѣ̀, и҆ є҆ли̑ка на земли̑ ни́зꙋ, и҆ є҆ли̑ка въ вода́хъ под землею: да не поклони́шисѧ и҆̑мъ, ни послꙋ́жиши и҆̑мъ.** | 2. Не ствары сабе куміра і ўсялякае падобнасьці ні таго, што высака на небе і нізка на зямлі, ні таго, што ў вадзе пад зямлёю,—не пакланяйся ім і ня служы ім. |

| | |
|---|---|
| 3. Не прїе́мли и҆́мене гдⷭ҇а бг҃а твоегѡ̀ всꙋ́е. | 3. Ня ўжывай імя Госпада Твайго дарэмна. |
| 4. По́мни де́нь сꙋббѡ́тнїй, є҆́же свѧти́ти є҆го: ше́сть дне́й дѣ́лай и҆ сотвори́ши въ ни́хъ всѧ̑ дѣ̑ла твоѧ̑: въ де́нь же седмы́й, сꙋббѡ́та гдⷭ҇ꙋ бг҃ꙋ твоемꙋ. | 4. Памятуй дзень суботні, каб сьвяткаваць яго; шэсьць дзён працуй і споўніш у іх усе справы твае; у дзень жа сёмы субота Госпаду Богу твайму. |
| 5. Чти̑ ѻ҆тца̀ твоего̀ и҆ ма́терь твою̀, да бла́го ти бꙋ́детъ, и҆ да долголѣ́тенъ бꙋ́деши на земли́. | 5. Паважай бацьку твайго і маці твою, каб добра табе было і каб даўгалецьце меў на зямлі. |
| 6. Не ѹ҆бі́й. | 6. Не забівай. |
| 7. Не прелюбы̀ сотвори́. | 7. Не чужалож. |



| | |
|---|---|
| 8. Не ѹ҆кра́ди. | 8. Не крадзі. |
| 9. Не послꙋ́шествꙋй на дрꙋ́га твоего̀ свидѣ́тельства ло́жна. | 9. Ня сьведчы неправдзіва на друга твайго. |
| 10. Не пожела́й жены̀ и҆́скреннѧгѡ твоегѡ̀, не пожела́й до́мꙋ бли́жнѧгѡ твоегѡ̀, ни села̀ є҆гѡ̀, ни раба̀ є҆гѡ̀, ни рабы́ни є҆гѡ̀, ни вола̀ є҆гѡ̀, ни ѻ҆сла̀ є҆гѡ̀, ни всѧ́кагѡ скота̀ є҆гѡ̀, ни всегѡ̀, є҆ли̑ка сꙋ́ть бли́жнѧгѡ твоегѡ̀. | 10. Не пажадай жонкі друга твайго, не пажадай дому бліжняга твайго, ні поля яго, ні раба яго, ні рабыні яго, ні вала яго, ні асла яго, ні ўсякай скаціны яго, ні ўсяго, што ёсьць у бліжняга твайго. |

А҆́зъ є҆́смь — Я ёсьць.

Да не бꙋ́дꙋтъ тебѣ̀ бо́зи и҆нї́и ра́звѣ Менѐ — няхай ня будзе ў цябе багоў апрача Мяне, г. ё. адзінага праўдзівага Бога.

Не сотвори̑ себѣ̀ кꙋмі́ра – значыць: не зрабі, не ствары, не выдумляй сабе куміра, ідала, якому, як Богу, мог-бы служыць.



vytoki.net

И вся́каго подо́біѧ, є҆ли́ка на небесѝ горѣ̀, и҆ є҆ли́ка на землѝ ни́зꙋ, и҆ є҆ли́ка въ вода́хъ под землѐю — (не стварай) і усялякае падобнасьці рэчам, якія высока на небе, і нізка на зямлі, ані тым, што ў вадзе й пад зямлёю.

Да не поклони́шисѧ и҆̀мъ, ни послꙋ́жиши и҆̀мъ — каб ня кланяўся ім, ані служыў, гэта дзеля таго, што вялікім грахом ёсьць верыць ня так, як вымагае закон Божы.

Не пріе́мли — не бяры, ня ўжывай.

Всꙋ́е — надарэмна.

Чти̑ ѻ҆тца̀ твоего̀ и҆ ма́терь твою̀ — паважай, шануй бацьку твайго і маці тваю.

Да бла́го ти̑ бꙋ́детъ — каб добра табе было, каб быў шчасьлівы.

Да долголѣ́тенъ бꙋ́деши на землѝ — даўгавечны будзеш. Гэта значыць, за пашану тваю да бацькоў і паслухмянасьць абдарыць цябе Бог здароўем, чаму будзеш шчасьлівы і даўгавечны.

Не прелюбы̀ сотвори — не рабі блуднага граха.

Не послꙋ́шествꙋй на дрꙋ́га твоего̀ свидѣ́тельства ло́жна — не гавары на прыяцеля ці блізкага твайго няпраўдзівага, лжывага сьведчаньня, г. ё. не абмаўляй, ня сьведчы ў судзе бяз прычыны, не кажы наагул няпраўды.

И҆́скренній, бли́жній — блізкі чалавек.

Село̀ — поле.

**Пытаньні:** Цераз каго Бог даў Запаведзі людзям? Колькі запаведзяў? Чаму мы павінны спаўняць запаведзі? Як гаворацца запаведзі?

## Дзьве галоўныя запаведзі Божыя.

Першая: Возлю́биши Гдⷭ҇а Бг҃а твоего̀ всѣ́мъ се́рдцемъ твои́мъ, и҆ все́ю дꙋше́ю твое́ю, и҆ все́ю мы́слію твое́ю.

Другая: Возлю́биши бли́жнѧго твоего̀, ... ъ себѐ.

vytoki.net



## Малітва ранічная.

Къ тебѣ̀, Влⷣко человѣколю́бче, ѿ сна̀ воста́въ, прибѣга́ю, и҆ на дѣла̀ твоѧ̀ подвиза́юсѧ милосе́рдіемъ твои́мъ, и҆ молю́сѧ тебѣ̀: помози̑ мнѣ̀ на всѧ́кое вре́мѧ, во всѧ́кой ве́щи, и҆ и҆зба́ви мѧ̀ ѿ всѧ́кіѧ мі́рскіѧ ѕлы́ѧ ве́щи, и҆ діа́вольскагѡ поспѣше́ніѧ, и҆ спаси́ мѧ̀, и҆ введи̑ въ црⷭ҇тво твоѐ вѣ́чное. Ты́ бо є҆сѝ мо́й сотвори́тель и҆ всѧ́кагѡ бл҃га промы́сленникъ и҆ пода́тель, ѡ҆ тебѣ̀ же всѐ оу҆пова́ніе моѐ, и҆ тебѣ̀ сла́вꙋ возсыла́ю, ны́нѣ и҆ при́снѡ и҆ во вѣ́ки вѣкѡ́въ. А҆ми́нь.

## Малітва вячэрняя.

Гдⷭ҇и бж҃е на́шъ, є҆́же согрѣши́хъ во дни̑ се́мъ, сло́вомъ, дѣ́ломъ и҆ помышле́ніемъ, ꙗ҆́кѡ бл҃гъ и҆ человѣколю́бецъ прости́ ми: ми́ренъ со́нъ и҆ безмѧте́женъ да́рꙋй ми: а҆́гг҃ла твоего̀ храни́телѧ посли́,

покрыва́ющи и҆ соблюда́ющи мѧ ѿ всѧ́кагѡ ѕла̀. Ꙗ҆́кѡ ты̀ є҆сѝ храни́тель душа́мъ и҆ тѣлесє́мъ на́шымъ, и҆ тебѣ̀ сла́вꙋ возсыла́емъ, ѻ҆тцꙋ̀ и҆ сн҃ꙋ и҆ ст҃о́мꙋ дх҃ꙋ, ны́нѣ и҆ при́снѡ и҆ во вѣ́ки вѣкѡ́въ. А҆ми́нь.

## Малітва ангелу-храніцелю.

Кожнаму дзіцяці пры хрышчэньні даецца ад Бога ангел-храніцель — сьцерагчы хрычшонага ад злога праз ўсё яго жыцьцё і заўсёды накіроўваць на добрае. Мы павінны любіць свайго Ангела-храніцеля, не абражаць яго брыдкімі словамі і паступкамі, не адганяць ад сябе і маліцца яму кожнага дня гэтак.

А҆́гг҃ле бж҃їй, храни́телю мо́й ст҃ы́й, на соблюде́нїе мнѣ̀ ѿ бг҃а съ небесѐ да́нный, прилѣ́жнѡ молю́ тѧ: ты̀ мѧ дне́сь просвѣтѝ и҆ ѿ всѧ́кагѡ ѕла̀ сохранѝ, ко благо́мꙋ дѣѧ́нїю наста́ви и҆ на пꙋ́ть спасе́нїѧ напра́ви. А҆ми́нь.

## Малітва за жывых.

Спасѝ, гдⷭ҇и, и҆ поми́лꙋй а҆рхипа́стырѧ на́шего, ѻ҆тца̀ моегѡ̀ дꙋхо́внаго, роди́тели



моѧ̑, бра́тїю, и҆ се́стры и҆ сро́дники моѧ̑ по пло́ти, и҆ всѧ̑ бли́жнїѧ ро́да моегѡ̀, и҆ дрꙋ́ги, и҆ да́рꙋй и҆̀мъ ми́рнаѧ твоѧ̑ и҆ преми́рнаѧ бл҃гаѧ (гэта ёсьць: дай ім усё добрае на гэтым і на тым сьвеце).

## Малітва за памёршых.

Оу҆поко́й гдⷭ҇и, дꙋ́шы оу҆со́пшихъ рабъ твои́хъ, всѣ́хъ сро́дникѡвъ мои́хъ и҆ всѣ́хъ правосла́вныхъ хрїстїа́нъ, и҆ простѝ и҆̀мъ всѧ̑ согрѣше́нїѧ во́льнаѧ и҆ нево́льнаѧ, и҆ да́рꙋй и҆̀мъ ца́рствїе нбⷭ҇ное.

## Пахвала Божай Мацеры.

Мацер Божая дастойна найвышэйшае пахвалы. Яна вышэй і больш праслаўлена, як ангелы і архангелы, хэрувімы і сэрафімы. Яна першая па Богу нашая Заступніца і Малітвеньніца, і мы праслаўляць павінны Яе такімі словамі:

| | |
|---|---|
| Досто́йно є҆́сть ꙗ҆́кѡ вои́стинꙋ бл҃жи́ти тѧ̀ бцⷣꙋ, прⷭ҇нобл҃же́ннꙋю и҆ пренепо- | Годна ёсьць узапраўды ўслаўляць Цябе, Багародзіцу, заўсёды слаўную і най- |

vytoki.net

ро́чнꙋю, и҆ мт҃рь бг҃а на́шегѡ. Чтнѣ́йшꙋю херꙋві́мъ и҆ сла́внѣйшꙋю без сравне́нїѧ серафі́мъ, без и҆стлѣ́нїѧ бг҃а сло́ва ро́ждшꙋю, сꙋ́щꙋю бцⷣꙋ тѧ̀ велича́емъ.

чысьцейшую Маці Бога нашага, чесьнейшую за хэрувімаў і слаўнейшую без параўнаньня за сэрафімаў, нятленна радзіўшую Бога Слова,— Цябе, іcьцінную Багародзіцу, услаўляем.

Блажи́ти — значыць: хваліць, выслаўляць; приснобла же́ннаѧ — заўсёды шчасьлівая; пренепоро́чнаѧ — найчысьцейшая, сьвятая.

**Хэрувімамі** і **Сэрафімамі** называюцца вышэйшыя і бліжэйшыя да Бога ангелы.

Без и҆стлѣ́нїѧ Бо́га Сло́ва ро́ждшꙋю — гэта азначае, што Прачыстая Багародзіца радзіла Ісуса Хрыста бяз мукаў і па народжаньні Яго засталася Дзевай. **Бог Слова** — Сын Божы Ісус Хрыстос.

Сꙋ́щꙋю — праўдзівую, запраўдную.

Пытаньні: У якіх выпадках хрысьціяне праслаўляюць Мацер Божую? Што значыць блажи́ти? — приснобла же́ннаѧ? — пренепоро́чнаѧ? Хто гэта хервꙋві́мы и҆ серафі́мы? Што азначаюць словы: без и҆стлѣ́нїѧ? — Бо́гъ-Сло́во? — Сꙋ́щꙋю?

vytoki.net



## Малітва Багародзіце.

Взбра́нной воево́дѣ побѣди́тельнаѧ, ꙗ҆́кѡ и҆зба́вльшесѧ ѿ ѕлы́хъ, благода́рственнаѧ восписꙋ́емъ ти́ ра́би твои́, бцⷣе: но ꙗ҆́кѡ и҆мꙋ́щаѧ держа́вꙋ непобѣди́мꙋю, ѿ всѧ́кихъ на́съ бѣ́дъ свободи́, да зове́мъ ти́: ра́дꙋйсѧ, невѣ́сто неневѣ́стнаѧ.

Мы, рабы Твае, Багародзіца, збаўленыя Табою ад зла, удзячна пяем Табе, як бы ўзброенаму ваяводзе, пераможныя песьні, а Ты, маючы дзяржаву неперможную, вызвалі нас ад усялякае бяды, каб усклікаць Табе: радуйся, нявеста бязмужная.

## Малітвы канцовыя.

Бж҃е, ми́лостивъ бꙋ́ди мнѣ̀ грѣ́шномꙋ (паклон). Бж҃е, ми́лостивъ бꙋ́ди мнѣ̀ грѣ́шномꙋ (паклон). Бж҃е, ѡ҆чи́сти грѣхи̑ моѧ̑, и҆ поми́лꙋй мѧ̀ грѣ́шнаго (паклон). Бе́зъ числа̀ согрѣши́хъ, гдⷭ҇и, прости́ ми.

Во и҆́мѧ ѻ҆ц҃а̀ и҆ сн҃а и҆ ст҃а́гѡ дх҃а. А҆ми́нь.

## Малітвы на пачатку і пры канцы добрага дзела.

Пачынаючы кожнае добрае дзела перахрысьціся і памаліся гэтак:

**Гдⷭ҇и, благослови̑.**

А канчаючы дзела хрысьціся і маліся такімі словамі:

**Сла́ва тебѣ̀, Бж҃е на́шъ, сла́ва тебѣ̀.**

## Малітва перад абедам і вячэраю.

**Ѻ҆́чи всѣ́хъ на тѧ̀, Гдⷭ҇и, оу҆пова́ютъ, и҆ ты̀ да́еши и҆̀мъ пи́щꙋ во благовре́менїи, ѿверза́еши ты̀ щедрꙋ́ю рꙋ́кꙋ твою̀, и҆ и҆спо́лнѧеши всѧ́ко живо́тно благоволе́нїѧ.**

Вочы ўсіх на Цябе, Госпадзі, спадзяюцца, і Ты даеш усім ежу ў патрэбны час; адкрываеш Ты шчодрую руку Тваю і напаўняеш усё жывое Тваёю міласьцю.

## Малітва па абедзе і вячэры.

**Благодари́мъ тѧ̀, Хрⷭ҇тѐ Бж҃е на́шъ, ꙗ҆́ко насы́тилъ є҆сѝ на́съ земны́хъ твои́хъ бла́гъ: не лиши̑ на́съ и҆ небе́снагѡ твоегѡ̀ ца́рствїѧ.**

Дзякуем Табе, Хрысьце Божа наш, што задаволіў нас зямными Тваімі дарамі: не пазбаў-жа нас і нябеснага Твайго Царства.

## Малітва перад вучэньнем.

**Преблагі́й Гдⷭ҇и, ниспосли̑ на́мъ благода́ть Дх҃а твоегѡ̀ ст҃агѡ, да́рствꙋющагѡ и҆ оу҆крѣплѧ́ющагѡ дꙋше́вныѧ на́шѧ си́лы, да́бы, внима́ѧ преподава́емомꙋ на́мъ оу҆че́нїю, возрасли̑ мы̀ тебѣ̀, на́шемꙋ создателю, во сла́вꙋ, роди́телѧмъ же на́шымъ на оу҆тѣше́нїе, це́ркви и҆ Ѻ҆те́чествꙋ на по́льзꙋ.**

Прадобры Госпадзі! Пашлі нам міласьць Духа Твайго Сьвятога, Які падае і ўзмацняе душэўныя нашы сілы, каб уважліва слухаючы выкладаныя нам навукі, узрасьлі мы Табе, нашаму Стварыцелю на славу, бацьком нашым на пацеху, Царкве і Бацькаўшчыне на карысьць.

vytoki.net

## Малітва пасьля вучэньня.

Благодари́мъ тебѣ, Созда́телю, ꙗ́кѡ сподобилъ є҆сѝ на́съ благода́ти твоеѧ̀, во є҆́же внима́ти ѹ҆че́нїю. Благослови́ на́шихъ нача́льниковъ, роди́телей и҆ ѹ҆чи́телей, веду́щихъ на́съ къ позна́нїю бла́га, и҆ пода́ждь на́мъ си́лꙋ и҆ крѣ́пость къ продолже́нїю ѹ҆че́нїѧ сегѡ̀.

Дзякуем Табе, Стварыцель, што ўчыніў нас годнымі міласьці Сваей, дзеля чаго магглі мы ўважліва слухаць навуку. Багаславі нашых кіраўнікоў, бацькоў і вучыцялёў, якія вядуць нас да пазнаньня дабра, і дай нам сілу і здароўе прадаўжаць нашае вучэньне.

## Малітва сьвятому, імя якога носіш.

Моли Бг҃а ѡ҆ мнѣ, ст҃ы́й ѹ҆го́дниче бж҃їй (ст҃а́ѧ ѹ҆го́дница бж҃їѧ) (імя, якім



называешся), ꙗ́кѡ а҆́зъ ѹ҆се́рдно къ тебѣ̀ прибѣга́ю, ско́ромꙋ помо́щникꙋ и҆ моли́твенникꙋ (ско́рой помо́щницѣ и҆ моли́твенницѣ) ѡ҆ дꙋшѣ̀ мое́й.

Малі Бога аба мне, сьвяты ўгоднік Божы (імя), бо я горача зварочваюся да Цябе, хуткага заступніка і малітаўніка за душу маю.

## Малітва Багародзіце.

Подъ Твою̀ ми́лость прибѣга́емъ, Богоро́дице Дѣ́во, моле́нїй на́шихъ не пре́зри въ ско́рбѣхъ, но ѿ бѣ́дъ и҆зба́ви на́съ, Є҆ди́на Чи́стаѧ и҆ Благослове́ннаѧ.

## Малітва перад прычашчэньнем.

Вѣ́рꙋю, Гдⷭ҇и, и҆ и҆сповѣ́дꙋю, ꙗ́кѡ Ты̀ є҆сѝ вои́стиннꙋ Хрⷭ҇то́съ Сн҃ъ Бг҃а жива́гѡ, прише́дый въ мі́ръ грѣ́шныѧ спастѝ, ѿ ни́хже пе́рвый є҆́смь а҆́зъ. Є҆щѐ вѣ́рꙋю, ꙗ́кѡ сїѐ є҆́сть са́мое пречⷭ҇тое Тѣ́ло Твоѐ,

vytoki.net

И҆ сїѧ̀ є҆́сть са́маѧ чⷭ҇таѧ Кро́вь Твоѧ̀. Молю́сѧ ᲂу҆́бѡ Тебѣ̀: поми́лꙋй мѧ̀, и҆ прости́ ми прегрѣше́нїѧ моѧ̑ во́льнаѧ и҆ нево́льнаѧ, ꙗ҆̀же сло́вомъ, ꙗ҆̀же дѣ́ломъ, ꙗ҆̀же вѣ́дѣнїемъ и҆ невѣ́дѣнїемъ: и҆ сподо́би мѧ̀ неѡсꙋжде́ннѡ причасти́тисѧ пречи́стыхъ Твои́хъ та́инствъ, во ѡ҆ставле́нїе грѣхѡ́въ, и҆ въ жи́знь вѣ́чнꙋю.

Ве́чери Твоеѧ̀ та́йныѧ дне́сь, Сн҃е Бж҃їй, прича́стника мѧ̀ прїимѝ, не бо врагѡ́мъ Твои̑мъ та́йнꙋ повѣ́мъ, ни лобза́нїѧ Ти̇̀ да́мъ ꙗ҆́кѡ Їꙋ́да, но ꙗ҆́кѡ разбо́йникъ и҆сповѣ́даю Тѧ: помѧни́ мѧ, Гдⷭ҇и, во црⷭ҇твїи Твое́мъ.

Да не въ сꙋ́дъ, или̇̀ во ѡ҆сꙋжде́нїе бꙋ́детъ мнѣ̀ причаще́нїе свѧты́хъ Твои́хъ та̑инъ, Гдⷭ҇и, но во и҆сцѣле́нїе дꙋши̇̀ и҆ тѣ́ла. А҆ми́нь.

# КАРОТКАЯ СЬВЯШЧЭННАЯ ГІСТОРЫЯ.

## СТАРЫ ЗАВЕТ.

### Паняцьце аб ангелах. Стварэньне сьвету.

Раней стварэньня гэтага відочнага сьвету, Бог стварыў сьвет нявідочны, пад якім разумеюць ангелаў. Ангелы гэта духі бесьцялесныя, разумныя, абдараныя магутнасьцяй і свабоднай воляй. Усе ангелы былі створаны добрымі, але ня ўсе ўтрымаліся ў стане дабра. Адзін з вышэйшых ангелаў заганарыўся перад Богам і не захацеў Яму падпарадкавацца. Ён адзяліўся ад Бога і зрабіўся злым, ліхім, благім. Гэты злы ангел называецца дзяблам, альбо шатанам.

За шатанам пайшлі іншыя ангелы, якія таксама не паслухалі Бога і сталіся благімі. Яны называюцца злымі духамі і спакушаюць людзей на ўсялякія злыя дзеяньні.

Аднак вялікае мноства ангелаў засталося верным Богу, з любоўю служыць Яму і разам з Ім карыстаецца шчасьцем у Ягоным царстве нябесным. Добрыя ангелы дзеляцца паводле заслугаў сваіх і маюць розныя назовы. Адны з іх завуцца проста ангеламі, другія — архангеламі, іншыя хэрувімамі і сэрафімамі.

Кожнаму з нас, хрысьціян, даецца ад Бога асобны ангел, каб сьцярог нас ад злога і дапамагаў у добрых рэчах. Гэты ангел завецца **ангелам храніцелем** (вартаўніком).

Аб стварэньні відочнага сьвету гэтак гаварыцца ў Сьвятым Пісаньні. На пачатку стварыў Бог неба і зямлю. Зямля была нявідочнаю і неўпарадкаванаю. Упадкаваў зямлю Бог за шэсьць дзён.

У першы дзень Бог стварыў сьвятло і назваў сьвятло дзень, а цемру — ноч. Другога дня стварыў Бог цьвердзь, альбо бачанае намі неба. Трэцяга — аддзяліў воду ад зямлі і загадаў зямлі прарасьціць расьліны. Чацьвер-

vytoki.net

тага — стварыў сонца, месяц і зоры. Пятага дня — стварыў Бог рыбы і птушкі. Шостага — жывёлу і ў канцы чалавека.

### Стварэньне чалавека.

Цела чалавека стварыў Бог з зямлі, але абдарыў яго душою жывою, разумнаю, вольнаю і несьмяротнаю. Гэтым Бог прыраўняў чалавека да Сябе і аддзяліў ад неразумнай жывёлы.

Першага чалавека Бог назваў Адамам і пасяліў у раі (прыгожым садзе). Пасярод раю расьлі два нязвычайныя дрэвы: дрэва жыцьця, ад пладоў якога прабацькі нашыя маглі б жыць вечна, і дрэва пазнаньня дабра і зла Бог сказаў Адаму: „Плады ўсялякага дрэва ў садзе ты можаш есьці, але з дрэва пазнаньня дабра і зла ня еш пладоў, бо як толькі ўкусіш плоду з дрэва гэтага, памрэш. Потым выняў Бог у Адама, як спаў ён, рабро і стварыў з рабра гэтага жонку яму Эву.

Сёмага дня Бог адпачываў і загадаў у дзень гэты маліцца і рабіць добрыя ўчынкі. Сёмы дзень названы **суботаю,** што значыць **супакой** альбо **адпачынак**.

### Жыцьцё першых людзей у раі. Грэхападзеньне прабацькоў нашых. Кара за грэх. Абяцаньне Збавіцеля.

У раі першыя людзі жылі шчасьліва. Яны ня ведалі ніякага страху; ні цела іх, ні душа ня зналі ні хваробы ні мукаў. Сам Бог зьяўляўся ім і гутарыў з імі. Але шчасьце было недаўгавечна. Дзябал пазавідаваў першым людзям і захацеў згубіць іх. Ён прыкінуўся гадам і ўгаварыў Эву зьесьці плод з забароненага дрэва. Эва паслухала дзябла. Яна ўзяла плод і зьела, а потым дала мужу свайму, і ён еў. Такім чынам, Адам і Эва не датрымалі загаду Божага і гэтым самым саграшылі перад Богам. Пасьля-ж, замест каб пакаяцца, прызнацца і прасіць Бога дараваць грэх, яны пачалі апраўдывацца і вінаваціць адзін аднаго: Адам казаў, што яго спакусіла жонка, Эва казала, што яе спакусіў гад (зьмей).

Пасьля гэтага Бог пакараў дзябла і першых людзей. [illegible] Бог, што цяжкай працай да поту будзе

vytoki.net



ён здабываць сабе хлеб, пакуль не памрэ; Эве — што ў страшных болях будзе раджаць дзяцей, дзябла-ж, які спакусіў першых людзей, пракляў.

У той-жа час абяцаў Бог першым людзям, што з патомства жанчыны выйдзе Пераможнік дзябла (разумеецца Збавіцель, Сын Божы Ісус Хрыстос), які верне людзям шчасьлівае жыцьцё.

Грэх Адама і Эвы перайшоў на ўсіх патомкаў іх і называецца першародным грахом.

### Жыцьцё першых людзей па-за раем. Дзеці Адама і Эвы.

З сорамам і страхам вышлі Адам і Эва з раю. Край, у якім яны асяліліся, быў дзікай пустыняй. Цяжкаю працай павінны яны былі даставаць для сябе яду. Апанавалі іх хваробы і розныя няшчасьці.

Пасьля выгнаньня з раю, у Адама і Эвы пачалі раджацца дзеці. Першага сына яны назвалі Каінам, а другога — Авэлем. Авэль пасьвіў статак, Каін абрабляў поле. Заняткі гэтыя разьдзялілі іх. Паміж братамі пашла варожасьць. Аднаго разу прынасілі яны ахвяры Богу. Бог ахвяру Авэля прыняў, а Каінаву адкінуў. З таго часу Каін яшчэ больш зьненавідзеў брата свайго, а пасьля і забіў яго. Бог пракляў за гэта Каіна. І стаў ён выгнанцам і бадзякай на зямлі, не знаходзячы сабе спакою.

Замест Авэля, Бог паслаў Адаму і Эве трэцяга сына — набожнага Сіфа. Ад сям'і Адама і Эвы, у якой былі і дочкі, пашырыўся ўвесь род чалавечы.

### Патрыархі.

У меру размножаньня людзей, асабліва патомкаў Каіна, пачало пашырацца на зямлі ўсялякае злачынства і нявера. Толькі патомкі Сіфа жылі між сабою ў згодзе. Яны адны захоўвалі Божае адкравеньне аб будучым Збавіцелю. Усё жыцьцё іх праходзіла пад кіраўніцтвам старэйшых у родзе, якія называліся **патрыархамі.** Патрыархі вядомы былі сваёю справядлівасьцю і мудрасьцю. Ад імя роду яны прыносілі ахвяры Богу, рашалі сямейныя спрэчкі, падтрымлівалі просты, блізкі да пры-

роды ўклад жыцьця. Каб патрыархі маглі перадаць якнайбольшаму ліку людзей Божае адкравеньне, Бог надзяляў патрыархаў даўгалецьцем. Так, Адам жыў 930 гадоў, Сіф — 912 г., а патрыарх Мафусаіл аж 969 гадоў.

Патомкі Каіна і Сіфа спачатку жылі асобна, далёка адны ад адных. Але з працягам часу патомкі Сіфа зьмяшаліся з патомкамі Каіна і заразіліся ад іх нявераю і распустаю. Хутка ўся зямля напоўнілася страшным злачынствам, бяспраўем і гнётам. Праведна жыў адзін толькі Ной з сваёй сям'ёй. Цераз патрыярхаў Бог ня раз клікаў людзей да паправы, але людзі ня слухалі гэтага голасу. Тады Бог пастанавіў пакараць грэшны род людзкі патопам, каб выклікаць да жыцьця новае пакаленьне людзей, якія шанавалі-б Бога і памяталі аб Ім.

## Сусьветны патоп.

Па загаду Божаму, Ной пабудаваў каўчег ці вялікі карабель, у які — да пачатку патопу — ўвёў жывёлы і птушкі (чыстых па 7 пар, нячыстых па дзьве пары) і зрабіў запас патрэбнай для ўсіх на адзін год стравы. На-пасьледку, увайшоў у каўчэг сам з жонкаю і тры яго сыны: Сім, Хам і Іафэт, таксама кожны з сваёю жонкаю. Пасьля гэтага пачаўся нязвычайна вялікі дождж, які ліў бязупынна 40 дзён і ночаў. Вада пакрыла самыя найвышэйшыя горы і патапіла ўсё жывое на зямлі, апрача тых, якія былі ў каўчэзе. Цераз 150 дзён вада пачала спадаць, і каўчэг затрымаўся на гары Арарат. Калі зямля абсохла, Ной з сям'ёй выйшоў з каўчэгу і пасьпяшыў прынясьці ахвяру Богу. Гэта была ня толькі ахвяра ўдзячнасьці за збаўленьне, але і выказ веры ў абяцанага Збавіцеля сьвету. Бог прыняў ахвяру праведніка, багаславіў Ноя і сыноў яго на размнажэньне, аддаў ім у валаданьне ўсю зямлю, дазволіў ужываць у яду і жывёлы, забараніўшы толькі есьці кроў іх, і назначыў кару сьмерці таму, хто адважыцца забіць чалавека. Апрача таго Бог абяцаў людзям, што болей ня будзе ўсясьветнага патопу, і ў адзнаку спаўненьня гэтага палажыў на небе вясёлку, або радугу.

## Паяўленьне ідалапаклонства.

Па патопе людзі ізноў размножыліся і, пакуль усе жылі разам, захоўвалі веру ў Бога. Але з працягам часу, расьсяліўшыся па розных краінах, адасобіўшыся са сваёю моваю і звычаямі, пачалі забывацца аб праўдзівым Богу і сталі ўбагаўляць розныя сілы і зьявы прыроды. Замест аднаго **ісьціннага** Бога зьявілася грамада відочных багоў, добрых і злых, гледзячы на тое, ці прыносілі яны чалавеку шкоду ці дабро. Так зьявіліся **куміры** ці **ідалы**, якіх пачалі рабіць з дзерава, каменя ці мэталю, і якім пачалі пакланяцца. Ідалапаклоньнікі звычайна называюцца паганцамі.

Ідалапаклонства ўсё болей і болей распаўсюджвалася між людзьмі і, у канцы, дайшло да таго, што амаль ня ўсе людзі на зямлі пачалі пакланяцца ідалам. Тады Бог, па Свайму міласэрдзю, абраў з усяго чалавецтва адзін народ для захаваньня праўдзівай веры на зямлі да часу прыходу абяцанага Збавіцеля. Гэты абраны народ былі яўрэі, якія паходзяць ад Аўраама, з патомства Сіма, сына Ноя.

## Аўраам. Зьяўленьне Бога Аўрааму.

Бог абраў праведнага Аўраама, каб захаваць у яго патомстве праўдзівую веру. Аўраам атрымаў ад Бога загад выселіцца з Мэсапатаміі, дзе ён жыў, у зямлю Ханаанскую, у Палестыне. «Гэтую зямлю — сказаў Бог Аўрааму — Я дам табе і твайму патомству» (чаму зямля гэтая і стала называцца Зямлёю Абяцанаю). Аўраам узяў усю сям'ю і маемасьць сваю (шматлікія статкі жывёлы свойскай), і пайшоў у прызначаную яму краіну.

Аўраам ня меў дзяцей, аднак Бог сказаў яму, што родзіцца ў яго сын, і што патомства сына гэтага будзе вельмі вялікім і слаўным, і з яго выйдзе Збавіцель.

Пасьля гэтага, ўгледзіў аднаго разу Аўраам ідучых да яго падарожнікаў. Ён пакланіўся ім і запрасіў да сябе. Адзін з іх (гэта былі Гасподзь і з Ім два ангелы) паўтарыў Аўрааму абяцаньне аб народжаньні ў яго сына.

Цераз год у Аўраама і жонкі яго Сары ўзапраўды радзіўся сын, якому далі імя яны **Ісаак**.



vytoki.net

## Прынашэньне Ісаака ў ахвяру Богу.

Калі Ісааку было каля 20 гадоў ад роду, Бог зьявіўся Аўрааму і сказаў: „Вазьмі сына свайго Ісаака, якога ты любіш, пайдзі з ім у зямлю Морыа, і там прынясі яго ў ахвяру на гары, якую Я пакажу табе“. Гэта была вялікая спроба для веры Аўраама. Аўраам узяў Ісаака, і пайшоў у вызначанае месца. Узыйшлі на верх гары. Аўраам зрабіў ахвярнік, палажыў дровы і абвясьціў Ісааку Божы загад. Ісаак не працівіўся і пакорна дазволіў сябе зьвязаць. Аўраам узяў нож і ўжо падняў руку, каб закалоць сына, як пачуў голас з неба: «Аўраам, не паднімай рукі свае на сына. Я ведаю, што ты баішся Бога і не пашкадаваў для Мяне сына свайго адзінага». Аўраам стрымаўся. Ён споўніў волю Божую, і Ісаак застаўся жывым. Аўраам паглядзеў навакола і ўбачыў з-заду за сабою ягня, якое заблуталася рагамі ў кустох. Аўраам узяў яго і на тым самым ахвярніку прынёс яго ў ахвяру Богу. За послух і веру Бог урачыста і з прысягаю паўтарыў Аўрааму Сваё абяцаньне: „Дзеля таго, што ты не пашкадаваў для Мяне сына свайго адзінага, Я багаслаўлю цябе і размножу патомства твае, як зоркі нябесныя і як пясок на беразе мора, і цераз твайго Патомка багаслаўляцца ўсе народы зямныя“.

Ахвярапрынашэньне Ісаака было правобразам найбольшое збаўчае ахвяры, якую прынёс на Галгофе Адзінародны Сын Божы Ісус Хрыстос.

## Сон Якава, сына Ісаака.

У Ісаака былі два сыны: Ісаў і Якаў, празваны Ізраілем. Ісаак перад сваёю сьмерцю багаславіў малодшага сына — Якава і прадказаў, што з яго патомства прыдзе Збавіцель людзей. За гэта Ісаў узьненавідзеў брата і нават хацеў забіць яго, дзеля чаго Якаў прымушаны быў уцячы з бацькавае хаты да дзядзькі свайго ў Мэсапатамію.

Па дарозе Якаў зморены — лёг, сярод чыстага поля, спаць, падлажыўшы пад галаву камень замест падушкі. І вось бачыць ён дзіўны сон: стаіць на зямлі высокая-высокая драбіна; канцом сваім яна ўпіраецца

vytoki.net



ў самае неба. Ангелы Божыя ўсходзяць і нісходзяць па ёй. Угары драбіны—Сам Гасподзь. Гасподзь сказаў Якаву: „Ня бойся. Зямлю, на каторай ты сьпіш, Я дам табе і твайму патомству. І будзе патомства тваё, як пясок зямны. І буду Я з табою ўсюды, куды ні пойдзеш, і вярну цябе ў гэтую зямлю“. Якаў прачхнуўся. На памяць аб гэтым дзіўным зданьні ён паставіў тут ахвярнік.

Драбіна, якую бачыў ва сьне Якаў, была правобразам Маці Божай, ад Якой Сын Божы нарадзіўся на зямлі.

## Гісторыя Іосіфа.

Пражыў Якаў у дзядзькі свайго шмат гадоў, жаніўся там і напасьледак вярнуўся дамоў. Было ў яго дванаццаць сыноў. Аднаго з іх, Іосіфа або Язэпа, ён асабліва любіў. Бачыў Іосіф аднаго разу сон. Нібыта вязаў ён з братамі снапы на полі. Яго сноп стаяў, а снапы братнія кланяліся снапу гэтаму. Расказаў Іосіф сон гэты братом, і абразіліся браты: «Няўжо (сказалі яны) ты будзеш панаваць над намі?» Хутка пасьля гэтага прысьніў Іосіф другі сон: сонца, месяц і адзінаццаць зорак кланяліся яму. Нават Якаў загневаўся, калі Іосіф расказаў яму гэты сон: „Няўжо, сказаў ён, я і твая маці, і браты твае будзем кланяцца табе?“

Не падабалася братом Іосіфа, што бацька любіў яго больш, як іх. Пасьля-ж гэтых сноў яшчэ больш узьненавідзелі Іосіфа і прадалі яго купцом, якія ехалі з таварамі ў Эгіпэт. Бацьку яны сказалі, што зьверы разарвалі Іосіфа, а каб бацька веры даў, вымазалі адзежу Іосіфаву ў крыві казьляняці і паказалі яму. Бацька паверыў ім і доўга плакаў па любым сыну.

## Іосіф у Эгіпце.

Людзі, што купілі Іосіфа, прывязьлі яго ў Эгіпэт і прадалі начальніку прыбочнай стражы эгіпэцкага цара. Начальнік палюбіў Іосіфа і вызначыў яго даглядчыкам свайго дому. Але жонка начальніка абгаварыла Іосіфа. Начальнік паверыў жонцы і пасадзіў Іосіфа ў вастрог. У вастрозе Іосіф стаў ведамы, як адгадчык сноў і, калі

цар бачыў два асаблівыя сны, якіх ніхто ня мог адгадаць, паклікалі да цара Іосіфа.

Цар расказаў яму свае сны. Бачыў ён, як з рэчкі вышла сем сытых кароваў. Сьледам за імі вышло сем худых, якія зьелі сытых. Другім разам цар сьніў, што на адным сьцябле вырасла сем каласоў з поўнымі зярнятамі, а на другім сем каласоў пустых: пустыя каласы пажэрлі каласы поўныя.

Іосіф вытлумачыў сны гэтыя так: спачатку ў Эгіпце будзе сем вельмі ўраджайных гадоў, за імі-ж пайдзе сем гадоў недароду. Дзеля гэтага радзіў ён цару вызначыць разумнага чалавека, які-б за сем першых год зрабіў запас хлеба на час недароду. Цару падабалася гэтая рада і ён паставіў самога Іосіфа начальнікам усяго царства свайго.

Насталі ўраджайныя гады. Іосіф прызапасіў столькі хлеба, што ўрэшце зьлічыць яго ня мог. Калі-ж настаў голад, пачаў прадаваць хлеб патрабуючым.

## Падарожа ў Эгіпэт братоў Іосіфа.

У той час быў недарод і ў Палястыне, дзе жыў Якаў з рэштай сыноў сваіх. Калі ня стала збожжа, Якаў паслаў дзяцей ў Эгіпэт, каб купілі там хлеба. Паехала туды дзесяць сыноў Якава, малодшы-ж, Вэніямін, застаўся пры бацьку.

Прыехаўшы ў Эгіпэт, браты прышлі да галоўнага начальніка, Іосіфа, але не пізналі яго. Яны прасілі прадаць ім хлеба і нізка кланяліся Іосіфу. Ён-же пазнаў братоў і прыпомніў сон.

Пазнаўшы братоў, Іосіф захацеў даведацца ад іх, што сталася з бацькам яго, Якавам, і братам Вэніямінам. Але яму не хацелася пытацца ў іх аб гэтым: ён хацеў, каб яны самі расказалі яму ўсё. Таму прыняў ён іх шорстка; гаварыў эгіпэцкай мовай, цераз тлумача; назваў іх шпіёнамі, што прышлі даведацца аб парадках у чужым краі.

Браты пачалі апраўдывацца і казалі, што яны ніколі ня былі шпіёнамі, што яны не благія людзі, дзеці аднаго бацькі; было іх дванаццаць, але адзін згінуў, а другі застаўся дома.

vytoki.net



Даведаўшыся такім чынам, што Якаў і Вэніямін жывуць, Іосіф захацеў пабачыць свайго малодшага брата. Загадаўшы сваім падуладным даць братом хлеба, колькі яны могуць давязьці, Іосіф вымагаў ад братоў, каб хутчэй прывязьлі да яго іх брата, што пры бацьку застаўся, а каб не ашукалі, аднаго з іх пакінуў пры сабе.

Тут браты пачалі гутарыць між сабою сваёю мовою, думаючы, што Іосіф не разумее іх. Пачалі яны казаць, што несправядліва і жорстка абышліся з братам Іосіфом, і сталі прызнавацца, што гэта Бог карае іх цяпер за брата. Іосіф усё зразумеў, расчуліўся вельмі, вышаў у другі пакой і заплакаў.

Дзесяць братоў вярнуліся дадому, а як куплены хлеб вышаў, паехалі зноў у Эгіпэт і ўзялі з сабою Вэніяміна. Прыйшлі ўсе да Іосіфа. Ён запрасіў іх да сябе ў палац на абед і пасадзіў за сталом паводле старшынства. Гэта вельмі зьдзівіла братоў; усё-ж яны не маглі зразумець, што абедаюць у праданага брата свайго.

Абдарыўшы ўсіх, Іосіф загадаў ім ехаць назад, толькі малодшага Вэніяміна хацеў пакінуць пры сабе. Браты пачалі прасіць яго не рабіць гэтага, бо,—як запеўнялі яны,—бацька іх не перажыве ўтраты любага сына. Тады Іосіф заплакаў і прызнаўся, што ён той самы брат, якога яны ўзьненавідзелі і прадалі ў рабства.

Браты спалохаліся. Яны думалі, што Іосіф, маючы ўладу, стане мсьціцца. Але Іосіф не хацеў плаціць ім злом за іхнюю ненавісьць да яго, за іх жорсткасьць. Па дабраце сваёй, Іосіф выбачыў жорсткім братом сваім, расплакаўся і стаў абнімаць іх. Сорамна было братом перад Іосіфам.

Хутка пасьля таго Іосіф аб'явіў братом, што цар эгіпэцкі запрашае іх з бацькам, усёй радзімай і ўсім дабром перасяліцца на сталае жыцьцё ў Эгіпэт, дзе ім будзе дадзена лепшая зямля.

## Перасяленьне Якава ў Эгіпэт. Яўрэі ў Эгіпце.

Якаў з радзімай перасяліўся на прызначаную яму зямлю, Іосіф-жа і па заканчэньні голаду застаўся начальнікам Эгіпту. Сям'і Якава жылося пры Іосіфе вельмі добра.

Калі Якаў паміраў, дык сказаў сыну свайму Юдзе, што патомкі яго будуць царамі яўрэйскімі, а як скончыцца ўлада іх і над жыдамі запануе чужынец, тады прыйдзе абяцаны Богам Збавіцель.

Патомкі Якава называліся яўрэямі, таму што сам Якаў паходзіў ад Эвера, прапраўнука Ноевага.

Пасьля сьмерці Іосіфа цары эгіпэцкія пачалі забывацца аб яго заслугах і зьмянілі адносіны да жыдоў. Асабліва-ж нядобра яўрэям стала, як размножыліся яны, так што цары пачалі баяцца, каб не злучыліся яны з суседзямі і ня завалодалі Эгіптам. Эгіпцяне сталі перасьледваць яўрэяў, цясьніць іх, марыць цяжкімі работамі. Немагчымым станавілася жыцьцё яўрэяў.

### Майсей. Узгадаваньне Майсея. Уцёк яго з Эгіпту.

Дзеля збаўленьня яўрэйскага народу ад няволі ў Эгіпце Бог паслаў Майсея.

Майсей паходзіў з калена Левія; быў нязвычайна прыгожым дзіцянём. Згодна з царскім загадам, кожная маці нованароджанага яўрэйскага дзяцёнка павінна была кінуць яго ў раку.

Адна жыдоўка ўтаіла народжанага хлопчыка і хавалася з ім тры месяцы. Але баялася яна, што ўсё роўна адбяруць ад яе сына і кінуць у рэчку. Дзеля гэтага сама палажыла яго ў асмолены кошык і пайшла з старэйшаю дачкою на рэчку на месца, дзе заўсёды купалася царская дачка. Там паставіла яна кошык пры беразе ў чарот і адыйшлася, а дзяўчынцы казала здалёк наглядаці. Незабаўкам прыйшла царэўна купацца, ўбачыла кошык і загадала прынясьці да яе. Яна дагадалася, што гэта адна з жыдоўскіх матак схавала свайго сына, і захацела ўзяць да сябе дзіця гэтае. Тутака падыйшла сястра знойдзенага хлопчыка і запрапанавала царэўне знайсьці мамку. Тая згадзілася і дзяўчына прывяла сваю матку.

Дзіцяці далі імя **Майсей**, што па-нашаму азначае «выняты з вады».

Царэўна ўсынавіла Майсея і ён гадаваўся пры двары царскім. Калі ён стаў падрастаць, яго навучылі ўсяго, што зналі самыя мудрыя людзі таго часу. Пра- [illegible] у палацы царскім 40 гадоў. Знаў ён і сваю

vytoki.net



матку, і брата Аарона, і сястру сваю. Ведаў і ўсе няшчасьці жыдоў, адданых ужо ў рабства эгіпэцкаму цару. Шкада яму было сваіх, але выбавіць іх з рабства гэтага, з няволі ён ня мог.

Пэўнага разу ўгледзіў Майсей, што эгіпцянін моцна б'е яўрэя. Ён заступіўся за пакрыўджанага і, боручыся, зьнячэўку забіў эгіпцяніна. Ведаючы, што паводле законаў эгіпэцкіх яго засудзяць на сьмерць, Майсей загроб у пясок труп забітага эгіпцяніна, а сам уцёк. Яму было тады 40 гадоў. Прыйшоў ён у суседні край і наняўся пастухом да аднаго багатага чалавека, Іафора, з дачкой якога пазьней ажаніўся.

### Прызваньне Майсея. Паварот Майсея ў Эгіпэт. Майсей перад фараонам (царом).

Пражыў Майсей 40 гадоў у свайго цесьця. Увесь час гараваў ён аб долі свайго народу ў Эгіпце; думаў аб уціску і няшчасьцях, якія зносіць ён там. Здавалася Майсею, што згінуць яўрэі, як гіне дрэва, кінутае ў агонь. І вось знаходзячыся аднаго разу ля гары Харыву, угледзіў ён цярновы куст, які гарэў, але згарэць ня мог. У полымі гаручага куста зьявіўся яму Ангел Гасподні. Падышоў Майсей да куста і пачуў з сярэдзіны яго голас, кажучы яму ісьці ў Эгіпэт і дамагацца ад цара, каб адпусьціў ён з Эгіпту ўсіх жыдоў. Гэта быў голас Самога Бога. Майсей паслухаў Яго і пайшоў у Эгіпэт. Там, з братам сваім Ааронам, ён патрэбаваў, каб цар дазволіў жыдом прынясьці ў пустыні ахвяры Богу. Цар прагнаў іх і ўдвая дадаў жыдом работы.

Пасьля адмовы цара звольніць яўрэяў, на народ эгіпэцкі пасыпаліся няшчасьці. Найстрашнейшым і апошнім было — раптоўная сьмерць усіх першародкаў эгіпэцкіх. Разумеючы, што гэтымі бедамі Бог карае эгіпцян за ўціск жыдоў і за жорсткае абходжаньне з імі, цар загадаў, нарэшце, звольніць іх.

### Пасха і выхад яўрэяў з Эгіпту.

Гасподзь загадаў цераз Майсея аддзяліць з статку для кожнай яўрэйскай сям'і аднагадовае ягня, мужчынскага полу, і ў 14-ы дзень веснавога месяца Нісана,

ўвечары, заколоць яго, памазаўшы крывёю вушакі і дзьверы хатаў сваіх, сьпячы на агні і зьесьці з прэсным хлебам і горкімі травамі. Есьці ягня трэба было з пасьпешнасьцю, падперазаўшыся, з посахамі ў руках, у сандалах, з торбамі за плячыма, зусім гатовымі ў дарогу. «Гэта — Пасха Гасподня», — сказаў Бог Майсею. „Дзень гэты сьвяткуйце ўва ўсе роды вашыя“.

Ізраільцяне споўнілі ўсё, як загадаў ім Гасподзь. Калі ўсё было гатова, народ рушыў у дарогу са ўсёю маемасьцю сваёю, са ўсімі статкамі сваімі.

На памяць аб збаўленьні з рабства эгіпэцкага, яўрэі дасюль сьвяткуюць Пасху. Пасха яўрэйская была правобразам Пасхі Новазаветнай, калі Ісус Хрыстос, як ягня чыстае і бязваднае, праліў сваю кроў за грахі людзей і вызваліў іх ад сьмерці і рабства дзяблу.

### Пераход яўрэяў цераз Чырвонае мора.

Майсей, па загаду Божаму, павёў яўрэяў пустыняй да Чырвонага мора. Удзень ім дзіўна паказваў дарогу хмарны стоўп, а ўночы — агнявы. Ідучы за стаўпом, яўрэі прышлі да Чырвонага мора і тутака раскінуліся лягерам.

Тымчасам эгіпцяне пачалі шкадаваць, што адпусьцілі яўрэяў — такое мноства дармавых працаўнікоў. Быў выданы загад — безадкладна пусьціцца ў пагоню, каб вярнуць іх. Спалохаліся яўрэі, калі ўбачылі пагоню, але замест таго, каб прасіць у Бога помачы, пачалі наракаць на Майсея, нашто ён вывяў іх з Эгіпту. Майсей падбодраваў іх, а сам у глыбіні душы ўзносіў моцную малітву да Бога. Бог прыхіліўся да малітвы Майсея і загадаў яму ўдарыць па вадзе сваім посахам. Калі Майсей працягнуў на мора свой посах, дык вада расступілася і агалілася сухое дно. І пашлі сыны Ізраіля пасярод мора па сухаземьмі; вада стаяла сьцяной па адным і па другім баку. Эгіпцяне па тым самым дне марскім пагналіся за адходзіўшымі. Калі яны былі на сярэдзіне мора, а апошнія рады яўрэяў уже на другім беразе, дык Майсей ізноў працягнуў руку сваю на мора, і вада вярнулася на сваё месца, пакрыўшы ўсе калясь-... ойска фараонава. Эгіпцяне згінулі ўсе да

vytoki.net



аднаго. Пасьля гэтага ізраільцяне сьпявалі Госпаду песьню ўдзячнасьці і перамогі. Гэта быў самы шчасьлівы дзень ўва ўсёй гісторыі яўрэйскага народу, бо гэты дзень прынёс народу доўгачаканую волю.

### У гары Сінайской. Дараваньне 10 запаведзяў.

Майсей, бачачы асаблівую міласьць Божую да жыдоў, лічыў, што яны павінны заснаваць асаблівае Царства, пад кіраўніцтвам Самога Бога. Але яўрэі, пражываючы ў Эгіпце сярод паганцаў, многа дрэнага пераймалі ад іх. Яны блізка што забыліся, чага вымагае Бог ад людзей. Дзеля гэтага, каб зладзіць з яўрэяў Царства Божае, патрэбна была асаблівая помач Божая: трэба было, каб Сам Бог пераказаў ім Сваю волю, і каб воля Яго была для ўсіх яўрэяў абавязкава, як царскі закон. І Бог аб'явіў Сваю волю ў дзесяцёх запаведзях.

Запаведзі гэтыя ўрачыста былі дадзены Богам на гары Сінаі ў 50-ты дзень па выхадзе з Эгіпту і называюцца сінайскімі запаведзямі.

Па загаду Божаму, народ тры дні малітваю і пастом гатовіўся да прыняцьця запаведзяў ад Бога. На трэці дзень, зрана, раптам загрымела, бліснула маланка: цёмная хмара ўкрыла гару Сінай, чуцён быў моцны гук трубы. Перапужаўся народ, які табарам аблажыў гару. І вывеў Майсей народ з табару на спатканьне Богу, стаўшы пад гарою. Уся гара курэла, Бог зышоў на яе ў агні. Дым укрываў яе, выходзячы, як з печы. Уся гара траслася. Пачуўся голас Божы і народ са страхам і пакорай выслухаў 10 запаведзяў Божых.

У гэтых запаведзях Бог паказаў людзям, як яны павінны жыць, каб быць шчасьлівымі і маглі зьдзейсьніць на зямлі Царства Божае, альбо той рай, які Адам і Эва страцілі за свой грэх.

Выслухаўшы ўсе запаведзі, стоячы пад гарой народ абяцаў выпаўняць іх.

### Скінія Майсеева.

Майсей, па загаду Божаму, збудаваў пераносны храм (скінію), дзе яўрэі маглі маліцца Богу і складаць Яму ахвяры (ягня, цяля, казьляня, галубы, віно, масла і інш.).

Для служэньня Богу ў скініі Майсей вызначыў свайго брата Аарона, як галоўнага сьвяшчэньніка, або першасьвяшчэньніка. Сыноў Аарона ён прыдзяліў да скініі, як сьвяшчэньнікаў, а насіць скінію і служыць пры ёй вызначыў усіх патомкаў Левія, сына Якавага. Гэтыя чалі звацца лявітамі.

Скінія складалася з дзьвёх частак: сьвяцілішча і сьвятое сьвятых. Яна была абкружана з усіх бакоў асобным дваром. У двары стаяў **аўтар ахвярапрынашэньняў**, на якім прыносілі ахвяры і падтрымлівалі незгасаўшы агонь. У сьвяцілішчы, куды мелі права ўваходзіць толькі сьвяшчэньнікі, стаяў **стол** з 12 сьвятымі хлебамі, **сямісьвечнік**, які гарэў заўсёды, і **аўтар кадзільны** для курэньня ладану. Часьць скініі за сьвяцілішчам, якая аддзялялася ад яго завесаю, і куды меў права ўваходзіць толькі першасьвяшчэньнік (адзін раз у год), называлася **сьвятое сьвятых.** Тут знаходзілася галоўная сьвятыня яўрэяў — **каўчэг завету**. У каўчэзе знаходзіліся скрыжалі завету, судзіна з маннаю і пазьней — посах Аарона.

## Вандраваньне яўрэяў па пустыні.

Дарога яўрэяў ад Чырвонага мора йшла па дзікай, бясплоднай пустыні. Калі вышлі запасы вады, хлеба і мяса, народ пачаў наракаць на Майсея. Майсей зьвярнуўся з малітваю аб помачы да Бога. І вось увечары ўся мясцовасьць каля лягеру пакрылася зграямі перапёлак, а раніцай наступнага дня — нейкімі белымі крупінкамі: гэта была «манна», якая служыла яўрэям штодзенным хлебам да самага ўваходу ў Зямлю Абяцаную. Удзень яе нельга было знайсьці: яна растоплівалася ад праменьняў сонца. Яе можна было малоць, таўчы і варыць. Каб дастаць вады, Майсей, па загаду Божаму, ударыў посахам па скале, і з яе пацякла вада.

Так дзіўна прамышляў Бог аб Сваім народзе ў пустыні: даваў яму яду і пітво і памагаў у барацьбе з ворагамі — суседнімі плямёнамі, якія насялялі гэты край. ...о, праз усю падарожу адзеньне яўрэяў не ...огі ня пухлі.

vytoki.net



## Уваход яўрэяў у Зямлю Абяцаную.

Яўрэі ўвайшлі ў Зямлю Абяцаную толькі праз 40 гадоў пасьля выхаду з Эгіпту. На такое даўгое вандраваньне па пустыні яны былі засуджаны Богам за нараканьне і непаслухмянасьць волі Божай. У апошні год вандраваньня памёр Майсей. Яму не дано было Богам увайсьці ў Зямлю Абяцаную. Замест сябе ён паставіў павадыром народу Ісуса Навіна. Перад сьмерцяй Майсей даў сваё багаславеньне ўсім каленам Ізраільскім і перадаў сьвяшчэньнікам, дзеля захаваньня ў каўчэзе завету, напісаныя ім кнігі Закону.

Пры ўваходзе ў Зямлю Абяцаную яўрэям треба было перайсьці раку Іордан. Ісус Навін загадаў сьвяшчэньнікам ісьці з каўчэгам завету ўперад. І толькі яны ўступілі ў ваду, як рака расступілася і вада стала сьцяною: народ чудоўна перайшоў па аголеным ад вады, сухім дне ракі.

Аднаго разу была ў яўрэяў заўзятая біва з народамі зямлі Ханаанскай. Надыходзіў вечар, а яўрэі ня скончылі яшчэ перасьледваньня ворагоў. Тады Ісус Навін, памаліўшыся Богу, голасна выклікнуў перад народам: «Стой, сонца!» Раптам сонца спынілася і зьяла на небе, пакуль народ ня зьніштожыў сваіх ворагаў.

Гэтак пакрысе была здабыта зямля ханаанская. Ісус Навін разьдзяліў усю заваяваную зямлю (праз лёсаваньне) паміж 12-ма каленамі народу яўрэйскага. Расьсяліўшыся ў зямлі ханаанскай, яўрэі пачалі гаспадарыць, гадаваць жывёлы, займацца рамяством, гандлем і ўвайшлі ў зносіны з суседнімі народамі.

## Судзьдзі. Прарок Самуіл.

Пасьля разьдзелу зямлі Ісус Навін кіраваў народам яшчэ 25 гадоў. Памёр Ісус Навін, маючы 110 гадоў веку. Пахаваны ў сваім удзеле.

Пасьля сьмерці Ісуса Навіна яўрэі часта забывалі Бога і пачыналі пакланяцца ідалам. Тады Гасподзь аддаваў іх у рукі суседніх паганскіх народаў. Але калі яўрэі каяліся, Гасподзь пасылаў ім павадыроў, якія праганялі ворагаў і кіравалі народам да канца свайго

жыцьця. Такія павадыры называліся **судзьдзямі**. Усіх судзьдзяў было ў яўрэяў 14.

Апошнім судзьдзёю быў прарок **Самуіл**. Ён кіраваў народам 40 гадоў. Пад старасьць Самуіл перадаў уладу двом сваім сыном, але яны судзілі несправядліва і бралі хабары. Тады яўрэі сталі прасіць Самуіла, каб ён паставіў над імі цара. Самуіл памаліўся Богу, і Бог сказаў яму: „Прыдзе да цябе заўтра чалавек, якога ты і памажаш на цара свайму народу".

### Саул, першы цар яўрэйскі.

У аднаго яўрэя, катораму імя было Кіс, прапалі працоўныя асьліцы, і ён паслаў сына свайго Саула і слугу шукаць іх. Слуга парадзіў запытацца ў прарока Самуіла, дзе шукаць згінуўшае. Самуіл урачыста, з вялікаю пашанаю спаткаў Саула. На другі дзень Самуіл выйшаў з Саулам за места і тутака, калі слуга падаўся трохі ўперад, памазаў Саула на царства. Адначасна з гэтым Дух Божы зыйшоў на Саула.

Хутка пасьля тайнага памазаньня Саула, Самуіл склікаў усіх яўрэяў дзеля ўрачыстага абраньня цара. Кінулі жэрабя. Жэрабя ўпала на Саула. Большасьць прызнала яго сваім царом і паднясла яму гасьцінцы.

Заснаваньне яўрэямі царскае ўлады вельмі занепакоіла суседнія народы. Яны пачалі рабіць напады на зямлю яўрэяў. Саул сабраў сільнае войска, і рабіў удачныя паходы супроць ворагаў. Але слава Саула хутка памеркла.

Аднаўчы перад бітваю Саул зьбіраўся прынясьці ахвяру Богу. На гэтую ўрачыстасьць абяцаў прыбыць і Самуіл. Саул чакаў яго сем дзён, але Самуіл ня прыходзіў. Тады Саул сам, без сьвяшчэньніка, яшчэ да прызначанага Самуілам сроку, прынёс ахвяру Богу. Гэтым Саул нарушыў закон дзеля таго, што ён ня меў правоў сьвяшчэньніка. Калі прыйшоў Самуіл, ён зрабіў моцны закід Саулу за тое, што „ня споўніў загаду Божага", і абвясьціў, што за непаслухмянасьць патомства ... трымае ў насьледзтва яго царства.

vytoki.net



### Памазаньне Давіда на царства. Узвышэньне Давіда.

Калі Гасподзь адкінуў Саула, Самуіл, па загаду Божаму, пайшоў у горад Віфлеем і там памазаў на царства Давіда, сына некага Есея, з калена Юдавага. Дух Божы зыйшоў на Давіда, а ад Саула адступіў.

Хутка здарыўся выпадак, які зрабіў ведамым імя Давіда ўва ўсім царстве. У яўрэяў вялася вайна з філісьцімлянамі. Калі ворагі зьблізіліся адзін да аднаго, дык з лягеру філісьцімлянаў паказаўся волат Голіаф, узброены з ног да галавы. Ён выклікаў сабе супраціўніка на паядынак, кажучы: „Калі я перамагу — вы будзеце нашымі рабамі; калі пераможа ён, мы будзем вашымі рабамі". Ніхто з яўрэяў не адважыўся выйсьці супроць Голіафа.

У гэты самы час, па даручэньню свайго бацькі, прыйшоў у лягер яўрэяў Давід. Чуець — Голіаф пяруновым голасам зьдзекуецца над трусьлівасьцяй і маладушнасьцяй яўрэяў. Закіпела абурэньнем гарачае сэрца Давіда, пачуў ён у сабе нястрыманую адвагу. Узяў ён у рукі свой посах пастухоўскі, выбраў пяць гладкіх каменьчыкаў, палажыў у сваю торбачку і пайшоў на Голіафа. Гасподзь памог Давіду і трапным ударам каменя з прашчы Давід папаў Голіафу проста ў лоб, аглушыў яго, а пасьля, падскочыўшы да яго з шпаркасьцю ласіхі, яго-ж мечам адсёк яму галаву. Філісьцімляне пабеглі; яўрэі далёка гналі іх і шмат іх забілі.

Калі Саул і Давід вярталіся дамоў, жанчыны гарадоў выбягалі ім насустрэчу і пялі: „Саул перамог тысячы, Давід — дзесяткі тысячаў". Гэта надта не спадабалася Саулу. Давід прымушаны быў на нейкі час выдаліцца з зямлі яўрэйскай.

### Зацараваньне Давіда (1060 г. да Хр. Нар.). Заваяваньне Ерусаліму. Новая скінія.

Па сьмерці Саула, Давід урачыста быў памазаны на царства. Яго зацараваньне было спаткана ў народзе з вялікаю радасьцяй і надзеямі. Пры ім яўрэйскае царства дасягнула найвышэйшае ступені свае магутнасьці і славы. Граніцы царства яўрэйскага вельмі пашырылі-

ся. Гасподзь памог Давіду перамагчы многіх ворагаў і здабыць горад Ерусалім, які пасьля таго зрабіўся яго сталіцаю. Тут Давід пабудаваў новую скінію, замест старой Майсеевой скініі, і перанёс у яе каўчэг завету з вялікай урачыстасьцяй.

Абкружаны славаю, жывучы сам у пышным палацы, Давід заўсёды трывожыўся думкаю, што каўчэг завету „стаіць пад шатром“. Яму хацелася выбудаваць вялічны храм Іегаве, адпаведны велічы яго царства. Але прарок Нафан абвясьціў Давіду, што, як праліўшы шмат крыві, ён ня можа пабудаваць храм Богу спакою і згоды. Гэтая справа, па словах прарока, будзе зроблена яго сынам. Аднак Гасподзь паказаў Давіду Сваю вялікую міласьць абяцаньнем, што царства яго над Ізраільскім народам будзе зацьверджана навекі, бо з яго патомства народзіцца Вялікі і Вечны Цар, Якому „Я—кажа Гасподзь — буду Айцом, а Ён будзе Мне Сынам“.

Незадоўга да сваей сьмерці Давід урачыста памазаў на царства свайго сына Саламона.

Давідам складзены 91 псалом. Яны знаходзяцца ў кнізе „Псалтыр“. У некаторых з гэтых псалмоў зьмяшчаюцца прароцтвы аб Мэсіі, будучым Збавіцелю роду чалавечага. Ува ўсіх народаў псалмы Давідавы дасюль карыстаюцца вялікаю пашанаю.

## Цар Саламон (1020—980 г.г. да Хр. Нар.). Яго мудрасьць.

18-гадовым юнаком уступіў Саламон на пасад. Прырода надзяліла яго ясным розумам, а глыбокая адукацыя, зьдзіўляўшая сучасьнікаў, адкрыла яму ўсе тайны жыцьця. Яму трэ было кіраваць вялізарным гаспадарствам, якое цягнулася „ад ракі Эгіпэцкае да вялікае ракі Эўфрату“. Забясьпечаньне цішы і спакою сярод падуладных яму народаў — было яго галоўнаю мэтаю. Ерусалім зрабіўся асяродзьдзем, дзе адбываліся рухлівыя зносіны гандлёвыя, рэлігійныя і іншыя. У Ерусаліме былі сабраны нязьлічаныя багацьці. Ён пачаў хутка будавацца. Насельнасьць павялічвалася, задаволеная спакоем і дабрабытам.

[illegible]казаць удзячнасьць Богу за добры пачатак [illegible]ваньня, Саламон прынёс багатую ахвяру.

vytoki.net



Ахвяра была прынята Богам. Уночы зьявіўся Саламону ў сьне Бог і сказаў: „Прасі, чаго табе даць“. — „Дай мне мудрасьць, каб я здолеў кіраваць народам Тваім“,— маліўся Саламон. Бог адказаў яму: „За тое, што ты не прасіў для сябе доўгага жыцьця, багацьця, а прасіў сабе розуму, каб добра судзіць, вось даю табе сэрца мудрае і разумнае, так што падобнага табе ня было раней за цябе, дый пасьля цябе ня будзе; і тое, чаго ты не прасіў, Я даю табе — і багацьце і славу, а калі будзеш хадзіць шляхам Маім, як Давід, бацька твой, дык прадоўжу і дні твае“.

Хутка Саламону здарылася паказаць сваю мудрасьць. Да яго прыйшлі на суд дзьве жанчыны. Абедзьве яны мелі па дзіцёнку і жылі разам у аднэй хаце. У ночы адна з іх заспала сваё дзіцянё; устала і падлажыла яго другой, а яе дзіцянё, жывое, ўзяла сабе. Яна прынясла яго сюды, да Саламона. Калі, перабіваючы адна адну, расказалі яны Саламону сваю справу, дык ён выклікнуў: „Дайце меч, расьсячэце дзіцянё напалову і аддайце палову аднэй і палову другой“. — „О, цар! — выклікнула адна — аддайце ёй дзіцянё жывым і не забівайце яго“. А другая казала: „Хай ня будзе ані мне, ані табе, сячэце“! Саламон загадаў аддаць дзіцянё першай і сказаў: „Яна яму маці“. Мудрасьць Саламонава зьдзівіла ўсіх.

## Будова і асьвячэньне храму Ерусалімскага (1017—1010 г. г. да Нар. Хрыстова).

На чацьвёртым годзе свайго кіраваньня, калі быў падрыхтованы ўвесь матар'ял, Саламон пачаў будаваць храм Іегаве. Храм Саламона быў пабудованы паводле пляну скініі, але разьмерамі сваімі быў удвая большы за яе. Новы храм быў нязвычайна вялічным. Дзіўнае багацьце ўпрыгожаньняў і цэннасьць матар'ялаў рабіла яго ўзапраўднасьці „славаю і аздобаю перад усімі землямі“. На ўрачыстасьць асьвячэньня храму былі запрошаны прадстаўнікі ўсіх каленаў і старшыні ізраільскія. Галоўным мамэнтам урачыстасьці было перанясеньне Каўчэгу Завету з скініі Давідавай. Калі Каўчэг Завету быў пастаўлены на сваё месца, дык слава Гасподняя, у відзе воблака, напоўніла ўвесь храм. Саламон падняў

тады рукі да неба і прамовіў голасна малітву, у якой дзякаваў Богу за Яго вялікія міласьці і прасіў прымаць у новым храме малітвы ня толькі Ізраільцянаў, але і кожнага чужаземца, які прыдзе сюды маліцца, пачуўшы аб славе Бога Ізраільскага. У часе малітвы вобалак рабіўся ўсё яскравей і сьвятлей і, у знак асаблівае міласьці, зыйшоў з неба агонь на падрыхтованыя ахвяры, і слава Господня напоўніла ўвесь Дом.

### Разьдзяленьне яўрэйскага царства на ізраільскае і юдэйскае (980 г. да Нар. Хр.).

Сярод раскошы і шчасьця Саламон ня здолеў затрымацца ў набожнасьці. Жонкі Салямонавы нахілілі сэрца яго да іншых багоў. Ён пабудаваў для іх паганскія капішчы, сам пачаў пакланяцца ідалам і прымаць учасьце ў ахвярапрынашэньнях ім. У пакараньне за паганства, распусту і адступленьне ад Закону Божага, прарок Ахія імем Божым абвясьціў Саламону: «За тое, што ты не захаваў завету Майго і прыказаньняў Маіх, Я адбяру ў цябе царства і аддам яго рабу твайму, а сыну твайму пакіну толькі часьць дзеля Давіда і дзеля Ерусаліму».

Хутка пасьля гэтага прадказаньня пачаўся ўнутры гаспадарства неспакой і распад. Непамерныя падаткі асабліва выклікалі абурэньне народу. На чале ўсіх незадаволеных стаў Іеравам, адзін з начальнікаў пры параве гарадзкіх сьценаў у Ерусаліме. Гэта быў чалавек адважны, здольны і ўладалюбны. Яго вось і выбралі царом, па сьмерці Саламона, дзесяць каленаў ізраільскіх. Два апошнія калены — Юдава і Вэніямінава — выбралі царом Раваама, сына Саламона. Тое царства, дзе царом зрабіўся Раваам, стала называцца Юдэйскім, а дзе было 10 каленаў і дзе царом выбралі Іеравама, стала называцца Ізраільскім.

### Царства Ізраільскае і Юдэйскае. Іх разбурэньне. Палон Вавілонскі.

Іеравам і другія цары Ізраільскія былі ўсе адступнікамі ад ісьціннае веры. Яны ўцягнулі ў паганства [illegible]весь народ свой. За гэта Господзь пакара-

vytoki.net



раў царства Ізраільскае і яно зусім згінула, праіснаваўшы 250 гадоў. Цар асырыйскі зруйнаваў дашчэнту ўвесь край, і шмат жыхароў паслаў у палон. На іх месца пераселіў паганцаў з Сырыі і Мэсапатаміі. Ад імя Самарыі, галоўнага места зруйнаванага царства Ізраільскага, гэтыя пасяленцы сталі называцца **самаракамі**. Вера іх была мешанінай праўдзівае веры з паганскімі аблудамі. Юдэі пагарджалі самаранамі і стараліся нават не гаварыць з імі.

У царстве Юдэйскім усе цары паходзілі з роду Давіда і некаторыя з іх (Аса, Іосафат, Езэкія) заставаліся вернымі Богу праўдзіваму. Аднак большасьць адхілілася ў ідалапаклонства. За гэта Господзь пакараў і Юдэйскае царства. У 589 годзе да Н. Хр. вавілонскі цар Навуханоснар узяў і спаліў Ерусалім, — разам з храмам Ерусалімскім, — захапіў з храму ўсё дарагое прыладзьдзе і адправіў у палон амаль ня ўсіх жыхароў Юдэі. Так пачаўся ведамы ў гісторыі 70-гадовы **палон вавілонскі.**

### Прарокі.

Калі яўрэі сталі забывацца аб Богу і пачыналі кланяцца ідалам, Бог адкрываў ім Сваю волю цераз прарокаў. Галоўным прызначэньнем прарокаў было абвяшчаць людзям волю Божую. Самі яны спаўнялі ўсе запаведзі Божыя і хутчэй згаджаліся на мукі і сьмерць, як на тое, каб пайсьці супроць волі Божай. Яны не баяліся гаварыць праўду нават такім царом, якія маглі за гэта ўкараць іх. Яны сьмела высьведчвалі цароў, калі тыя служылі ідалам і ўціскалі народ.

Прарокі, надыхнёныя Богам, прадбачылі, што дзеля адбудовы на зямлі Царства Божага прыдзе Божы Пасланец, Збавіцель. Ён навучыць людзей, як трэба жыць, каб споўніць Волю Божую, як абавязкавы царскі закон; ды й Сам так жыць будзе; Сам прыкладам Сваім пакажа, што жыць так можна і даступна для людзей.

Асабліва вялікімі прарокамі былі Ільля, Ялісей, Ісайя і Даніла.

## Прарок Ільля.

Прарок **Ільля** жыў у пустыні і рэдка паказваўся сярод людзей. Прыходзіў ён да іх толькі дзеля таго, каб абвясьціць волю Божую. Зьнячэўку ён зьяўляўся, аб'яўляў волю Божую і неспадзявана адыходзіў.

Аднойчы, калі цар Ахаў служыў ідалам, неспадзеўку перад ім стаў Ільля і сказаў: „Гэтымі гадамі ня будзе ні расы, ні дажджу!" Вымавіўшы гэта, ён раптам зьнік. Прароцтва яго збылося: пачалася страшэнная суш; ад сонца выгаралі ўсе расьліны: настаў голад і трываў тры гады. Па трох гадох ізноў Ільля прыйшоў да Ахава, загадаў яму сабраць увесь народ і ўсенародна прынёс ахвяру Богу, на якую зыйшоў з неба агонь і спаліў яе. Ільля маліўся пры гэтым і, па малітве яго, зараз-жа паслаў Бог вялікі дождж.

Другога разу малітвамі Ільлі Госпадзь уваскрасіў памёршага сына сарэптскай удавы. Удава гэтая свайго часу, як быў голад ад сушы, ўратавала Ільлю, даўшы яму прытулак у сваім доме.

Прарока Ільлю прасьледавала жонка Ахава, паганка. Ільля змушаны быў часта хавацца ад яе. Аднак калі была патрэба абвясьціць ёй прысуд Божы за яе паганае жыцьцё, дык бяз страху стаў прарок перад ёю. Ільля сказаў Ахаву, што ён памрэ не сваёю сьмерцю і сабакі будуць лізаць кроў яго, а жонку яго зьядуць сабакі за мурамі гораду. Так і сталася: Ахаў быў забіты на вайне і сабакі лізалі кроў яго, якой была абліта баявая калясьніца, а жонку выкінулі праз вакно і сабакі пагрызьлі труп яе.

Аднаго разу прышоў Ільля да Ялісея, які пачынаў тым часам прароцтваваць. Ільля хацеў адпаведна навучыць яго, як і што рабіць, разьвітацца з ім і адыйсьці ў пустыню. Прарок ня скрываў ад Ялісея, што хутка будзе ўзяты з гэтага жыцьця. Таму Ялісей не пакідаў яго болей. І вось, калі прарок Ільля зьвярнуўся да Ялісея з апошнім разьвітальным словам, ён угледзіў нязвычайнае зьявішча: сарваўся віхар, які і панёс Ільлю, як-бы на агнёвай калясьніцы на неба. Калі ўсё сьціхла, [illegible] ішлося; засталася адна мантыя (шырокая [illegible] Ялісей падняў і забраў з сабою.

vytoki.net



## Прарок Ялісей.

Пасьля Ільлі прароцтваваў **Ялісей**. Прарок Ільля быў жыхар пустыні, люб ў адзіноту і рэдка зьяўляўся ў месьце. Прарок Ялісей любіў шумнае гарадзкое жыцьцё. Ён увесь час абыходзіў гарады ізраільскія, ўсюды навучаў аб Богу любові і адгаварваў яўрэяў ад ідалапаклонства і грэшнага жыцьця.

У той час яўрэі былі так распушчаны, што ня сталі-б слухаць Ялісея, каб ня бачылі, якія чуды тварыў Бог па яго малітвах. А многа чудаў зрабіў Бог пры Ялісеі. Неяк памёр хлапец, адзіны сын багабойнай маткі. Ялісей доўга маліўся Богу, каб зьмілаваўся Ён над няшчаснай жанчынай; і Госпадзь уваскрасіў памёршага. Многа і іншых чудаў стварыў Бог па малітвах Ялісея. І слава аб прароку, як аб чудатворцы, пайшла нават за межы зямлі яўрэйскай.

Даведаўся аб ім у Сырыйскім краі вяльможа Нэзман, хварэўшы праказай. Праказа — хвароба вельмі дакучлівая, заразная і малавылячальная. У тыя часы ня было асобных прытулкаў і бальніцаў для такіх няшчасных; іх выганялі з местаў і вёсак, баючыся заразы, і яны мучыліся і ўміралі адны, не дастаючы ні ад каго ані помачы, ані палёгкі. Цела, апанованае гэтай хваробай, пакрывалася нарывамі, струпамі, жыўцом абгнівала. Часамі хворыя ачуньвалі. У такіх выпадках сьвяшчэньнікі аглядалі хворага і дазвалялі яму вярнуцца дадому.

Вось такою хваробаю захварэў Нэзман. Даведаўшыся аб чудах, якія Бог тварыў цераз Ялісея, прыэхаў ён да яго і прасіў, каб вылячыў хваробу. Ялісей загадаў хвораму сем разоў занурыцца ў Іордане, і калі той зрабіў гэта, стаў здаровым.

## Прарок Іона.

Прарок Іона жыў пасьля сьмерці Ялісея. Бог загадаў яму йсьці ў сталіцу Асырыйскага цара, Нінэвію, насельнікі якой былі вельмі распусныя. Ён павінен быў абвясьціць там неабходнасьць пакуты, без якой места (горад) мусіла згінуць.

Дайшоў ён да мора і сеў на карабель. Але як толькі карабель адплыў ад берагу, ўзьнялася страшная бура.

Падарожнікі думалі, што гэта нехта з іх грахамі сваімі наклікаў бяду і жэрабем хацелі знайсьці вінаватага. Жэрабя паказала на Іону, які прызнаўся да грахоў сваіх і прасіў кінуць яго ў мора. Добрыя карабельшчыкі не адважыліся зразу споўніць просьбу Іоны і прабавалі высадзіць яго на бераг. Аднак зрабіць гэта было немагчыма. Тады ўкінулі Іону ў мора і бура сьціхла.

Калі Іона апынуўся ў вадзе, ён быў праглынуты вялікай рыбай, якая цераз тры дні вык'нула яго жывога на бераг. Бачачы ў чудоўным збаўленьні руку Божую, Іона пайшоў у Нінэвію.

Хадзіў ён вуліцамі гораду і абвяшчаў Бога Ісьцінага, наказваючы, што цераз сорак дзён горад будзе збураны, калі жыхары яго не пакаюцца. Прыход чужынца, які так сьмела вытыкаў распусту і няпраўды людзей, зрабіў нязвычайнае ўражаньне: ўсе паслухалі Прарока, пачалі каяцца ў грахох сваіх, пасьціцца і маліцца.

Прайшло сорак дзён. Іона чакаў спаўненьня прароцтва. Вышаў ён з места, зрабіў сабе шацёр і ўсё чакаў, што якая колечы бяда здарыцца ў горадзе. Над шатром яго вырасла дрэва; пад ім сядзеў Іона, хаваючыся ад сонца. Паглядаючы на Нінэвію, чакаў яе канца. І стаў наракаць Іона, што Бог не спаўняе Свае пагрозы. Тымчасам уночы чарвяк падтачыў карэнь расьліны і яна ссохла. Іона мучыўся ад гарачыні і гатоў быў лепш памерці, чымся так жыць. Тады сказаў яму Бог, што, калі яму шкада засохшай расьліны, дык як-жа Госпаду не пашкадаваць жыхароў Нінэвіі, якія прынясьлі пакаяньне? Іх жа так многа; адных дзяцей, што ня ўмеюць адрозьніць правай рукі ад левай, дзьвесьце тысяч! І сорамна стала Іоне; і пачаў ён каяцца перад Богам у грахох сваіх.

### Прарок Ісайя. Прарок Даніїл.

Прарок Ісайя, па натхненьню Божаму, абвяшчаў будучыню. І яго прадказаньні дакладна спаўняліся. Важнейшыя прароцтвы яго датычацца Збавіцеля. Аб Ім ён гаварыў: „Ён зранены быў за грахі нашыя і мучаны за няпраўды нашыя. Над Ім зьдзекаваліся, але Ён па...айшоў на мукі. Ён аддаў душу Сваю на

vytoki.net



сьмерць і да зладзеяў быў залічаны. Яму вызначылі гроб з разбойнікамі, але Ён пахаваны ў багатага. І ўзята з зямлі жыцьцё Яго". Так пасьля і сталася: Збавіцель узапраўды быў зранены, замучаны і асьмееня за нашыя грахі, цярпеў аднак дабравольна. Ён быў расьпяты паміж разбойнікаў і памёр на храсьце, але пахаваны не з разбойнікамі, а ў пячоры багатага Іосіфа Арымафейскага, і трэцьцяга дня ўваскрос.

Прарок Даніїл, знаходзячыся ў палоне вавілонскім, прадказаў аб Збавіцелю, што Ён прыдзе ў сьвет **цераз семдзесят седмін ці** 490 гадоў, пачынаючы годам, калі юдэям будзе дазволена ўзнавіць Ерусалім.

### Паварот юдэяў з палону.

Юдэі былі ў палоне вавілонскім 70 гадоў. Цар пэрсыдзкі Кір, зрабіўшыся кіраўнікам усіх краёў, дзе жылі палонныя юдэі, дазволіў ім вярнуцца з палону на бацькаўшчыну і адбудаваць Ерусалім і храм. Ён нават зьвярнуў судз'ны з храму Гасподняга, якія былі ўзяты Навуходаносарам. Вярнуўшыся на бацькаўшчыну, юдэі расьсяліліся там па ранейшых гарадох і валаданьнях сваіх. На другі год па павароце з палону юдэі пачалі будаваць новы храм. Ён быў меншы і бяднейшы за храм Саламонаў, але прарокі падбодрывалі будаўнічых тым, што ў гэты храм прыдзе „Жаданы ўсімі народамі" і што „слава гэтага апошняга храму будзе большая, як першага".

### Юдэі пасьля палону вавілонскага.

Па павароце з палону юдэі доўгі час былі яшчэ пад уладаю цароў пэрсыдзкіх. Яны маглі жыць паводле сваіх законаў і мець сваіх кіраўнікоў і судзьдзяў. Калі пэрсыдзкае царства было пакорана і зруйнована Аляксандрам Вялікім, царом македонскім, Юдэя падпала пад уладу гэтага цара (за 332 гады да Н. Х.). Ен шанаваў Бога юдэяў і рабіў ім усялякія палёгкі, напр., кожны сёмы год (суботні) юдэі маглі не плаціць падаткаў. Па сьмерці Аляксандра Вялікага, Юдэя перайшла пад кіраўніцтва спачатку эгіпэцкіх, пасьля сырыйскіх цароў,

якія родам былі грэкі. Між юдэямі пачынае пашырацца грэцкая мова і звычаі. Штат юдэяў адступіла ад праўдзівага богапаважаньня, і пачалося пакланеньне грэцкім паганскім багом. Падчас кіраўнiцтва эгіпэцкага цара Птолёмэя Філядэльфа (284-246 г. да Н. Хр.) сьвяшчэнныя кнігі яўрэяў былі перакладзены на грэцкую мову, як самую пашыраную ў той час. Паганцы маглі цяпер чытаць сьвяшчэнныя кнігі яўрэяў на зразумелай мове і праз гэта пазнаваць Адзінага Ісьціннага Бога.

## Мучанікі за веру і бацькаўшчыну. Элеазар і сем братоў Макавеяў.

Цар сырыйскі Антыёх Эпіфан (174-164 г. да Н. Х.), хочучы з усіх падуладных народаў утварыць адзіны народ, пачаў прымушаць юдэяў зьмяніць сваю веру, мову, звычаі, нават вопратку, ежу. Быў выданы загад, якім забаранялася адпраўляць у храме Ерусалімскім багаслужэньне і прыносіць ахвяры Богу, таксама сьвяткаваць суботу, пасху ды іншыя сьвяты. Хто адмаўляўся споўніць царскую волю, таго бязьлітасна засуджвалі на сьмерць.

Але ня ўсе яўрэі пакорна прымалі новы закон. Былі людзі і моцныя ў веры, якія лічылі за лепшае хутчэй памёрці, як „нарушыць бацькаўскія законы". Такі быў, напр., Элеазар, кніжнік, набожны дзед, які за сваю справядлівасьць карыстаўся агульным паважаньнем. Элеазару запрапанавалі зьесьці сьвінога мяса з рэшты ідальскае ахвяры. Той адмовіўся. Тады між кускамі сьвініны палажылі мяса, якое ня было забаронена законам,— каб толькі Элеазар зрабіў від, што спаўняе загад цара. Але Элеазар сказаў на гэта: „у мае годы нельга фальшывіць. Што скажуць маладыя людзі, калі 90-гадовы Элеазар адступіць ад веры? Калі я і пазбаўлюся мукаў цяпер, дык пасьля сьмерці не ўцяку ад рукі Найвышэйшага". У канцы канцоў Элеазара, разумеецца, забілі.

За Элеазарам пайшла сьледам адна ўдава, яўрэйка **Саламанія**, з сваімі сёма сынамі. Іх таксама прымушалі есьці ідалаахвярнае мяса, але яны адмовіліся. Тады, па загаду лютага Эпіфана, іх пачалі катаваць. На ва- аці, шасьцём з яе сыноў, аднаму за ад-

vytoki.net



ным, адсеклі рукі й ногі, выразалі языкі, садралі скуру з усяго цела і, нарэшце, спалілі на агні. Але, падтрымліваныя маткаю, мучанікі не адмовіліся ад свае веры. Заставаўся жывым яшче толькі адзін сын яе, наймалодшы. Антыёх Эпіфан сам пачаў пераконваць яго зрачыся свае веры, пачаў лашчыць юнака, суліў яму багацьце і добрую пасаду, але той быў няўломны. Тады цар паклікаў да сябе Саламанію і запрапанаваў ёй зрабіць уплыў на сына. Але яна, нахіліўшыся да яго, у сваёй роднай мове сказала яму: „упрашаю цябе, сыночак, ня бойся гэтага забойцы, ды будзь такім, як твае браты, і прымі сьмерць, каб Гасподзь, па ўваскрасеньні, вярнуў мне цябе разам з імі". Юнак быў замучаны, а пасьля спалілі і самую маці.

## Барацьба яўрэяў за веру і свабоду.

Збавіцелем народу ад страшных прасьледаваньняў за веру зьявіўся сьвяшчэньнік Матафія з пяцьма сваімі сынамі, з якіх асабліваю адвагаю адзначыўся Юда, празваны Макавеем. З невялікім лікам ваякаў Юда Макавей ня раз наносіў моцныя ўдары сырыйскаму войску. Але адноўчы яго абкружыла шматлікае войска сырыйскае, а ў яго было толькі 800 чалавек. Юда ня стаў уцякаць ад ворагаў, а згінуў сьмерцяй гэроя (161 г. да Нар. Хр.). Брат Юды Сымон аканчальна вызваліў Юдэю ад сырыйскага ярма. Юдэя зрабілася самастойным і незалежным гаспадарствам пад кіраўніцтвам Макавеяў (143 г. да Нар. Хр.). Сымон Макавей быў абвешчаны на ўсё жыцьцё архірэем, ваеначальнікам і кіраўнікам народу. Званьне архірэя было зацьверджана за дзяцьмі Сымонавымі навек, пакуль ня прыйдзе Вялікі Архірэй— Мэсія.

## Юдэя пад Рымскім панаваньнем. Чаканьне Мэсіі.

Перад нараджэньнем Хрыста народ юдэйскі апынуўся пад рымскаю ўладаю (ад 64 г. да Нар. Хр.). Кіраўніком Юдэі рымляне вызначылі Ірада, родам з Ідумэі. Ірад называўся царом, хаця і быў падпарадкаваны рымскай уладзе. З зацараваньнем Ірада царская ўлада перайшла да чужынца. Да гэтага часу царамі і кіраўнікамі яўрэйскага народу былі патомкі цара Давіда, які

паходзіў ад Юды, сына Якава. Згодна з прадказаньнем Якава, гэта было знакам хуткага прыходу на землю Мэсіі. І ўзапраўды, у канцы кіраваньня Ірада нарадзіўся Ісус Хрыстос.

Па сьмерці Ірада, Юдэяй кіравалі рымскія намесьнікі, якія часта зьмяняліся. Пятым з іх быў Понты Пілат. Пры ім быў расьпяты Ісус Хрыстос.

Жадучы прыходу Хрыста, яўрэі думалі, што Ён прыдзе, каб выбавіць іх з-пад улады рымлян, заснаваць магутнае царства яўрэйскае і завалодаць усім сьветам. Яны забыліся, што Хрыстос, як абвяшчалі Прарокі, павінен навучыць людзей, як жыць; прыкладам уласнага жыцьця паказаць, як заснаваць на зямлі Царства Божае; сказаць людзям, што шчасьце іх ляжыць у сьледаваньні слову Божаму, спаўненьні Яго сьвятой волі; вытлумачыць, як разумець гэтую волю. А яўрэі думалі, што Хрыстос здабудзе для іх увесь сьвет і будзе панаваць, як усе цары, толькі ніколі не памрэ, але вечна царом застанецца. З такімі вось памылковымі паглядамі на Збавіцеля свайго — Хрыста, чакалі яўрэі Яго прыходу.

### Спаўненьне абяцаньня Божага аб пасланьні ў сьвет Спасіцеля.

Абяцаньне Божае аб зьяўленьні Спасіцеля споўнілася праз 5508 гадоў ад стварэньня сьвету. Бог Айцец паслаў Адзінароднага Сына Свайго на зямлю дзеля спасеньня людзей. Сын Божы зыйшоў з неба, усяліўся ў чысьцейшую Дзеву Марыю і пры „наитіи“ Сьвятога Духа, прыняў цела і душу чалавечыя, апрача граха, і як чалавек радзіўся і пачаў жыць на зямлі, не перастаючы быць у той жа час „усюдысушчым“ ці паўсюдным Богам. Прыняўшы плоць Сын Божы як Богачалавек, называецца Ісусам Хрыстом, а Прасьвятая Дзева Марыя дастойна завецца Багародзіцаю, ці Маткаю Божаю, бо роджаны Ею Спасіцель Ісус Хрыстос — не чалавек толькі, але разам і Бог, адным словам **Богачалавек**.

Час, калі Бог прыгатаўляў людзей да прыняцьця Спасіцеля, называецца Старым Заветам, а час пасьля нараджэньня Хрыста — Новым Заветам.

---

vytoki.net

## НОВЫ ЗАВЕТ.

### Ражаство Прасьвятой Багародзіцы.

Прасьвятая Дзева Марыя радзілася ў горадзе Назарэце ў старэнькіх багабойных бацькоў Якіма і Ганны. Яны былі бязьдзетныя, і шчыра маліліся, каб Бог па-



Ражаство Прасьвятой Багародзіцы.

слаў ім дзіця. Калі-б так сталася, бацькі гатовы былі аддаць яго на службу Богу. Гасподзь пачуў іх малітвы і паслаў ім дачку Марыю. Шчыра дзякавалі Богу старыя бацькі за такую да іх міласьць.

Ражаство Прасьвятой Багародзіцы сьвяткуецца 8-21 верасьня.

## Уводзіны ў храм Прасьвятой Багародзіцы.

Калі Прасьвятой Дзеве Марыі споўнілася тры гады, бацькі Яе пастанавілі выпаўніць дадзенае Богу абяцаньне. Яны склікалі сваякоў, запрасілі таварышак дачкі свае, апранулі Яе ў лепшую адзежу і павялі ў храм, каб



Уводзіны ў храм Прасьвятой Багародзіцы.

пасьвяціць Богу. Пры ўваходзе у храм спаткаў Яе п[illegible] шасьвяшчэньнік і ўвёў проста ў **Сьвятое Сьвятых**, ку[illegible] й сам мог уваходзіць толькі адзін раз у год. Бацькі [illegible] вярнуліся дадому, а Дзева Марыя засталася жыць п[illegible]ы храме.

[illegible]ы ў храм Прасьвятой Дзевы Марыі сьвяткуюц[illegible]а [illegible]—4 сьнежня.

vytoki.net



## Дабравешчаньне Прасьвятой Багародзіцы.

Калі Прасьвятая Дзева Марыя дарасла чатырнаццацёх гадоў і Ей паводле звычаю, ня можна было больш заставацца пры храме, сьвяшчэньнікі даручылі Яе сваяку, старому Іосіфу, с царскага роду Давіда, і адправілі жыць да яго ў горад Назарэт. Іосіф быў чалавек набожнага жыцьця, небагаты і займаўся плотніцтвам. Дзева Марыя, жывучы ў яго доме, наглядала за ўбогаю гаспадаркаю Іосіфаваю, чытала Сьвятыя Кнігі і малілася Богу. Аднаго разу Яна чытала Сьвяшчэннае Пісаньне, раптам зьявіўся перад Ею Архангел Гаўрыіл і сказаў: „Ня бойся, Марыя! Ты знайшла ласку ў Бога; Ты народзіш Сына



Дабравешчаньне Прасьвятой Багародзіцы.

і дасі імя Яму Ісус. Ён будзе Вялікі і Сынам Найвышэйшага будзе звацца". Марыя зразумела, што Арханґел кажа Ёй аб народжаньні даўно чаканага яўрэямі Мэсіі, Збавіцеля людзей. Сьвятая Дзева Марыя з верою і пакораю прыняла вестку Арханґела.

Дабравешчаньне Божай Мацеры сьвяткуецца 25 сакавіка—7 красавіка.

## Ражаство Хрыстова.

У той час, калі прышла пара радзіцца Хрысту, рымскі цар загадаў перапісаць усіх падуладных яму людзей.



Ражаство Господа нашага Ісуса Хрыста.

Пасля гэтага кожны жыхар павінен быў запісацца ў тым [illegible]ль паходзілі яго бацькі. Іосіф і Марыя, якія

vytoki.net



паходзілі з роду Давідавага, пайшлі ў свой родны горад Віфлеем (недалёка Ерусаліму), дзе калісь жылі іх продкі. З прычыны перапісі, народу ў горад гэты сабралася так многа, што немагчыма было знайсьці месца на начлег. Іосіф і Марыя прыпыніліся ў пячоры, куды пастухі ў непагоду заганялі скаціну. Тут Прасьвятая Дзева Марыя і радзіла Дзіцятка, спавіла Яго і палажыла ў яські. Была ноч. Пастухі вартавалі чараду ў полі. Раптам зьявіўся ім Ангел Гасподні і слава Гасподня асьвяціла іх; яны перапужаліся. Ангел абвясьціў ім аб нараджэньні Спасіцеля. Неспадзявана з Ангелам зьявілася мноства другіх Ангелаў, якія славілі Бога і гаварылі: „Слава на вышынах Богу і на зямлі мір сярод людзей добрай волі". Калі Ангелы ўзьняліся на неба, пастухі пайшлі ў пячору і першыя з людзей пакланіліся Дзіцятку Ісусу.

Ражаство Ісуса Хрыста сьвяткуецца 25 сьнежня—7 студня.

## Пакланеньне валхвоў (магаў).

Таго часу, ў краі, дзе некалі жылі палоненыя яўрэі, вучоныя людзі званыя валхвамі або магамі, якія вывучалі рух сьвяцілаў нябесных, ўгледзілі на небе нязвычайна яркую зорку. Яны думалі, што надзвычайныя нябесныя зьявішчы паказваюць на асаблівыя здарэньні на зямлі. Ад вучоных яўрэяў яны маглі даведацца, што яўрэі чакаюць нараджэньня Вялікага Цара, Які заўладае ўсім сьветам. З кнігі-ж прарока Даніла маглі вычытаць, што чаканы Цар павінен радзіцца іменна ў той час. Таму, як толькі яны ўгледзілі гэтую зорку, дагадаліся, што яна азначае нараджэньне Цара Юдэйскага.

І пайшлі яны ў Ерусалім, каб пакланіцца новароджанаму Цару. Яны былі так пэўныя ў нараджэньні гэтага Цара, што, як прышлі ў Ерусалім, дык проста пачалі пытацца: **Дзе народжаны Цар Юдейскі?**

Аб прыходзе валхвоў пачуў Ірад і спужаўся: ў цары ён трапіў прыпадкова, таму баяўся, што народжаны запраўдны Цар Юдэйскі адбярэ ад яго царства. І заду-

маў ён забіць гэтае Дзіцятка, каб не перешкаджала яму панаваць. Каб пазбыцца Яго, трэба было даведацца, дзе ж Яно цяцер? І вось склікае Ірад вучоных жыдоў, якія зваліся кніжнікамі, і пытае іх, дзе павінен радзіцца Хрыстос? Тыя адказываюць яму, што прарок прад-



Пакланеньне валхвоў (магаў).

казваў нараджэньне Хрыста ў Віфлееме. Ірад хацеў яшчэ даведацца аб часе нараджэньня Хрыста. Дзеля ... апрасіў да сябе валхвоў і спытаўся ў іх, ... яны ўгледзілі гэтую асаблівую зорку? Адпу-

vytoki.net



скаючы валхвоў у Віфлеем, Ірад прасіў іх варсчаючыся назад зайсьці да яго і рассказаць, каб ён таксама мог пайсьці і пакланіцца Яму (ў думцы Ірада было загубіць Дзіця).

Валхвы пайшлі. Гэта быў вечар. Калі яны вышлі з Ерусаліму, дык йзноў ўгледзілі зорку, якую бачылі на бацькаўшчыне. Яе пасылаў Бог, каб паказаць, дзе ёсьць народжаны Цар, бо калі-б валхвы пачалі пытацца аб Ім ў Віфлееме, ніхто-б ім Яго ня паказаў. Тымчасам зорка зьзяла над домам, у якім жыла Дзева Марыя з Дзіцяткам і Іосіф. Бачачы яе сьвятло, валхвы ўвайшлі ў хату, пакланіліся Ісусу і далі Яму падаркі.

Дамоў валхвы хацелі вярнуцца той самай дарогай, аднак, у сьне атрымалі загад, каб не варочацца праз Ерусалім, таму іншым шляхам пайшлі ў сваю краіну.

## Стрэчаньне Гасподняе.

Паводле закону Юдэйскага, у саракавы дзень па нараджэньні, Дзева Марыя і Іосіф прынясьлі Дзіцятка Ісуса ў храм Ерусалімскі, каб пасьвяціць Богу, а на ахвяру взялі два галубяняткі. У Ерусаліме жыў тады стары чалавек, імем Сімеон, якому было прадказана ад Бога, што ён не памрэ, пакуль ня ўгледзіць Хрыста Спасіцеля. Па натхненьню Духа Сьвятога, Сімеон прышоў у храм, спаткаў тут Дзіцятка Ісуса, ўзяў Яго на свае старэчыя рукі, падзякаваў Богу і пачаў голасна перад усімі гаварыць, што Дзіцятка гэтае ёсьць Спасіцель сьвету, Гасподзь наш Ісус Хрыстос. Тое-ж паўтарала і жыўшая пры храме Ганна прарочыца.

Споўніўшы ўсё паводле закону, Іосіф і Марыя вярнуліся ў Назарэт.

Стрэчаньне Гасподняе сьвяткуецца 2—15 лютага.

## Хрышчэньне Госпада.

Калі Ісусу Хрысту споўнілася трыццаць гадоў, Ён прышоў на рэчку Іордан, дзе папереднік Яго Іоанн хрысьціў усіх прыходзячых да яго. Ісус Хрыстос таксама пажадаў хрысьціцца ў яго. Іоанн хрысьціў Госпада. Калі



Хрышчэньне Госпада.

Ісус стаў выходзіць з вады, раптам раскрылася над Ім неба, і Дух Сьвяты, ў відзе галуба, зыйшоў на Яго, а з неба пачуўся голас Бога Айца: „Гэты ёсьць Сын Мой найлюбшы, Якому спагадаю“.

vytoki.net

...ньне Гасподняе сьвяткуецца 6—19 студня.



## Першыя вучні Ісуса Хрыста.

Пасьля 40 дзённага посту ў пустыні, Ісус Хрыстос прыйшоў на бераг Іордану, дзе хрысьціў Іоанн. Убачыўшы Ісуса, Іоанн адкрыта перад усім народам засьведчыў, што Ісус Хрыстос ёсьць Мэсія, Сын Божы: „Вось Ягня Божае, што бярэ на Сябе грахі ўсяго сьвету“.

Гэтае сьведчаньне чулі вучні Іоанна. Два з іх, Андрэй і Іоанн, уверавалі ў Ісуса, і пайшлі за Ім. Гэта былі першыя вучні Хрыстовы, — вось чаму Андрэй празваўся „першазваным“. Потым Андрэй прывёў свайго брата Сімана, якога Ісус Хрыстос назваў Пятром, што значыць „камень“. Лік вучняў Ісуса Хрыста з часам павялічваўся. З іх пазьней Ісус Хрыстос выбраў 12 і назваў іх апосталамі, г. зн. пасламі, бо Ён пасылаў іх для пропаведзі Свайго вучэньня. На апосталаў Ісус Хрыстос абраў не знатных, багатых ці адукаваных людзей, а самых простых і бедных, якія адзначаліся глыбокай верай і адданасьцяй Свайму Вучыцелю. Вось імёны 12 апосталаў: Андрэй, ягоны брат Сіман, які зваўся Пятром, Якаў і Іоанн, Пілін і Баўтрамей (Нафанаіл), Мацьвей і Фама, Якаў Алфеяў і Сіман, празваны Зілот, Юда Якаўлеў і Юда Іскарыёт, які пасьля прадаў Хрыста.

## Першае чудо ў Кане Галілейскай.

Ісус Хрыстос і вучні Яго былі па запросінах на вясельлі ў Кане Галілейскай, недалёка Назарэту. Была там і Маці Яго. Падчас вясельля не хапіла віна. Даведалася аб гэтым Маці Ісусава і сказала Сыну. Слугам-жа загадала рабіць усё, што Ён скажа. А стаяла ў хаце шэсьць каменных судзін з вадою для амываньня

ног, як таго вымагаў усходні звычай. Вось Ісус і кажа слугам: „Налейце вады ў глякі“. Калі яны напоўнілі іх да верху, Ісус сказаў слугам: „Нясеце глякі да загадчыка“. Яны панясьлі. У гляках, замест вады, было добрае віно. Толькі слугі ведалі, скуль яно ўзялося. Загад-



Першае чудо ў Кане Галилейскай.

чык-жа ня ведаў, таму пачаў выгаварваць маладому, пашто ён добрае віно захаваў пад канец вясельля.

Гэта было першае чудо Ісуса Хрыста, і выявіў Ён славу Сваю, і уверавалі ў Яго вучні Яго.

vytoki.net



## Выгнаньне гандляроў з храму.

На сьвята Пасхі Ісус Хрыстос прыйшоў у Ерусалім. Тут каля храму гандляры прадавалі валы, авечкі і галубы, а за сталамі сядзелі мяняльшчыкі, якія разьменьвалі чужаземныя грошы. Навакол стаяў надзвычайны гоман, крыкі і спрэчкі купляўшых і прадаваўшых. Усё гэта абражала сьвятасьць месца. Бачачы гэта, Гасподзь зрабіў з вяровак біч і пачаў адганяць ім ад храму ўсіх людзей, такжа і оўцы ды валы, а грошы мяняльшчыкаў рассыпаў і сталы іх перавярнуў. Прадаўцом-жа галубоў сказаў: „Забярэце гэнае адгэтуль: не рабеце дому Айца Майго домам торгу“. Ніхто з натоўпу ці гандляроў не спрацівіўся Ісусу Хрысту. Толькі начальнікі храму спыталіся ў Яго: „Які дасі нам знак, чаму гэтак робіш?“ Ісус Хрыстос адказаў ім: „Зруйнуйце храм гэты, і Я ў тры дні адбудую яго“. Гэтымі словамі Ісус Хрыстос паказаў, што яны пазбавяць Яго жыцьця і зруйнуюць цела Яго, але Ён праз тры дні ўваскросьне, і тады ўсе зразумеюць, ці меў Ён права пастуліць так з тымі, хто не сьцеражэ парадку ў храме Божым.

## Сьцішэньне буры.

Аднаго разу Ісус Хрыстос сеў з Апосталамі Сваімі ў човен і загадаў ім плысьці на другі бераг Галілейскага возера. Яны паплылі, а стомлены Хрыстос заснуў на карме. Тымчасам паднялася страшная бура; хвалі білі ў човен так моцна, што сталі залівацъ яго. Хрыстос-жа спакойна спаў. Зморания Апосталы, напасьле-

дак, пабудзілі Госпада. Адны з іх у страху крычалі: „Вучыцель! няўжо Цябе мала непакоіць, што мы гінем“? Другія-ж клікалі: ,,Госпадзі! ратуй нас, гінем!“ Выслухаўшы ўсіх, Хрыстос сказаў: «**Што вы так палахлівы,**



Сьцішэньне буры.

**малаверныя?»** Потым стаў Ён на карме і магутным голасам прамовіў да расхвалёванага мора: „Змоўкні, пакінь!“ У момант вецер сьціх, і запанавала ціша. Апосталаў апанаваў страх і яны гаварылі між сабою: **Хто** **вецер і мора слухаюць Яго?**

vytoki.net



## Аб чудах Хрыстовых.

Іісус Хрыстос, па міласэрдзю Свайму да людзей няшчасных, тварыў шмат чудаў, якімі паказаў, што Ён ня просты чалавек, але разам і Бог. Чуды ня могуць быць створаны сілаю ці зручнасьцю чалавека, а толькі ўсемагутнаю сілаю Божаю. Так, напрыклад, праз адно толькі датыканьне ці нават адным словам Сваім Іісус Хрыстос аздараўляў хворых, сьляпым даваў зрок, глухім слых, нямым язык і нават уваскрашаў памёршых.

### Чудоўнае вылячэньне двох сьляпых.

Аднаго разу ішлі за Хрыстом два сьляпцы, якія— паўтараючы: «Памілуй нас, Іісусе, Сыне Давідаў!» — неадступна прасілі вярнуць ім зрок. Хочучы дазнацца аб сіле іх веры, Хрыстос доўга не зьвяртаў на іх ніякае ўвагі. Напасьледак, калі ўжо прыйшлі ў хату, дзе Ён жыў, пытаецца ў іх: ,,Ці веруеце ў тое, што Я магу гэта зрабіць?“ Яны адказалі: ,,Так, Госпадзі!“ Тады Ён дакрануўся да вачэй іх і сказаў: ,,Па веры вашай хай будзе вам“. І адкрыліся вочы іх. І пайшлі яны славіць Госпада па ўсёй зямлі той.

### Уваскрашэньне сына Наінскай удавы.

Ішоў Гасподзь аднойчы ў горад Наін. За Ім, як заўсёды, пасьпяшалі Апосталы, вучні і мноства народу. Калі падыходзілі яны да мястовай брамы, сустрэлі провады нябожчыка: праводзілі адзінага сына беднай удавы. Угледзіўшы сьлёзы мацеры, Гасподзь зьмілаваўся над ёю, спыніў провады, і, зьвярнуўшыся да памёршага, сказаў: **«Хлопча! табе кажу, ўстань!»** Памёршы падняўся, сеў і пачаў гаварыць. Усе прысутныя сталі дзякаваць Богу і гаварылі: ,,Вялікі прарок паўстаў між намі!“

### Нагорная пропаведзь.

Нагорную пропаведзь Іісус Хрыстос вымавіў з гары вучням Сваім і мноству народу, які папрыходзіў з усяе Юдэі і Ерусаліму, і прыморскіх гародоў, каб паслухаць Яго і пазбыцца хворасьцяў сваіх. Усе стараліся дакра-

нуцца да Яго, бо ад Яго выходзіла сіла і аздараўляла ўсіх. Хрыстос гаварыў аб тым, як людзі павінны жыць, каб дасягнуць шчасьця, каб стварылася на зямлі заправуднае **Царства Божае,** каб і па сьмерці атрымаць чалавеку вечнае спасеньне ў **Царстве нябесным**.

| | |
|---|---|
| Бл҃же́ни ни́щїи д҃хомъ, ꙗ҆́кѡ тѣ́хъ є҆́сть цр҃тво нб҃ное. | Шчасьлівыя ўбогія духам, бо іх ёсьць царства нябеснае. |
| Бл҃же́ни пла́чущїи, ꙗ҆́кѡ ті́и ѹ҆тѣ́шатса. | Шчасьлівыя тыя, што плачуць, бо яны ўцешацца. |
| Бл҃же́ни кро́тцыи, ꙗ҆́кѡ ті́и наслѣ́дятъ зе́млю. | Шчасьлівыя ціхія, бо яны ўнаследуюць зямлю. |
| Бл҃же́ни а҆́лчущїи и҆ жа́ждущїи пра́вды, ꙗ҆́кѡ ті́и насы́тятса. | Шчасьлівыя тыя, што шукаюць і прагнуць праўды (як галодны шукае хлеба), бо яны насыцяцца. |
| Бл҃же́ни млⷭ҇тивїи, ꙗ҆́кѡ ті́и поми́лованни бу́дутъ. | Шчасьлівыя міласьцівыя, бо яны памілаваныя будуць. |
| Бл҃же́ни чи́стїи се́рдцем, ꙗ҆́кѡ ті́и бг҃а ѹ҆́зрятъ. | Шчасьлівыя чыстыя сэрцам, бо яны Бога ўбачаць. |
| Бл҃же́ни миротво́рцы, ꙗ҆́кѡ ті́и сы́нове бж҃їи нарекутса. | Шчасьлівыя міратворцы, бо яны сынамі Божымі назавуцца. |
| Бл҃же́ни и҆згна́нни пра́вды ра́ди, ꙗ҆́кѡ тѣ́хъ є҆́сть цр҃тво нб҃ное. | Шчасьлівыя прасьледваныя за праўду, бо іх ёсьць царства нябеснае. |
| Бл҃же́ни є҆стѐ, є҆гда̀ поно́сятъ ва́мъ, и҆ и҆зженутъ и҆ рекутъ вся́къ ѕо́лъ глаго́лъ на вы̀ лжу́ще менѐ ра́ди. | Шчасьлівыя вы, калі за Мяне зьневажаюць вас, выганяюць і гавораць на вас усялякую няпраўду. |
| Ра́дуйтеса и҆ весели́теса, ꙗ҆́кѡ мзда̀ ва́ша мно́га на небесѣ́хъ. | Радуйцеся і весялецеся, ў нябёсах будзе вам вялікая заплата. |

## Аб дараваньні крыўдаў і любові да ворагаў.

vytoki.net

... Майсеевым дазвалялася мсьціцца за крыў-
...осабам, якім хто быў зьняважаны: ,,вока
... за зуб". Ісус Хрыстос наагул забараняе



мсьціцца, кажучы: ,,Не праціўся злому. Але хто ўдэрыць цябе ў правую шчаку тваю, падстаў яму і другую, і хто захоча судзіцца з табою і ўзяць у цябе сарочку, аддай яму і верхнюю вопратку". Гэтыя прыклады гавораць, што ўсялякае зло трэба перемагаць дабром. ,,Усякаму, хто просіць чаго ў цябе, дай і ад узяўшага тваё не вымагай назад. ,,**Ва усім, як хочаце, каб з вамі абыходзіліся людзі, так і вы абыходзьцеся з імі**".

## Аб міласьціне.

Міласьціну бедным трэба даваць не дзеля таго, каб людзі бачылі гэта і хвалілі таго, хто дае. Міласьціну трэба даваць скромна, не выстаўляючыся на людзях, даваць ад чыстага сэрца, з адным толькі жаданьнем падамагчы няшчаснаму. Калі даеш міласьціну, хай левая твая рука ня ведае, што робіць правая, і каб міласьціна твая была ўтоена. Айцец твой, бачачы ўтоенае, нагарадзіць цябе яўна.

**Аб сіле малітвы** Гасподзь гаварыў у такіх словах: ,,Прасеце і дадзена будзе вам, шукайце і знойдзеце, стукайце і адчыняць вам". Хрыстос вучыць быць настойлівымі ў шуканьні Царства Божага. Але пры гэтым трэба разьлічваць не на свае слабыя сілы, а на помач Божую, — таму трэба маліцца і прасіць яе ў Бога, і дадзена будзе вам. ,,Усякі, хто просіць, атрымлівае і хто шукае, знаходзіць, а таму, хто стукае, адчыняюць. Ці ёсьць між вамі такі чалавек, які, калі-б сын яго папрасіў ў яго хлеба, падаў-бы яму камень, а калі-б папрасіў рыбы, падаў-бы яму зьмяю? Бо калі вы—злыя—умееце аднак рабіць добрае дзецям вашым, дык тым хутчэй Айцец ваш Нябесны дасьць добрае тым, хто просіць у Яго".

**Аб промысьле Божым.** «Не клапацецеся— кажа Гасподзь — аб душы вашай, што вам есьці ці піці, і ў што апранууца. Паглядзеце на птушкі нябесныя: яны ня сеюць, ня жнуць, ня зьбіраюць у сьвірны, аднак-жа Айцец ваш Нябесны корміць іх. Ці вы ня лепшыя за іх? Паглядзеце і на палявыя лілеі, як яны растуць: не працуюць і не прадуць: але кажу вам, што і Саламон ва ўсёй славе сваёй не апранаўся так, як кожная з іх; калі-ж траву паля-

вую, каторая сяньня ёсьць, а заўтра будзе кінута ў печ, Бог так апранае, дык колькі-ж больш апякуецца вамі, малаверы!" **„Шукайце наперад Царства Божага і праўды яго, а гэта ўсё** (зямное) **дадасца вам"**.

**Аб неасуджэньні блізкіх.** Ня судзеце — кажа Гасподзь—каб ня былі асуджаны. Бо якім судом вы судзіце, такім будуць судзіць і вас, і якою мераю вы мерыце, такою і вам будуць мерыць. Што ты глядзіш на сучок у воку брата твайго, а бервяна ў сваім воку ня чуеш? Двудушнік! выймі раней бервяно з свайго вока і тады ўбачыш, як выняць сучок з вока брата твайго". Гэтымі словамі Хрыстос навучае, каб мы не перабіралі чужых грахоў, а сьпяшаліся раней ачысьціцца ад сваіх.

---

Вялікая па сваёй мудрасьці пропаведзь Хрыста зрабіла глыбокае ўражаньне на слухачоў і вучняў Яго. Народ зьдзівіўся вучэньню Яго, бо Ён гаварыў як Той, што мае ўладу, а не як кніжнікі і фарысэі.

Калі Гасподзь спусьціўся з гары, за Ім пайшло шмат народу.

### Прытча аб сяўбіце.

Ісус Хрыстос часта навучаў народ прыповесьцямі (прытчамі), бяручы прыклады з блізкага жыцьця. Іншы раз Ён Сам і тлумачыў іх. Прытчу аб сяўцу Ісус Хрыстос прамовіў, стоячы ў чоўне пры беразе Галілейскага возера, абкружаны вялікім натоўпам людзей.

Выйшаў сяўбіт сеяць. І калі ён сеяў, іншае зерня ўпала пры дарозе: наляцелі птушкі і паклявалі яго; іншае ўпала на камяністае месца і, ўзыйшоўшы, хутка засохла, бо ня мела вохкасьці; іншае-ж упала між цярнінаю, і вырасла цярніна і заглушыла яго; а іншае ўпала на добрую зямлю і, ўзыйшоўшы, прынясло добры плод.

Выслухаўшы прытчу, вучні прасілі Ісуса Хрыста вытлумачыць яе значаньне, і Гасподзь вытлумачыў. Сяўбіт—гэта Сам Ісус Хрыстос; зерня—абвешчанае Ім слова Божае; зямля вучні і народ, які Яго слухае. Пад дарогай, дзе зерня топчуць падарожныя і клююць птушкі,

vytoki.net



разумеюцца людзі нядбайныя і зьбянтэжаныя: слова Божае ў іх душах не пакідае ніякага сьледу. Камяністы грунт — гэта людзі, якія з радасьцю прымаюць слова Божае, але яно ня глыбока ўкараняецца ў іх сэрцы і, ў часе жыцьцёвых няўдачаў ці спакушэньня, яны лёгка адкідаюць яго. Цярніны азначаюць жыцьцёвыя клопаты і грахоўныя ўцехі, якія заглушаюць пасеянае ў душы слова Божае. Пад добрым грунтам разумеюцца людзі, якія ня толькі з вераю прыймаюць слова Божае, але і жывуць паводле яго: іх добрыя дзелы зьяўляюцца пладамі пасеянага ў іх душах слова Божага.

### Заклік да спрацованых і гаротных.

Ісус Хрыстос прыйшоў абвясьціць Эвангельле праўды ўсім людзям — багатым і бедным, адукаваным і простым, шчасьлівым і бяздольным. Аднак неаднолькава сэрцы слухачоў адкрыты для слова Божага. Людзі простыя і ўбогія, абцяжаныя горам і працаю, мо' хутчэй за мудрых і шчасьлівых нясуць, падобна да дзяцей, адкрытае сэрца і веру, каб успрыняць слова Божае. Вось да такіх-то людзей і зьвярнуў аднаго разу Свой заклік Ісус Хрыстос, кажучы: «Прыдзеце да Мяне ўсе спрацаваныя і гаротныя, і Я заспакою вас. Вазьмеце ярмо Маё на сябе і навучэцеся ад Мяне, бо Я ціхі і пакорны сэрцам, і знойдзеце спакой душам вашым, бо ярмо Маё добрае і цяжар Мой лёгкі».

Увесь цяжар запаведзяў Хрыстовых зьмяшчаецца ў гэткіх словах Яго: **„Ва ўсім, як хочаце, каб з вамі абыходзіліся людзі, так і вы абыходзьцеся з імі"**.

### Чудоўнае насычэньне І. Хрыстом пяцёх тысячаў людзей.

Аднаго разу пайшоў Ісус Хрыстос у нейкае пустыннае месца, каб там адпачыць. Але за Ім пайшло многа людзей: народ бачыў вялікія чуды, якія Ісус Хрыстос тварыў над хворымі, і жадаў паслухаць Слова Яго. Набліжаўся вечар, а там хутка і ноч. Ісус Хрыстос усё яшчэ вучыў народ, які не хацеў расхадзіцца.

Тады занепакоеныя вучні кажуць Ісусу: «Месца тут бязьлюднае, а час позьні: адпусьці народ, каб ён мог пайсьці ў блізкія вёскі пераначаваць і купіць сабе хлеба». На гэта Гасподзь адказаў вучням: «Вы дайце ім есьці». Вучні сказалі: „У нас тут толькі пяць хлебаў і дзьве рыбы, але-ж што гэта для такога мноства людзей!“ Тады Ісус Хрыстос загадаў вучням рассадзіць народ на траве радамі па 50 і 100 чалавек і падрахаваць усіх. І зрабілі так, і рассадзілі ўсіх. Аказалася блізка пяцёх тысячаў людзей, не лічучы жанчын і дзяцей. Калі ўсе селі, Гасподзь узяў пяць хлебаў і дзьве рыбы, і паўзіраўшыся ў неба, багаславіў іх, паламаў і даў вучням, каб раздалі народу. І елі ўсе людзі і насыціліся, і яшчэ вучні сабралі недаедкаў 12 поўных кашоў (карабоў).

Людзі, захопленыя чудам, якое стварыў Ісус Хрыстос, гаварылі: „Гэта ўзапраўды Той Прарок, Які павінен прыйсьці ў сьвет“. Даведаўшыся, што яны хочуць прыйсьці, неўспадзеўкі ўзяць Яго і абвясьціць царом, Ісус Хрыстос адаслаў ад Сябе Апосталаў і адыйшоўся на гару адзін, каб памаліцца.

### Прэабражэньне Ісуса Хрыста на гары Фавор.

Вучні Хрыстовы не маглі дапусьціць і думкі, што іх Вучыцель можа няслаўна памерці на храсту. Яны яшчэ не разумелі тайны збаўленьня роду чалавечага праз Сына Божага, пасланага на зямлю. Яшчэ не выяўлена была прад імі Боская вялікасьць Ісуса Хрыста. Таму патрэбны быў асаблівы знак, каб паглыбіць і ўзмацаваць іх веру. Такі знак і быў дадзены Апосталам незадоўга перад хрэсным мукамі Госпада.

Ісус Хрыстос узяў з Сабою трох найбліжшых вучняў Сваіх — Пятра, Якава і Іоанна, пайшоў з імі на гару Фавор і там пачаў маліцца. Калі Ісус Хрыстос [illegible]і Яго зморамыя заснулі. Прачнуўшыся,

vytoki.net



яны ўгледзілі, што аблічча (твар) Ісуса Хрыста зьзяла, як сонца, а вопратка Яго стала белая, як сьнег. Тутака, ў славе нябеснай, зьявіліся Яму пракокі Майсей і Ільля, і гутарылі з Ім аб апошніх днёх Яго жыцьця. Раптам ясная хмарка абняла ўсіх, і пачуўся голас Бо-



Прэображэньне Гасподняе.

га Айца: „Гэты ёсьць Сын Мой найлюбшы; Яго слухайце“. Вучні спалохаліся і ўпалі на зямлю, а як усталі і азірнуліся, нікога ўжо ня бачылі, апрача Ісуса, ў звычайным Яго выглядзе.

Прэабражэньне Гасподняе (Спас) сьвяткуецца 6—19 жніўня.

### Прытча аб міласэрным самараніне.

Юдэйскі законьнік, спакушаючы І. Хрыста, спытаўся: «Хто мой бліжні?» У адказ на гэтае пытаньне І. Хрыстос сказаў такую прыповесьць.

Нейкі чалавек ішоў з Ерусаліму ў Ерыхон і папаўся разбойнікам, каторыя зьнялі з яго вопратку, ранілі яго і пайшлі, пакінуўшы на дарозе ледзь жывым. Але вось— здарылася—ішоў тою самаю дарогаю адзін сьвяшчэньнік. Ён бачыў няшчаснага, аднак прайшоў міма. Таксама і лявіт, бышы на тым месцы: падыйшоў, паглядзеў і прайшоў міма. Самаранін-жа нейкі, ідучы, ўгледзіў яго і зьлітаваўся: перавязаў яму раны, памазаў алеем і віном, пасадзіў яго на свайго асла і прывёз у заезд, і паклапаціўся аб ім. А на другі дзень, ад'яжджаючы, выняў два дынары, даў гаспадару заезду і сказаў яму: «Даглядай яго і, калі выдасі што болей, я, вярнуўшыся, аддам табе».

Пасля гэтага І. Хрыстос спытаўся ў законьніка: «Як ты думаеш; хто з гэтых трох быў бліжні таму, хто папаўся разбойнікам?» — Ён сказаў: «Той, што зьлітаваўся над ім». Тады І. Хрыстос сказаў яму: «Ідзі і ты рабі гэтак».

### Прытча аб блудным сыне.

Што Бог з радасьцю і любоўю прыймае пакаяньне грэшнікаў, гэта І. Хрыстос паказаў у прыповесьці аб блудным сыне.

У аднаго чалавека былі два сыны. І сказаў малодшы з іх айцу: «Дай належную мне часьць маемасьці, і я пайду ад цябе». Ён пайшоў у далёкую краіну, і там хутка прагуляў дабро сваё. З голаду наняўся ў пастухі, і рады быў-бы наесьціся ражкоў, што елі сьвіньні, але ніхто не даваў яму. Апамятаўшыся, ён сказаў сабе: «Колькі наймітаў у айца майго маюць лішку хлеба, а я паміраю з голаду. Устану, вярнуся до айца майго і скажу яму: «Айцец! я саграшыў перад небам і табою, і ужо няварты называцца сынам тваім: прыймі мяне, як аднаго з наймітаў тваіх». Так і зрабіў. Айцец здалёк убачыў сына свайго блуднага, і пабегшы насустрэчу, кінуўся яму на шыю і пачаў цалаваць яго. З радасьці айцец загадаў слугам закалоць кормнае цялё: „будзем есьці — кажа — і весяліцца“. І пачалі весяліцца. Калі даведаўся аб гэтым старшы сын, дык вельмі ўзлаваўся на бацьку і не хацеў увайсьці ў хату. „Я стольві гадоў служу табе — кажа, — а ты ніколі ня даў мне нават казьляняці, каб павесяліцца мне з прыяцелямі маімі“. Ён-жа сказаў яму: „Сын мой! ты заўсёды са мною і ўсё маё — тваё, а з брата твайго трэба было цешыцца і весяліцца, бо ён быў памёршы і ажыў, прападаў і знайшоўся“.



Пад айцом тут трэба разумець Бога, а пад малодшым сынам — грэшніка, які пакаяўся. «Так на небе больш радасьці будзе аб адным грэшніку, які пакаяўся», сказаў Гасподзь, «чымся аб дзевяцьдзесяцёх дзевяцёх праведніках, якія ня маюць патрэбы каяцца».

### Прытча аб багатым і ўбогім.

Жыў адзін багаты чалавек. Ён раскошна апранаўся і штодня банкетаваў. Другі-ж, на імя Лазар, быў убогі, увесь у струпох, ляжаў ля варот багатыра, і рад быў насыціцца хоць-бы крышкамі, што падалі з багатыровага стала; сабакі, прыходзячы, лізалі струпы яго. Памёр убогі і быў аднесены ангеламі на лона Аўраамава. Памёр і багаты. Будучы ў муках, падняў з пекла вочы свае, убачыў здалёк Аўраама і Лазара на лоне яго і загаласіўшы, сказаў: „Отча Аўрааме! зьлітуйся нада мною і пашлі Лазара, каб хаця абмачыў канец пальца свайго ў вадзе і асьвяжыў язык мой, бо я мучуся ў полымі гэтым“. Але Аўраам сказаў: «Прыпомні, што ў жыцьці тваім меў ты адно добрае, а Лазар благое: цяпер-жа ён тут пацяшаецца, а ты церпіш вялікія мукі,—да таго-ж між намі прорва вялікая, так што адгэтуль да вас або адтуль да нас перайсьці ня можна». Тады багаты сказаў: «Дык прашу цябе, отча, пашлі Лазара ў дом айца майго, хай засьведчыць братом маім, як я тут пакутую, каб яны ня прыйшлі ў гэтае месца мучэньня». Аўраам адказаў: „У іх ёсть Майсей і прарокі, няхай слухаюць іх“. Ён-жа сказаў: «Не, отча Аўрааме! Калі хто з памёршых прыйдзе да іх, дык пакаюцца». Тады Аўраам

vytoki.net

адказаў: «Калі Майсея і прарокаў ня слухаюць, дык хоць-бы хто з мёртвых уваскрос, не паверáць».

### Прытча аб мытару і фарысэі.

Фарысэй і мытар увайшлі ў царкву памаліцца. Фарысэй, стоячы наперадзе, каб усе яго бачылі, маліўся гэтак: „Божа! дзякую Табе, што я не такі, як іншыя людзі: зьдзірцы, крыўдзіцелі, чужаложцы, або як гэты мытар“. А мытар, стаўшы здалёк, не адважваўся нават падняць вачэй на неба, але б'ючы сябе ў грудзі, гаварыў: „Божа! будзь міласьцівы да мяне грэшнага“.

Бог прыймае толькі малітву шчырую, якая йдзе ад сэрца. Вось чаму Хрыстос і кажа: „Мытар пайшоў апраўданым хутчэй, чымся той, бо ўсякі, хто сябе вывышшае, будзе паніжаны, а паніжаючы сябе ўзвысіцца“. Мы не павінны, як той фарысэй выхваляцца сваімі добрымі паступкамі, сваёю праведнасьцю і пагарджаць іншымі людзьмі. Фарысэі ўсё рабілі напаказ,—лічылі, што яны лепшыя і сьвяцейшыя за ўсіх людзей. Наадварот, мытары лічыліся ў грамадзянстве вялікімі грэшнікамі (падчас зьбіраньня падаткаў часта крыўдзілі народ), тым часам вось гэты, эвангельскі, аказваецца ў вачох Божых больш апраўданым, чымся фарысэй.

### Багаславеньне дзяцей.

Аднаго разу, калі Ісус Хрыстос вучыў народ, да Яго праціскаліся праз натоўп жанчыны з дзяцьмі, каб Ён дакрануўся да іх і ўсклаў на іх рукі. Вучні Яго, бачачы гэта, забаранялі ім, каб дзеці ня трывожылі Госпада. Але Ісус Хрыстос абурыўся на вучняў і, паклікаўшы дзяцей, сказаў: „Пусьцеце дзяцей прыходзіць да Мяне, і не забараняйце ім, бо гэткіх ёсьць Царства Божае. Запраўды кажу вам: хто ня прыйме Царства Божага, як дзіця, той нё ўвайдзе ў яго“. І абняўшы іх, усклаў на іх рукі і багаславіў іх.

За што дзеці заслужылі ласку Госпада і абяцаньне Царства Божага? Толькі за свае чыстыя, беззаганыя сэрцы. І ўсякі, хто шукае Царства Божага, павінен [illegible] на да дзяцей, чыстае, незласьлівае сэрца.

vytoki.net



### Уваскрашэньне Лазара.

Набліжаўся час, калі Хрысту Спасіцелю трэба было адпакутаваць, памёрці і ўваскроснуць. Дзеля гэтага пашоў Ён у Ерусалім.

Недалёка ад Ерусаліму была вёска Віфанія, дзе жылі Лазар і сёстры яго Марфа і Марыя. Хрыстос любіў гэтую багабойную сям'ю і часта яе адведваў.

Кіруючыся ў Ерусалім, Ісус Хрыстос павінен быў праходзіць цераз гэтую вёску. Далёка яшчэ быў Ён ад яе, як моцна захварэў Лазар. Сёстры яго, даведаўшыся, што Госпадзь ідзе ў Ерусалім, паслалі сказаць Яму аб хваробе Лазара. Яны спадзяваліся, што Хрыстос пасьпяшыць вылечыць іх брата. Пачуўшы, аднак, ад пасланцоў, што Лазар хворы, Госпадзь ня толькі не пасьпяшыў да яго, але сумысьля застаўся два дні ў тым месцы, дзе знаходзіўся. Цераз два дні Госпадзь сказаў Апосталам: „Лазар памёр; пойдзем да яго!“

Калі Госпадзь з Апосталамі, проваджаны вялікім натоўпам людзей, зьбліжыўся да Віфаніі, насустрэчу вышла Марфа і з сумам сказала: „Каб Ты быў тут, ня памёр бы Лазар“. — **„Уваскросьне брат твой!“** — сказаў ёй на гэта Хрыстос.

Хутка прыбегла Марыя, і з плачам кінулася да ног Ісуса. Заплакаў і Ён, але, хутка запанаваўшы над сабою, спытаўся ў сёстраў: **дзе вы палажылі яго?** Яны сказалі дзе, і дадалі: „Пайдзі й паглядзі“. Хрыстос пашоў з сёстрамі Лазара да пячоры, ў якой быў пахаваны Лазар. Народ ішоў сьледам за Хрыстом, вычуваючы нейкае нязвычайнае здарэньне. Падашлі да магілы. Госпадзь загадаў зьняць камень, прывалены да ўваходу ў пячору. Марфа хацела ўстрымаць Яго, кажучы, што чатыры дні ляжыць Лазар і нядобры дух ідзе ўжо ад яго. Аднак Госпадзь сказаў ёй: «Я казаў табе, калі будзеш верыць, дык угледзіш славу Божу».

Тады адвалілі камень. Падышоўшы бліжэй да пячоры Хрыстос крыкнуў моцным голасам: «Лазар! выйдзі вон!» І на вачох многалікага натоўпу сталася вялікае чудо: з гробу устаў нябожчык. Спавіты пялёнамі, ня могучы далей ісьці ў такім відзе, Лазар стаяў на парозе



Уваскрашэньне Лазара.

магілы перад анямелым народам. **Разьвяжэце яго**, сказаў Гасподзь, **хай ідзе!**

Чуда гэтае зрабіла на прысутных вялікае ўражаньне. У Хрыста паверылі нават многія Яго ворагі.

Уваскрашэньне Лазара сьвяткуецца напярэдадні Уваходу ... Ерусалім, альбо Вербнай нядзелі (Вербніцы).

vytoki.net



## Урачысты уваход Ісуса Хрыста ў Ерусалім.

За некалькі дзён да Сваіх мукаў, Гасподзь наш Ісус Хрыстос сеў на маладога асла і паехаў у горад Ерусалім; з Ім былі Яго вучні і мноства народу. У той час набліжалася сьвята Пасхі і ў Ерусалім сабралося



Уваход Гасподні ў Ерусалім.

многа людзей. Пачуўшы, што Ісус ідзе ў Ерусалім, усе вышлі на спатканьне Яму; адны з іх здымалі з сябе вопратку і слалі на дарозе; другія рэзалі галінкі з дрэваў і так сама ўсьцілалі дарогу. І ўвесь народ пачаў крычаць: „Осанна (спасеньне) Сыну Давідаваму! Бага-

слаўлёны што йдзе ў імя Господа! Осанна ў вышніх!“ За прыкладам бацькоў, і дзеці сьпявалі славу Господу Ісусу.

Уваход Гасподні ў Ерусалім сьвяткуецца за тыдзень да Пасхі (Вялікадня). Сьвята гэтае ў нас звычайна завецца **Вербнай нядзеляй** (Вербніцай), дзеля таго што ў гэты дзень, за прыкладам старадаўных яўрэяў, спатыкаўшых з пальмовымі галінкамі Хрыста, мы прыходзім у храм з вярбою. Называецца яшчэ гэтае сьвята нядзеляю **Вайй**, што значыць **пальмовая галінка**.

## Запаведзі аб любові да Бога і да бліжняга.

Адзін юдэйскі законьнік *) спытаўся ў Ісуса Хрыста: „Вучыцель! якая самая галоўная запаведзь у законе?“ — Ісус Хрыстос адказаў яму: „Палюбі Господа Бога твайго ўсім сэрцам тваім і ўсёю душою тваёю, і ўсім разуменьнем тваім. Гэта ёсьць першая і найбольшая запаведзь. Другая-ж падобная да яе: палюбі бліжняго свайго, як самога сябе. На гэтых дзьвёх запаведзях грунтуецца ўвесь „закон і прарокі“, г. зн. іх навука.

## Ахвяра беднае ўдавы.

Выходзячы з храму, Господзь затрымаўся на мінуту каля скарбонкі, у якую багамольцы апускалі свае ахвяры на храм, і стаў прыглядацца. Давалі кожны ад дастатку свайго: багацеі самаздаволена клалі ў скарбонку золата і серабро, а адна бедная ўдава палажыла толькі дзьве лепты (дробныя мядзяныя манэты, па-нашаму — 2 грошы). Тады, паклікаўшы да Сябе Апосталаў, Хрыстос сказаў ім: „Запраўды кажу вам: гэтая бедная ўдава палажыла больш за ўсіх, бо ўсе тыя клалі ахвяру Богу ад лішкаў сваіх, яна ж з беднасьці свае палажыла ўвесь пражытак свой, які мела“.

Гэтымі словамі Ісус Хрыстос навучае, што ў вачох Божых цана кожнае ахвяры залежыць ад шчырасьці, з якою хто дае яе.

---

*) ...нікам ён называецца дзеля таго, што вывучаў Закон Божы ...нае яго лепей за ўсіх.

vytoki.net



## Вобраз страшнага суду Божага.

Аб апошнім судзе вялікім Сваім Ісус Хрыстос вучыў так: „Калі прыйдзе Сын Чалавечы ў славе Сваёй і ўсе сьвятыя ангелы з Ім, тады сядзе на пасадзе славы Свае, і зьбяруцца перад Ім усе народы: і аддзеліць адных ад другіх, як пастух аддзяляе оўцы ад казлоў: і паставіць оўцы (праведных) на правы ад Сябе бок, а казлы (грэшнікаў) на левы“. І скажа Цар тым, якія на правы бок ад Яго: «Прыдзеце, багаслаўлёныя Айца Майго, насьледуйце Царства, прыгатованае вам ад стварэньня сьвету, бо Я хацеў есьці, і вы далі мне (есьці); Я хацеў піць, і вы напаілі Мяне; Я быў у дарозе і вы прынялі Мяне; быў нагі і вы апранулі Мяне; быў хворы і вы наведаліся да Мяне; у вастрозе быў, і вы прыйшлі да Мяне». Тады праведнікі скажуць Яму ў адказ: „Госпадзі! калі мы бачылі Цябе галодным і накармілі, ці прагнучым і напаілі? Калі мы бачылі Цябе ў дарозе і прынялі? або нагім і апранулі? Калі мы бачылі Цябе хворым або ў вастрозе, і прыйшлі да Цябе?“ І адкажа ім Цар: „Узапраўды кажу вам: тое што зрабілі вы аднаму з братоў Маіх меншых, вы зрабілі Мне“. Пасьля гэтага скажа тым, што на левы бок ад Яго: „Ідзеце ад Мяне, праклятыя, у вагонь вечны, прыгатованы д'яблу і слугам яго, бо Я быў галодны і вы не далі мне есьці; хацеў піць і не напаілі Мяне; быў у дарозе, і не прынялі Мяне; быў нагі і не апранулі Мяне; хварэў і ў вастрозе, — і не наведаліся да Мяне“. Тады яны скажуць Яму: „Госпадзі! калі мы бачылі Цябе галодным, або прагнучым, або падарожным, або голым, або хворым ці ў вастрозе — і не паслужылі Табе?“ Тады адкажа ім: „Узапраўды кажу вам: як не зрабілі гэтага аднаму з братоў Маіх меншых, дык не зрабілі Мне“. І пайдуць гэтыя на муку вечную, а праведнікі ў жыцьцё вечнае.

Кончыў Сваё навучаньне Хрыстос сумным, але ўжо ня раз гавораным прадказаньнем, што раней за ўсё будуць Ягоныя мукі і сьмерць. Господзь цяпер ясна паказаў нават самы спосаб яе і дзень: „Вы ведаеце, сказаў Хрыстос, што праз два дні будзе Пасха, і Сын Чалавечы будзе выданы на расьпяцьце“.

## Пастанова Сынэдрыёну аб тым, каб забіць Ісуса Хрыста. Здрада Юды.

Між юдэямі было шмат такіх, якія ня верылі ў Ісуса Хрыста і ня любілі Яго за тое, што Ён выяўляў іх праступныя дзеяньні. Асабліва ня любілі Яго юдэйскія першасьвяшчэньнікі і кніжнікі. Пасьля ўваскрашэньня Лазара, калі шмат людзей пайшло за Хрыстом, яны — баючыся зусім страціць свае ўплывы ў народзе— пастанавілі забіць Яго. Чакалі толькі адпаведнае хвіліны. Наступная акалічнасьць прысьпяшыла ім выкананьне іхняе страшнае змовы.

На чацьверты дзень пасьля ўхаходу Госпада ў Ерусалім прыйшоў у сынэдрыён адзін з 12 апосталаў — Юда Іскарыёт, і кажа: „Што вы мне дасьцё, і я выдам вам Яго?" Начальнікі юдэйскія былі вельмі задаволены і запранавалі Юдзе 30 сярэбранікаў (трохі больш за 100 злот.). Гэта была цана, якая звычайна выдавалася за раба, забітага выпадкова. Юда згадзіўся, узяў грошы і стаў чакаць выпадку, каб выдаць ім Ісуса, але ўтайку ад народу.

## Тайная вячэра.

За два дні да Пасхі, ў чацьвер вечарам, Ісус Хрыстос з дванаццацьма вучнямі прыйшоў у Ерусалім у прыгатаваную Яму сьвятліцу і сеў з імі за стол, каб есьці Пасху. На пачатку гэтай сьвяточнай вячэры Хрыстос умыў ногі вучням Сваім і абцёр рушнікам, паказваючы ім гэтым прыклад пакоры. У часе гутаркі з вучнямі Гасподзь сказаў: „Праўду кажу вам, адзін з вас прадасьць Мяне". Гэта Ён казаў аб Юдзе, які напярэдадні, ў сераду, абяцаў першасьвяшчэньнікам юдэйскім прадаць Яго за трыццаць сярэбранікаў. Юда не адмовіўся ад свае злое думкі. Ледзь скончылася вячэра, ён пасьпешна вышаў з сьвятліцы, каб споўніць сваю агідную справу.

На вячэры Гасподзь узяў у Свае сьвятыя рукі хлеб, багаславіў яго, разламаў і, даючы вучням, сказаў: „Вазь- ... гэта ёсьць Цела Маё, што за вас даецца, ...аньня грахоў". Потым узяў чашу з вінам,

vytoki.net



і падаючы вучням, сказаў: „Пеце ад яе ўсе, гэта ёсьць Кроў Мая новага завету, што за вас і за многіх праліваецца, дзеля дараваньня грахоў". Вучні прычасьціліся Цела і Крыві Хрыстовае пад відам хлеба і віна. Прычасьціўшы-ж іх Хрыстос сказаў: „Рабеце гэта на ўспамін аба Мне". Паводле загаду Збавіцеля, і адпраў-



Тайная вячэра.

ляецца ў нас, у часе літургіі, Таінства Прычашчэньня, калі веруючыя пад відам хлеба і віна прычашчаюцца праўдзівага Цела і праўдзівай Крыві Хрыстовай.

—

У сьвятліцы Сыонскай Хрыстом і Апосталамі апошні раз была адсьвяткавана Пасха Старога Завету і першы

раз Пасха Новага Завету. Калі там ягня першароднае заколвалася ў памяць збаўленьня з палону Эгіпэцкага і выхаду ў зямлю абяцаную, дык тут Сам Хрыстос, як Ягня чыстае і беззаганнае, прыняўшы сьмерць, прынёс Сябе ў ахвяру Богу за грахі людзей, каб вызваліць іх ад рабства духоўнага і адчыніць уваход у Зямлю Абяцаную — Царства Нябеснае.

Тайная вячэра ўспамінаецца ў Вялікі Чацьвер.

### Маленьне аб чашы ў садзе Гэфсіманскім.

Калі пасьля тайнае вячэры настала ноч, Іісус Хрыстос пайшоў у сад Гэфсіманскі разам з вучнямі Сваімі, апрача Юды Іскарыёта, які, не дачакаўшыся канца вячэры, сьпяшаўся паведаміць ворагаў Яго Калі ўвайшлі ў сад, Іісус Хрыстос сказаў Апосталам: „Пасядзеце тут, пакуль Я пайду і памалюся“. І ўзяўшы Пятра, Якава і Іоанна, пайшоў з імі ў глыбіню саду, кажучы: „Душа Мая нудзіцца да сьмерці, пабудзьце тут са Мною і ня сьпеце“. Пасьля адыйшоў ад іх на далечыню, як кінуць каменем, і ўпаўшы на калені, пачаў ў вялікай нудзе маліцца, каб падтрымаць Свой Дух, агорнуты жахам перад недалёкімі ўжо мукамі і сьмерцю: „Отча! калі Твая воля, пранясі чашу гэтую міма Мяне, але хай будзе не чаго Я хачу, а чаго Ты“. Зьявіўся-жа Яму Ангел з неба, падтрымліваючы Яго. І ў барацьбе нечалавечай, сьмяротнай, гарачэй і гарачэй маліўся, і быў пот Яго, як каплі крыві, падаючы на зямлю.

Пасьля Сваей малітвы Іісус Хрыстос, падыйшоўшы да вучняў, якіх застаў спаўшымі, сказаў ім, што настаў час і сюды йдзе ўжо той, які прадае Яго.

### Узяцьце Іісуса Хрыста.

Юда ведаў, дзе быў Хрыстос з вучнямі. Узяўшы ад архірэяў і начальнікаў жыдоўскіх ваякаў і слугаў з сьветачамі і аружжам, Юда прыходзіць у Гэфсіманію. Убачыўшы Госпада, Юда кажа ім: „Каго я пацалую, Той і ёсьць“. Падыйшоўшы да Хрыста, Юда ўзапраўды пацалаваў Яго, вітаючы звычайным прывітаньнем: „Радуйся, Раввi“. Пасьля таго ваякі ўзялі Хрыста, зьвязалі ... т апосталы ўсе пакінулі Свайго Вучыцеля ... хто куды. Толькі двох з іх—Пётр і Іоанн— ...лі за Хрыстом.

vytoki.net



### Іісус Хрыстос на судзе ў першасьвяшчэньнікаў.

Ня гледзячы на раніцу, у палацы першасьвяшчэньніка Каіфы сабраліся кніжнікі і старэйшыны юдэйскія для суда над Хрыстом. Прыйшло шмат крывасьведкаў, але яны не маглі сказаць нічога, за што можна было-б засудзіць Яго. Тады Каіафа спытаўся ў Яго Самога: „Ці Ты Хрыстос, Сын Божы?“ Іісус Хрыстос адказаў яму: „Так, Я“. Каіафа пры гэтых словах, у прыкідным гневе, разадраў вопратку сваю і выклікнуў: „Ён зьневажае Бога. Якое яшчэ патрэбна нам сьведчаньне? бо-ж мы самі чулі хулу Яго, з вуснаў Яго. Як вам здаецца— што рабіць з Ім?“ Усе адказалі: „Ён варты сьмерці“.

Пасьля гэтага Іісуса вывялі на панадворак. Тут вартаваўшыя Яго пачалі зьдзекавацца над Ім. Яму плявалі ў твар, білі па вушох і шчоках; іншыя-ж затуліўшы рукамі сваімі твар Яго і б'ючы, пыталіся насьмяхаючыся: „Прароч, хто Цябе ўдэрыў?“ І шмат чаго іншага агіднага казалі на Яго. Гасподзь ціха, пакорна, моўчкі перанасіў усё гэта, хоць, як Сам казаў, мог бы ўпрасіць Айца, і Айцец паслаў-бы легіёны Ангелаў, каб абараніць Яго. Але тады не адбылося-б адкупленьне роду чалавечага.

Калі Юда-здраднік даведаўся, што праданы ім Хрыстос засуджаны на сьмерць, ён, адчуўшы сваё вялікае праступства, поўны жаху, пайшоў да першасьвяшчэньнікаў і старэйшынаў, кінуў ім атрыманыя 30 сярэбранікаў і сказаў: „Саграшыў я, прадаўшы Кроў непавінную“. На гэта яны адказалі: „А нам што да таго? глядзі сам“. Вялікі жах і роспач напоўніла душу Юды. Ён сьпяшыць выйсьці з храму, каб хутчэй знайсьці канец. Бліжэйшае дрэва, на якім павісла цела Юды, прынясло яму вызваленьне ад душыўшых яго мукаў.

### Суд над Іісусом Хрыстом у Понтыя Пілата. Суд Ірада.

Прысуд сынэдрыёну вымагаў яшчэ зацьверджаньня з боку начальніка Юдэі — рымскага пракуратара, якім на той час быў Понты Пілат. Іісуса Хрыста і павялі да яго. Бачачы зьвязанага чалавека, Пілат спытаўся: „У чым вінаваціце вы гэтага чалавека?“ Яны сказалі:

„Калі-б Ён ня быў злодзей, мы не прывялі-б Яго да Цябе. Ён называе Сябе царом і забараняе плаціць падаткі рымскаму кесару". Пілат спытаўся Яго: „Ты Цар Юдэйскі?" Ісус адказаў, што Ён узапраўды Цар, але „Царства Маё — кажа — не ад гэтага сьвету", і што дзеля таго Ён і нарадзіўся і на тое прыйшоў у сьвет, каб „вучыць усіх праўды і ісьціны". Пілат сказаў ворагам Ісусавым, што ён не знаходзіць у Ім ніякае віны. Даведаўшыся-ж, што Хрыстос з Галілеі, Пілат, хочучы ўхіліцца ад гэтае прыкрае справы, загадаў адвесьці Яго на суд да Ірада, начальніка Галілеі, які ў тыя дні быў у Ерусаліме. Пайшоў да Ірада і ўвесь сынэдрыён.

Ірад таксама не знайшоў ніякае віны і адаслаў Яго назад да Пілата. Пілат сказаў: „Вось і Ірад, да якога я пасылаў гэтага чалавека, не знаходзіць у Ім ніякае віны. Таму я думаю, пакараўшы Яго, звольніць Яго зусім". Пілат лічыў Ісуса невінаватым і хацеў уратаваць Яго ад сьмерці.

У жыдоў быў звычай, што з прычыны сьвята начальнік Юдэі звальняў, па выбару народу, каго-колечы з засуджаных на сьмерць. Ось Пілат і пытаецца далей: „Каго хочаце адпусьціць вам — Вараўву (гэта быў злодзей, бунтаўшчык супроць рымскае ўлады) ці Ісуса?" Але першасьвяшчэньнікі і старэйшыны ўжо пасьпелі пераманіць народ на свой бок, і таму на пытаньне Пілата народ закрычаў: „Не Яго, а Вараўву!" — Што-ж благога ўчыніў Ён?" спытаўся Пілат. Але яны яшчэ мацней закрычалі: «Распні, распні Яго!» Бачачы, што народ больш і больш абураецца і трэбуе сьмерці Хрыста, Пілат узяў вады, умыў перад народам свае рукі і сказаў: «Невінаваты я ў крыві гэтага Праведніка. Глядзеце: ня я, а вы будзеце вінаватыя». Тады ўвесь народ закрычаў: «Кроў Яго на нас і на дзецях нашых!». Пасьля гэтага Пілат выдаў загад звольніць з вастрогу Вараўву, Ісуса-ж, «біўшы», аддаў на волю Яго ворагаў.

Ваякі Пілатавы вывялі Ісуса на панадворак і тут пачалі зьдзекавацца над Ім. Яны налажылі Яму на галаву вянок з цярніны, апранулі Яго ў чырвоны плашч, пасьля далі ў правую руку тросьць і, падаючы перад Ім на калені, плявалі ў твар і зьдзекаваліся, кажучы: «Радуйся, Цар Юдэйскі!» А потым вырывалі з Ягоных

vytoki.net



рук тросьць і білі ёю па галаве. Ісус Хрыстос з вялікаю пакораю і моўчкі цярпеў гэтыя нечалавечыя мукі, малючыся за Сваіх катаў. Пасьля гэтага ваякі-каты ўзялі Хрыста, скінулі з Яго чырвоную акрываўленую вопратку, апранулі ў Яго ўласнае адзеньне і, з цярновым вянком на галаве, павялі на месца казьні. Разам з Госпадам вялі і двох засуджаных на расьпяцьце разбойнікаў.

## Расьпяцьце Ісуса Хрыста і сьмерць Яго.

Прышлі на Галгофу, або Лобнае месца. Тут і расьпялі Хрыста, — Ісуса ў сярэдзіне, разбойнікаў наабапал Яго. Калі расьпіналі і прыбівалі гваздамі да храста працягнутыя ўздоўж перакладзіны рукі і ногі, ніхто не пачуў ніводнага стогну ці жальбы з вуснаў Спасіцеля. Ён толькі маліўся за Сваіх мучыцеляў: «Отча! даруй ім, бо ня ведаюць, што робяць». Да храста, над галавою Госпада — загадам Пілата — была прыбіта дошчачка з надпісам: «Ісус Назаранін, Цар Юдэйскі».

Першасьвяшчэнікі і кніжнікі зьдзекаваліся над Ісусом Хрыстом і гаварылі: «Іншых спасаў, няхай-жа Сябе Самога спасе, калі Ён Хрыстос, выбранец Божы. Тады мы першыя ўверуем у Яго». Тое самае паўтараў народ і ваякі. Нават адзін з разбойнікаў, расьпятых з Госпадам, зьдзекаваўся над Ім і казаў: «Калі Ты Хрыстос, спасі Сябе і нас». Другі-ж разбойнік, больш разважны і спагадлівы, сунімаў Яго і казаў: «Ці-ж ты не баішся Бога, калі і сам засуджаны на тое-ж? Але мы засуджаны справядліва, за нашыя ліхія ўчынкі, а Ён нічога злога не зрабіў». І сказаў Ісусу: «Успомні мяне, Госпадзі, калі прыйдзеш у Царства Тваё». На гэтае маленьне і раскаяньне разбойніка Ісус, Які ўвесь час маўчаў, адказаў: «Запраўды кажу табе: сяньня-ж будзеш са Мною ў раі».

Недалёка ад храста Госпадавага, у страшным горы, заплаканыя, ледзь жывыя, стаялі: Маці Яго, Ап. Іоанн, Марыя Магдаліна і шмат іншых. Паказаўшы лёгкім нахіленьнем галавы на любага вучня, Ісус Хрыстос сказаў Маці Сваёй: «Жанчына, вось сын Твой». Пасьля кажа вучню: «Вось Маці твая». Гэтымі словамі Хрыстос

даручаў Сваю Маці дагляду Ап. Іоанна, які з таго часу прыняў Яе ў свой дом і апекаваўся Ёю, як сын сваёю Маткаю.

У шэсьць гадзін, па нашаму дванаццаць, усю зямлю раптам пакрыла цьма, і настала ціша вялікая: быццам уся прырода прыхілілася да тайны, якая дзеялася на



Расьпяцьце Ісуса Хрыста.

Галгофе. У дзевяць гадзін Ісус Хрыстос моцным голасам выклікнуў: «Отча! у рукі Твае аддаю дух Мой». Пасьля гэтага, сабраўшы ўсе сілы, вымавіў апошнія Свае словы: „**Збылося**“ і, схіліўшы на грудзі галаву, аддаў дух.

vytoki.net



У момант сьмерці Госпада зьявіліся многія дзіўныя знаменьні: затраслася ўся зямля, у храме Ерусалімскім разадралася—ад верхняга краю да ніжняга—сьвяшчэнная заслона, распаліся каменьні, адкрыліся магілы і многія памёршыя сьвятыя ўваскрэсьлі.

Усіх, хто быў на Галгофе, апанаваў вялікі страх. Перапалохаліся і ваякі, якія сьцераглі Ісуса. Сотнік-жа, бачачы землятрасеньне і ўсё, што было, у вялікім узварушэньні праславіў Бога і выклікнуў: «Узапраўды, гэты Праведнік быў Сын Божы!»

## Пахаваньне Госпада.

Вечарам таго дня начальнікі юдэйскія прышлі да Пілата і прасілі дазволіць перабіць расьпятым галені, каб яны хутчэй памёрлі: надыходзіла вялікае сьвята — Пасха, і нядобра, каб павешаныя заставаліся падчас сьвята на храстах. Пілат пазволіў. Прышлі ваякі, і ў першага разбойніка перабілі галені, і ў другога, расьпятага з Ім. Калі-ж падыйшлі да Ісуса і ўбачылі, што Ён ужо памёр, дык не перабівалі ў Яго галеняў. Толькі адзін з ваякаў прабіў Яму бок пікаю і — пацякла з раны кроў і вада.

Пазьней прыйшоў да Пілата адзін з тайных вучняў Госпада нейкі Іосіф з Арымафэі, сябра сынэдрыёну, чалавек добры і справядлівы, і прасіў дазволу пахаваць Цела Хрыста. Пілат дазволіў. Іосіфу памагаў другі тайны вучань Госпада — вучыцель закону Нікодым. Яны зьнялі з храста Цела Госпада Ісуса, ахінулі палатном і пахавалі каля Галгофы, у садзе Іосіфа, у новым, высечаным у скале гробе, дзе яшчэ ніхто ніколі ня быў пахаваны. Уваход у гроб быў завалены вялізарным каменем.

На другі дзень пасьля пахаваньня, г. зн. у суботу, першасьвяшчэньнікі і фарысэі, ня гледзячы на сьвята, зрабілі нараду і пастанавілі забясьпечыцца, каб вучні, прыйшоўшы ўночы, ня ўкралі Цела Ісусавага, а пасьля не сказалі народу: „Уваскрос з мёртвых“. Яны пайшлі да Пілата, расказалі, што іх непакоіць і прасілі даць варту да гробу. Пілат згадзіўся. Ня гледзячы на сьвя-

тасьць вялікае суботы, нарушэньне якой так часта закідалі Хрысту, яны пайшлі, паставілі варту і прылажылі пячатку сынэдрыёну да каменя, які зачыняў уваход у пячору.

Мукі, сьмерць і пахаваньне Госпада Ісуса Хрыста ўспамінаецца Праваслаўнаю Царквою на тыдні перад Пасхаю, які называюцца **„Страстным“** або Вялікім. У **Страстную** Пятніцу на „ўтрэні“ чытаецца 12 Эвангельляў аб муках Хрыстовых, а на „вячэрні“ выносіцца для пакланеньня народу Сьвятая плашчаніца, г. зн. абраз Ісуса Хрыста, ляжачага ў гробе.

## Уваскрасеньне Хрыста.

На трэці дзень пасьля сьмерці Сваей, чуць сьвет, Ісус Хрыстос, сілай Сваёй боскай магутнасьці, ўваскрос. Пры гэтым зрабілася страшэннае землятрасеньне. З неба зышоў Ангел Божы, адваліў камень ад дзьвярэй гробу і сеў на ім. Устаўшы з мёртвых, Гасподзь вышаў з магілы. Ваякі, сьцярогшыя гроб, бачачы ўсё гэта, на сьмерць пераляkаліся, але потым ачухаўшыся, разьбегліся; некаторыя з іх, аднак, пайшлі да першасьвяшчэньнікаў і данясьлі аб стаўшымся. Тыя далі ім грошай і навучылі казаць усім, што вучні Ісуса Хрыста, прыйшоўшы ўночы, укралі Яго Цела, калі яны спалі.

У той-жа дзень Ісус Хрыстос зьявіўся Прачыстай Мацеры Сваёй, Марыі Магдаліне і некаторым набожным жанчынам, таксама Апосталам. Потым Ён у працягу 40 дзён шмат разоў зьяўляўся вучням Сваім і навучаў іх тайнаў Царства Божага.

Сваім уваскрасеньнем Ісус Хрыстос паказаў, што Ён быў не чалавек толькі, а разам і Бог, і калі Ён Сам уваскрос, дык — значыць — можа ўваскрасіць і нас, веручых ў Яго, і дараваць нам жыцьцё вечнае. Таму вось так радасна для нас ўваскрасеньне Хрыстова.

Уваскрасеньне Хрыстова сьвяткуецца ў нас у сакавіку альбо ў красавіку (між 22 сакавіка і 25 красавіка ст. ст. і 4 красавіка і 8 траўня нов. стылю) ў першую нядзелю пасьля поўні. Гэта самае вялікае сьвята. Завецца яно **Сьвятой Пасхай, Вялікаднем.** Вялікдзень сьвяткуецца цэлы тыдзень, які за- [illegible]ным.

vytoki.net





Хрїсто́съ воскре́се и҆з̾ ме́ртвыхъ,
сме́ртїю сме́рть попра́въ,
и҆ сꙋ́щымъ во гробѣ́хъ живо́тъ дарова́въ.

### Зьяўленьні ўваскросшага Хрыста - Спасіцеля Апосталам.

Марыя Магдаліна і іншыя жанчыны расказалі Апосталам, што Господзь уваскрос з мёртвых, але тыя не паверылі словам іх.

Позна ўвечары ўсе Апосталы, апрача Фамы, былі разам у адным пакоі, а дзьверы былі зачынены. Раптам зьявіўся ім Ісус Хрыстос і сказаў: «Мір вам!» Яны падумалі, што гэта здань, і перепалохаліся. Але Ён сказаў, што гэта Ён Сам, і паказаў ім рукі, ногі і робры Свае. Калі-ж яны з радасьці ўсё яшчэ ня верылі, Ён папрасіў ёсьці. Яны падалі Яму частку печанае рыбы і сотавага мёду. Хрыстос, узяўшы, еў перад імі.

Калі прыйшоў Фама, Апосталы кажуць яму: «Бачылі Госпада». Але Фама сказаў ім, што датуль не паверыць, пакуль не даткнецца пальцам да ранаў Яго і ня ўложыць рукі свае ў бок Яго, прапораты пікай.

Праз тыдзень Апосталы ізноў былі ўсе разам, і Фама з імі. Дзьверы былі зачынены. Ісус Хрыстос зьявіўся сярод Апосталаў і сказаў Фаме, каб ашчупаў пальцамі раны Яго і ня быў няверным, але верным. «Господзь мой і Бог мой!» з глыбокім перекананьнем і вераю выклікнуў Ап. Фома, і пакланіўся Яму. «Ты паверыў, — сказаў Яму Хрыстос, — бо бачыў Мяне, але шчасьлівыя тыя, якія ня бачыўшы павераць».

Таксама Ісус Хрыстос зьявіўся некалькім вучням на моры Тывэрыядзкім (інакш возера Галілейскае). Тут яны ўсю ноч лавілі рыбу і нічога не злавілі. На сьвітаньні — бачаць — стаіць на беразе нейкі Чалавек. Яны не пазналі Яго. А гэта быў Хрыстос. Вось Хрыстос і кажа, каб яшчэ закінулі сеці і па правы бок чоўна. Яны закінулі, але ўжо не маглі выцягнуць сецяў: так многа было рыбы. Тады яны ўбачылі, што гэта быў Господзь.

У другі раз усе Апосталы пайшлі ў Галілею, на гару, куды загадаў ім Ісус. Апрача іх, там сабралася больш як 500 вучняў Яго. Усе яны з радасьцю чакалі Госпада. Калі зьнячэўку Хрыстос стаў пасярод іх, яны пакланіліся Яму.

Калі Хрыстос падыйшоў бліжэй, сабраныя пачулі з вуснаў Яго такія вялікія ўладныя словы: «Дадзена ...лада на небе і на зямлі. Таму ідзеце, на-

vytoki.net



вучайце ўсе народы, хрысьцячы іх у імя Айца, і Сына, і Сьвятога Духа, навучаючы іх выпаўніць усё, што Я загадаў вам. Хто ўверуе і ахрысьціцца, збаўлены будзе; хто-ж ня ўверуе, засуджаны будзе». Вялікі страх агарнуў Апосталаў. Але Господзь тут-жа заспакоіў іх абяцаньнем: «Я буду з вамі ўва ўсе дні да сканчэньня веку. Амінь».

### Узьнясеньне Госпада на неба.

Саракавога дня па ўваскрасеньні, Господзь зьявіўся вучням Сваім у Ерусаліме. Гутарачы з імі, Ён абяцаў



Узьнясеньне Госпада на неба.

паслаць ім Сьвятога Духа. Потым вывеў іх з места на гару Аліўную, багаславіў і, падняўшы рукі Свае, ўзьнёсься на неба. Калі ясная хмарка закрыла Госпада ад вуч-

няў, ім зьявіліся два Ангелы і сказалі, што Гасподзь зноў прыдзе на зямлю, так як бачылі Яго цяпер узыходзячым на неба. І пакланіліся Апосталы Узьнятаму, і з вялікаю радасьцю вярнуліся ў Ерусалім. Тут усе Яны знаходзіліся неадлучна, зьбіраючыся для малітвы разам з Божаю Маткаю, братамі Госпада і іншымі вернымі, і чакаючы абяцанага ім Уцяшыцеля—Духа Сьвятога.

Сьвята Узьнясеньня Гасподняга (Ушэсьце) бывае ў 40 дзень пасьля Вялікадня і заўсёды прыпадае ў чацьвер.

## Зыходжаньне Сьвятога Духа на Апосталаў.

Праз дзесяць дзён пасьля Узьнясеньня Госпада было жыдоўскае сьвята Пяцідзесятніцы. Для Апосталаў гэты дзень быў падвойным сьвятам, бо Пяцідзесятніца прышлася на першы дзень тыдня, у які ўваскрос Хрыстос. З поваду сьвята ў Ерусаліме было шмат людзей з самых далёкіх краінаў.

Апосталы зраньня былі сабраныя ўсе ў сьвятліцы, дзе маліліся. Зьнячэўку воддаль пачуўся шум з неба, як бы ад сільнага ветру. Шум усё павялічваўся і хутка напоўніў увесь дом, у якім былі Апо талы. Потым увесь пакой асьвятліла нібы полымя, і над кожным з Апосталаў паказаліся языкі, быццам агнявыя. І напоўніліся ўсе Апосталы Духа Сьвятога, і пачалі кожын гаварыць на розных новых языках, якіх раней ня ведалі, — так, як Дух Сьвяты даваў ім прамаўляці. Яны пачулі сябе з новымі духоўнымі сіламі, як-бы зноў народжанымі да жыцьця. Усё раней незразумелае ў вучэньні Госпада цяпер станавілася для іх ясным і зразумелым. Якаясь нястрыманая сіла цягнула іх спавядаць Хрыста і абвясьціць Яго слова.

Між тым каля дому, дзе знаходзіліся Апосталы, сабраўся нязьлічоны натоўп людзей, я-іх прыманіў сюды слышаны шум. Калі Апосталы выйшлі да народу і пачалі гаварыць да ўсіх на розных языках, дык гэта выклікала вялікае зьдзіўленьне, бо Галілейскія рыбаловы былі ведамы, як людзі простыя, неадукаваныя, якія маглі гаварыць толькі ў сваёй роднай мове. Тады зьвярнуўся да ўсіх Ап. Пётр і пачаў прапаведваць «Хрыста расьпятага, Якога — кажа — вы ўзялі і забілі. Вось Яго Бог уваскрасіў: усе мы — сьведкі гэтага. Узьнесены сілаю

vytoki.net



Бога, дык ўзяўшы ад Айца абяцаньне Духа Сьвятога, Ён падаў тое, што цяпер бачыце і чуеце»... Гарачая прамова Ап. Пятра ўзварушыла ўвесь народ. І прынялі словы яго, і хрысьціліся. У той дзень далучылася да Апосталаў каля трох тысяч людзей. І разьнясьлі яны вестку аб усім, што бачылі і чулі ўва ўсе канцы сьвету.



Зыходжаньне Сьвятога Духа на Апосталаў.

Так паўстала ў Ерусаліме першая Апостальская Хрысьціянская Царква.

Сьвята гэтае завецца Пяцідзесятніцай альбо **Тройцай**, або яшчэ **Сёмухай**. Сьвяткуецца на 50-ты дзень (па сямёх тыднях—адсюль Сёмуха) ад Вялікадня, заўсёды ў нядзелю. У Праваслаўнай нашай Царкве існуе прыгожы звычай прыбіраць на Тройцу храм Божы, як і хаты, зялёнымі галінкамі, аерам, краскамі.

## Усьпеньне Божай Мацеры.

Па сьмерці Ісуса Хрыста, Мацер Божая жыла ў Ерусаліме ў доме Евангелісты Іоанна Багаслова, які, па запавету Збавіцеля, дбаў аб Ёй, як аб сваёй Мацеры, да самага Яе усьпеньня. За некалькі дзён да канчыны зьявіўся Ёй Архангел Гаўрыіл і абвясьціў аб Яе



Усьпеньне Божай Мацеры.

хуткім блажэнным усьпеньні. У той час, па жаданьню Багародзіцы, чудам сабраны былі ў Ерусалім усе Апосталы. У самы дзень канчыны нязвычайнае сьвятло асьвяціла Яе пакой, а з гэтым зьявіўся Сам Гасподзь ...ьвятую душу. Прачыстае цела Божай Ма-

vytoki.net



церы было пахавана між грабамі Яе бацькоў і Праведнага Іосіфа.

Дзень Усьпеньня Божай Мацеры (Прачыстая) сьвяткуецца 15—28 жніўня.

## Узьвіжаньне Храста Гасподняга.

Грэцкі цар Канстантын, пабуджаны багабойным жаданьньем, пастанавіў знайсьці хрэст, на якім быў рась-



Узьвіжаньне Храста Гасподняга.

пяты Збавіцель. З гэтай думкай ён паслаў матку сваю, царыцу Алёну ў Ерусалім. Там, з помаччу аднаго старога яўрэя, адкапалі на Галгофе з зямлі тры храсты, вельмі падобныя адзін да аднаго. Каля іх ляжала до-

шчачка з напісам: „Ісус Назаранін, Цар Юдэйскій". Трэба было пазнаць, які з гэтых храстоў — хрэст Гасподні. Тады прывязьлі адну хворую жанчыну і яна пачала прыкладвацца да храстоў. Прылажылася да першага — нічога ня сталася; прылажылася да другога — таксама нічога ня было; а як прылажылася да трэцьцяга храста, дык адразу ачуняла. Потым сталі накладаць храсты на памёршага. Два першыя не зрабілі чуда, а як быў наложаны трэці хрэст — мёртвы ўваскрос. Пасьля гэтага царыца і духавенства прызналі гэты хрэст за Хрэст Гасподні, пачалі кланяцца перад ім і цалаваць яго. Але людзей было так многа, што ўсе не маглі прылажыцца да храста. Таму прасілі, прынамсі, паказаць вялікую сьвятыню. Патрыярх стаў на падвышэньні і некалькі разоў паднімаў у гару Хрэст Гасподні. Народ-жа, гледзячы на яго, выклікаў: „Госпадзі, памілуй".

Сьвята гэтае завецца Узьвіжаньнем Часнога і Жыцьцяноснага Храста Гасподняга і сьвяткуецца 14—27 верасьня.

### МАЛІТВА ХРАСТУ.

**Ѿгради мѧ, гдⷭи, силою чⷭтнагѡ и животворѧщагѡ твоегѡ крⷭта, и сохрани мѧ ѿ всѧкагѡ ѕла.**

---

# ПРАВАСЛАЎНАЯ ВЕРА.

Богу дзякаваць, вера нашая Хрысьціянская, Праваслаўная разышлася амаль не па ўсім сьвеце. І мы павінны шанаваць яе і любіць Бога і Царкву Праваслаўную больш за ўсё ў жыцьці, хоць-бы трэба было памучыцца і ўмерці за яе ад бязбожных людзей.

Мы называемся **хрысьціянамі** таму, што верым у Госпада нашага Ісуса Хрыста, Сына Божага, і ўсім сэрцам прымаем сьвяты закон Яго.

Мы завёмся **праваслаўнымі** хрысьціянамі, бо верым у Бога і славім Яго правільна, праўдзіва, як навучылі нас верыць Сьвятыя Апосталы, як пастанавілі Сусьветныя Саборы, Сьвятыя Айцы і Вучыцялі Царкоўныя.

Але ёсьць хрысьціяне, якія няправільна вераць у Бога, якія шмат у чым адступілі ад навукі Хрыстовай і пераняли звычаі, нязгодныя з пераказам Адзінай, Сьвятой, Сусьветнай і Апостальскай Царквы. Яны завуцца **іншавернымі** хрысьціянамі. Каб адвярнуць іншаверных, альбо іншаслаўных хрысьціян ад памылак, Сьвятая Праваслаўная Царква адгаварвала іх, намаўляла, пераконвала, але яны, ў гордасьці сваёй, не захацелі пакаяцца, ды далей упіраліся. Тады Царква, згодна з словам Божым, адлучыла іх ад сябе.

**Навучыцца** праўдзівай веры найлепш цераз **Сімвал (знак) веры**, бо гэта ёсьць кароткі і ясны выклад таго, як павінен верыць праваслаўны хрысьціянін (Знак веры зьмешчаны ў гэтай кніжцы на стр. 42-47).

Сімвал зложаны Сьвятымі Айцамі Першага і Другога Сусьветных Сабораў.

Сусьветны Сабор ёсьць сабраньне Архіпастыраў (Архірэяў-Епіскапаў), Пастыраў і Вучыцялёў Царквы хрысьціянскай, па магчымасьці з усяго сьвету, для зацьверджаньня праўдзівага вучэньня і перасьцярогі верных перад памылкамі.

vytoki.net

Апрача веры, ад хрысьціяніна вымагаецца яшчэ любоў да Бога і блізкіх. Навучыцца любіць Бога і людзей можна з дзесяцёх Запаведзяў Божых (яны надрукованы ў гэтай кніжцы на стр. 47-50).

Запаведзь — значыць: загад, вымаганьне.

Дзесяць Запаведзяў даў Бог яўрэям цераз Майсея у пяцьдзясяты дзень па выхадзе іх з Эгіпту; напісаны былі запаведзі на дзьвёх каменных дошках або скрыжалях і дадзены на гары Сынаі, у громе і маланцы, пры трубных гуках. На аднэй дошцы былі напісаны першыя чатыры Запаведзі аб любові да Бога, а на другой — шэсьць іншых запаведзяў аб любові да бліжніх.

Без выпаўненьня гэтых Запаведзяў Закону Божага немагчыма дагадзіць Богу і атрымаць спасеньне.

## Праваслаўная навука аб Богу ў Тройцы Сьвятой.

Мы ўжо ведаем, што Бог ёсьць Дух бесьцялесны, вечны, усемагутны, ўсяведаючы, усюдысушчы, Тварэц неба і зямлі, ангелаў і людзей, усяго, што бачым і чаго ня бачым. Мы знаем такжа, што Бог **адзіны** ў істоце Сваёй, але **троічны** ў асобах: першая асоба — **Бог Ацец**, другая — **Бог Сын**, трэцяя — **Бог Дух Сьвяты** (Глядзі гутарку аб Богу на стр. 27, 28 гэтай кніжкі).

Гэтыя тры асобы разам называюцца Трыадзіным Богам, або Прасьвятою Тройцаю адзінаістотнаю і неразьдзельнаю.

Тры Асобы Божых — зусім роўныя па дастойнасьці Сваёй: ніхто з іх ані большы, ані меншы. Усе Яны маюць адныя і тыя-ж Божыі дасканаласьці, аднолькавую сілу, волю, чэсьць і ўладу; а таму, як Бог Ацец ёсьць **ісьціны Бог**, так і Бог Сын ёсьць ісьціны Бог, і Бог Дух Сьвяты ёсьць, таксама, **ісьціны Бог**, аднак ня тры праўдзівыя Багі, але адзіны праўдзівы Бог.

Аддаючы Божую пашану Айцу, Сыну і Сьвятому Духу, мы пакланяемся Ім не як тром асобным Багом, але як адзінаму Богу, ў Тройцы славімаму. Людзі ня могуць зразумець, як гэта Бог Ацец, Бог Сын і Бог Дух Сьвяты ёсьць адзін Бог; гэта вышэй розуму чалавечага, гэта тайна Божая, і ў праўду гэтую мы павінны верыць, па загаду Самога Бога.

vytoki.net



Тры Асобы Сьвятой Тройцы, будучы адзіным ў Сваёй Божай істоце, розняцца сваімі асабовымі свойствамі. Розніца між Імі тая, што Бог Ацец не раждаецца і ня выходзіць ад другой Асобы; Сын Божы спрадвечна раждаецца ад Бога Айца, Дух Сьвяты спрадвечна выходзіць ад Бога Айца.

Што нам патрэбна ведаць аб Сыне Божым? — Ведаць нам трэба, што Сын Божы дзеля нас і для нашага спасеньня зышоў з неба, стаў падобным да чалавека, г. зн. прыняў на Сябе цела і душу чалавечую, апрача граха; радзіўся на зямлі ад Прасьвятой Дзевы Марыі; трыццаць тры з палавінай гады жыў на зямлі, як чалавек, не перастаючы быць Богам; вучыў людзей, як верыць, маліцца і жыць; навучаў праўды і дабра; аздараўляў хворых; уваскрашаў мёртвых; пры Понты Пілаце быў расьпяты на крысьце за грахі нашыя і дзеля нашага спасеньня, на трэці дзень уваскрос з мёртвых; у саракавы дзень па ўваскрасеньні ўзьнёсься на неба, сеў па правай руцэ Бога Айца і пануе з Айцом і Сьвятым Духам на небе й на зямлі; йзноў прыдзе ў славе з ангеламі Сваімі на зямлю, каб судзіць усіх людзей, як жывых, так і мёртвых, якія ў той час ўваскрэснуць. Тады царству Яго ня будзе канца.

Пасьля апошняга і страшнага Суда Божага праведныя людзі атрымаюць жыцьцё вечнае, а грэшныя пайдуць на мукі вечныя.

Што нам трэба ведаць аб Духу Сьвятым?

Патрэбна нам ведаць, што Гасподзь Ісус Хрыстос паслаў ад Айца на зямлю Духа Сьвятога, каб пастаянна з веруючымі прабываў. Дух Сьвяты ёсьць Бог, Які дае, як Бог Айцец і Бог Сын, усяму жыцьцё. Ён вечна выходзіць ад Бога Айца; Яму аднолькавая з Айцом і Сынам належыць пашана. Ён гаварыў цераз Прарокаў, г. зн. Прарокі прадказвалі аб будучыні (прараквалі) не ад сябе, але натхнёныя Духам Сьвятым.

## Праваслаўная навука аб Царкве.

Царква Хрыстовая гэта ёсьць таварыства або сабраньне людзей, заснованае Госпадам нашым Ісусам Хрыстом, члены (сябры) якога (людзі) вызнаюць адзіную

ісьцінную або Праваслаўную веру, асьвячаюцца Сьвятымі Таінствамі і навучаюцца духоўнымі пастырамі, каб вясьці багабойнае жыцьцё на зямлі і атрымаць збаўленьне і вечнае шчасьце на небе.

Адзіная Галава Царквы, Яе кіраўнік ёсьць Сам Гасподзь наш Ісус Хрыстос і ніякай іншай галавы ў запраўднай Хрыстовай Царкве няма і быць ня можа.

Паводле слоў Спасіцеля, Царква будзе вечна: «Збудую Царкву Маю, сказаў Хрыстос, і вароты пякельныя не перамогуць яе». Ён-жа абяцаў заўсёды быць з Царквою, кажучы: «Вось Я з вамі ўва ўсе дні да скančэньня веку. Амінь».

Ці можна збавіцца без Царквы? Не, без Царквы мы ня можам збавіцца, бо хто аддаляецца ад Царквы, той аддаляецца ад Хрыста: «Па-за Царквою няма збаўленьня», кажуць Святыя Айцы.

## Праваслаўная навука аб Сьвятых Таінствах.

Таінства — гэта сьвятое дзеяньне, цераз якое, пад пэўным відочным знакам, тайна і нявідочна падаецца нам ласка Божая або спасіцельная сіла Божая.

Таінстваў у царкве Праваслаўнай сем: Хрышчэньне, Мірапамазаньне, Прычашчэньне, Пакаяньне, Сьвяшчэнства, Венчаньне і Памазаньне Сьв. алеем (Елеасвяшчэньне).

У чым значэньне гэтых Таінстваў?

У **Хрышчэньні** чалавек раджаецца да новага духоўнага жыцьця і робіцца хрысьціянінам.

У **Мірапамазаньні** даюцца хрысьціяніну дары Духа Сьвятога, якія адраджаюць яго і ўзмацняюць у духоўным жыцьці.

У **Прычашчэньні** хрысьціянін, прымаючы хлеб і віно, прычашчаецца самога Прачыстага Цела і Сьвятой Крыві Госпада Спасіцеля. Пры гэтым веруючы таямніча злучаецца з Госпадам Ісусам Хрыстом і становіцца прычасьнікам вечнага жыцьця.

У Таінстве **Пакаяньня** спаведнік, цераз разрашэньне сьвяшчэньніка, нявідочна ачышчаецца ад грахоў Самым Госпадам Ісусам Хрыстом.

vytoki.net



У Таінстве **Сьвяшчэнства** выбраны на пэўнае духоўнае служэньне, цераз архірэйскае рукапалажэньне, атрымлівае Дары Сьвятога Духа, патрэбныя для спаўненьня абавязкаў, з азначаным служэньнем зьвязаных.

У Таінстве **Венчаньня** падаецца міласьць Божая, што асьвячае супружаскі саюз, на ўзор саюза Хрыста з Царквою.

У Таінстве **Памазаньня Сьв. Алеем** даецца хвораму хрысьціяніну міласьць Божая, што аздараўляе яго ад немачаў душэўных і цялесных.

Выконваць Таінствы могуць толькі Епіскапы і Прасьвітэры, іначай Сьвяшчэньнікі (гэтыя — ўсе таінствы, апрача Сьвяшчэнства), як **будаўнічыя Тайнаў Божых** (1 Карынц. 4, 1). Хрысьціць, у выпадку неабходнасьці, можа ўсякі хрысьціянін, з умоваю, аднак, што, калі дзіця будзе жыць, хрышчэньне дапоўніць сьвяшчэньнік.

## Пасты Праваслаўнай Царквы.

Праваслаўная Царква захоўвае гэткія многадзённыя пасты.

1. **Вялікі** пост, іначай Сьв. Чатырадзесятніца, на памяць, што Хрыстос пасьціўся 40 к дзён у пустыні. Да посту гэтага далучаецца Страстная нядзеля на ўспамін мукаў Хрыста Збавіцеля.

2. **Калядны** пост, іначай **Піліпаўка**, перад Ражаством Хрыстовым. Піліпаўкай завецца таму, што пачынаецца пасьля сьвята на чэсьць Сьвятога Апостала Піліпа (14 лістапада).

3. **Успенскі** пост — **Спасаўка,** (ад 1 да 14 жніўня) перад Усьпеньнем Божай Маццеры.

4. **Пятроўка** — у чэсьць Сьвятых Апосталаў Пятра і Паўла; пачынаецца праз тыдзень па Сёмусе і цягнецца да Пятра).

Пасты аднадзённыя: **серада** — на знак жалю, што Юда-здраднік прадаў Хрыста на мукі; **пятніца** — на ўспамін аб Збаўчых муках Хрыста; **напярэдадні Хрышчэньня** — 5 (18) студзеня; **Адсячэньне Галавы Іоанну Прадцечы** — 29 жніўня (11 верасьня) і **Узьвіжаньне** — 14 (27) верасьня.

Каб пост наш быў угодны Богу і карысны для нас,

мы павінны пасьціцца не дзеля людзкога, як кажуць, вока, але перад Богам, з любоўю да Яго; гэта значыць у пост ня можна ня толькі есьці мяса, масла і іншай скаромінвы, але і ў посных стравах трэба быць умяркаваным; затым трэба устрымлівацца ад брыдкіх словаў, непатрэбнай гульні, чытаньня кніжак, якія могуць выклікаць нячыстыя думкі і пажаданьні, і наагул ухіляцца ад ўсяго, што можа навясьці нас на спакушэньне.

Вельмі добра і карысна скончыць пост ачышчэньнем душы ад грахоў у Сьв. Споведзі і асьвяціць яе прычашчэньнем Сьв. Цела і Крыві Хрыстовай.

## Храм Божы.

Мы, праваслаўныя, ходзім маліцца ў царкву, або ў храм Божы. Тут мы бачым: іконастас, за ім аўтар, у аўтары прастол і жэртвенік (ахвярнік). На прастоле ляжаць — антымінс, евангельле, хрест; на ахвярніку — чаша, дыскос, кап'ё, лыжачка (лжыца) і іншыя патрэбныя да службы Божай рэчы. У іканастасе ёсьць царскія дзьверы і бакавыя дзьверы, тут-жа вісяць іконы — Збавіцеля, Божай Мацеры і многіх Сьв. Угоднікаў. Перад іконастасам зроблены крыласы; ля іх, як і па ўсёй царкве, стаяць харугві і абразы (іконы).

У царкве сьвяшчэньнік служыць у асаблівых сьвяшчэнных адзежах, якія завуцца: падрызьнік, эпітрахіль, пояс, поручы, рыза.

Службу Божую ў царкве адпраўляюць: дыякан, сьвяшчэньнік, епіскап.

У храме Божым трэба стаяць уважна, не размаўляць, ня дурэць, не азірацца, але шчыра маліцца і з увагай слухаць словы сьвяшчэньніка, пяяньне і чытаньне. Належыць усім вучыцца сьпяваць у царкве, каб славіць Бога.

## Багаслужэньне.

Богу ўгодна, каб мы заўсёды маліліся. У манастырох, дзе жывуць людзі, ахвяраваўшыя сябе на служэньне Богу (манахі), кожны дзень адпраўляюцца службы

vytoki.net



ў розную пару дня і ночы. Апоўначы служыцца **палуношчніца**, раніцаю—**утраня**, ў першую па ўсходзе солнца гадзіду — **першы час**, потым — **трэці час, шосты час, літургія** або **абедня, дзевяты час, вячэрня, павячэрые.**

Усе службы гэтыя, звычайна, для адправы, злучаюцца па тры зараз: рана — полуношчніца, утраня і час першы; ў дзень — часы (трэці і шосты) і абедня; ўвечары — дзевяты час, вячэрня і павячэрые. Перад вялікімі сьвятамі з вечара служыцца **ўсяночная,** зложаная з вячэрні, утрані і першага часу.

Багаслужэбная кніжка, ў якой зьмешчаны часы і іншыя царкоўныя службы, называецца часасловам. З часаслова кожны можа маліцца дома, трэба толькі прапускаць словы, якія гаворыць сьвяшчэньнік, а яго пачаткавы возгалас: „Багаслаўлён Бог наш“, замяніць малітваю: „Малітвамі Сьвятых Айцоў нашых, Госпадзі Іісусе Хрысьце, Божа наш, памілуй нас“.

## Літургія (Абедня).

З усіх царкоўных службаў найважнейшай ёсьць літургія або абедня. Падчас яе ўспамінаецца намі ўсё зямное жыцьцё Госпада нашага Іісуса Хрыста, пачынаючы Ражаством і канчаючы Узьнясеньнем Яго на неба. У часе-ж літургіі прыносіцца Богу найвялікшая ахвяра — Цела і Кроў Хрыстовая для спасеньня людзей. Прысутнымі пры абедні ёсьць і сьвятыя Ангелы, якія нявідочна абкружаюць Прастол Божы, відочна-ж у гэтым часе напаўняюць царкву верныя людзі, якія, разам з сьвяшчэньнікам, шчыра моляцца Богу, дзякуючы і славячы Яго за вялікую міласьць да нас грэшных, просячы і далей не пакідаць без Свае апекі.

Абедня дзеліцца на тры часьці: 1 — проскомідыя, 2—літургія аглашенных і 3—літургія верных.

У часе **проскомідыі** сьвяшчэньнік стаіць пры ахвярніку, прыгатаўляючы Сьв. Дары, якія потым, у часе абедні,ператвараюцца ў Цела і Кроў Хрыстовую. Прыгатаўленьне робіцца так, што сьвяшчэньнік з пяцёх пшанічных кіслых хлябкоў, званых просфарамі, бярэ першы і вырэзвае агнец, у чэсьць Іісуса Хрыста, а ў чашу ўлівае віно з вадою. Потым з другой просфары

вымаецца часьціца ў чэсьць Мацеры Божай, з трэцяй— 9 часьціцаў на чэсьць усіх Сьвятых, з чацьвертай — за здароўе жывых і з пятай за ўпакой памёршых, памінаючы адных і другіх паіменна. На крыласе тымчасам чытаюць часы—трэці і шосты. Падчас проскамідыі ўспамінаюцца Ражаство Хрыстовае і Мукі Хрыстовыя.

Другая часьць абедні завецца **літургіяй аглашэнных,** таму, што пры яе адправе могуць быть прысутнымі ў царкве не адны верныя, але й аглашэнныя, г. зн. прыгатаваныя да хрышчэньня, але яшчэ ня хрышчаныя.

Літургія аглашэнных пачынаецца праслаўленьнем царства Божага ў словах: **„Благословéнно цáрство Óтца и Сы́на и Свята́го Ду́ха, ны́нѣ и при́сно и во вѣ́ки вѣко́въ. Ами́нь“.** (г. ё. багаслаўлёна царства Айца і Сына і Сьв. Духа, цяпер і заўсёды і на векі вечныя. Амінь) і канчаецца загадам да аглашэнных выйсьці з храму: **„Ели́цы оглаше́ннии изыди́те“** (хто аглашэнны, выйдзі). Складаецца яна з малітваў, званых ектэніямі (калі пяюць: **„Го́споди, поми́луй“**), сьвяшчэнных песьняў і слова Божага—Апостала і Евангельля. Вынас Евангельля перад чытаньнем да народу азначае выступленьне Ісуса Хрыста на пропаведзь.

Трэцяя часьць літургіі завецца літургіей верных, дзеля таго, что на ёй могуць быць прысутнымі адны толькі верныя, г. зн. хрышчаныя.

Літургія верных дзеліцца на 6 частак: 1—перанясеньне Дароў, 2 прыгатаваньне да іх асьвячэньня, 3—самае асьвячэньне, 4—прыгатаваньне да прычашчэньня, 5—прычашчэньне і 6—падзяка за прычашчэньне.

1. Перанос Дароў з ахвярніка на Прастол адбываецца падчас Хэрувімскай песьні: **„Иже Херуви́мы“.** З чашаю і дыскосам у руках, сьвяшчэньнік выходзіць бакавымі (паўночнымі) дзьвярыма да народу і просіць Бога, каб Ён памянуў у Сваім царстве прысутных у храме і ўсіх праваслаўных хрысьціян.

Выхад гэты, званы вялікім, азначае шэсьце Госпада нашага Ісуса Хрыста на мукі.

2. Пасьля перанясеньня Дароў, верныя прыгатаўляюцца да іх асьвячэньня: словамі **„Пода́й, Го́споди“** просяць сабе ад Бога розных міласьцяў; прымаюць ба-

vytoki.net



гаслаўленьне ад сьвяшчэньніка ў словах **„Ми́ръ всѣ́мъ“,** выказваючы сваю веру ў Бога, пяюць **„Вѣ́рую во еди́наго Бо́га“,** і заклікаюцца стаяць у царкве добра, багабойна, з думкай у сэрцы аб Богу.

3. Асьвячэньне Дароў — найважнейшы момант літургіі. Яно пачынаецца словамі: **„Благодари́мъ Го́спода“,** пакланеньнем Госпаду разам з Хэрувімамі і Сэрафімамі, сьпяваючымі **„Свя́тъ, Свя́тъ, Свя́тъ Госпо́дь Савао́ѳъ“,** і складаецца — 1) з успаміну Тайнай вячэры, калі Хрыстос першы раз даў вучням Прачыстае Цела і Кроў Сваю, кажучы: **„Прiими́те, яди́те: сiе́ е́сть тѣ́ло Мое́“** і **„Пiйте отъ нея́ вси́: сiя́ е́сть Кровь Моя́“;** 2) з прызываньня Сьв. Духа на Дары (сьвяшчэньнік у гэты час моліцца з паднятымі рукамі, і 3)з багаслаўленьня Сьв. Дароў, калі яны асьвячаюцца, так што хлеб становіцца Целам Хрыстовым, а віно—Крывёю Хрыстоваю. Пасьля асьвячэньня Дароў памінаюцца ўсе сьвятыя на небе, разам з Маткаю Божай, і ўсе, што жывуць на зямлі, праваслаўныя хрысьціяне.

Каб усе, хто ў царкву ня прыйшоў, ведалі, што творыцца асьвячэньні Дароў, і ў гэты час самі маліліся дома, бывае асобны звон, званы звонам „на Вѣрую“.

4. Па асьвячэньні Сьв. Дароў, верныя, што былі ў споведзі, гатовяцца да сьв. прычасьця, просячы ў Бога дараваньня грахоў і розных міласьцяў словамі: **„Пода́й, Го́споди“** і малітваю Гасподняю **„О́тче на́шъ“.**

5. Пасьля гэтага царскія дзьверы засланяюцца заслонай на ўспамін сьмерці і паграбеньня Ісуса Хрыста. Сьвяшчэньнік тым часам прычашчаецца ў аўтары, гатовячы прычасьце для рэшты спаведнікаў. Калі скончыць, завеса адсланяецца, адчыняюцца царскія дзьверы, прычым успамінаецца ўваскрасеньне Хрыстовае, і выносяцца Сьв. Дары з аўтара з заклікам да спаведнікаў: **„Со стра́хомъ Бо́жiимъ и вѣ́рою присту́пите“.**

Праслухаўшы малітву перад прычасьцем і зрабіўшы паклон, спаведнікі, злажыўшы нахрэст рукі, багабойна падыходзяць да сьв. чашы і прычашчаюцца самога Прачыстага Цела і Крыві Госпада нашага Ісуса Хрыста дзеля ачышчэньня ад грахоў і жыцьця вечнага.

Выхад сьвяшчэньніка з чашаю і заклік прыступіць

да прычасьця напамінаюць уваскросшага Хрыста, як Ён зьявіўся вучням Сваім.

6. Дзякуючы Богу за прычашчэньне, веруючыя ў другі раз кланяюцца Хрысту, калі сьв. чаша йзноў выносіцца да верных пры словах сьвяшчэньніка: „Всегда̀, ны́нѣ, и̂ при́снѡ, и̂ во вѣ́ки вѣкѡ́въ". Гэтым разам выгалашаныя словы з падняцьцем чашы азначаюць узьнясеньне на неба Госпада і Яго абяцаньне быць з намі на зямлі нявідочна заўсёды, да канца сьвету.

Атрымаўшы багаслаўленьне Господняе ад сьвяшчэньніка і пацалаваўшы хрэст, праваслаўныя людзі разыходзяцца па хатах, дзякуючы Богу, што спадобіў быць учасьнікам сьв. абедні, ачышчаючай нас ад грахоў.

# З ЦАРКОЎНАЙ ГІСТОРЫІ.

## Пропаведзь Апосталаў.

Сьвятыя Апосталы, пасьля зыходу на іх Сьвятога Духа ў відзе агнявых языкоў, цалкем аддаліся распаўсюджаньню і ўмацаваньню Царквы Хрыстовай па ўсіх кутох зямлі, і гэтай вялікай справе ахвяравалі ўсе свае сілы і здольнасьці. Ім здаралася цярпець голад і смагу, нагату і пабоі, кайданы і цямніцы (астрогі), нават сьмерць. Але на абразы яны адказвалі падзякай, на прасьледаваньні — цярпеньнем, на лаянкі — малітваю, ідучы за прыкладам Вучыцеля і Госпада свайго Ісуса Хрыста. За тое й навукай сваей запоўнілі ўвесь сьвет, да Хрыста прывялі ўсе канцы зямлі.

## Сьвяшчэннае Пісаньне Новага Завету.

Апосталы ня толькі вучылі словам, але, каб навука Хрыстовая вярней перахавалася, сьпісалі яе ў кнігах, па надыхненьню ад Духа Сьятога, як некалі старазаконныя Прарокі. Гэтыя пісаньні Апосталаў называюцца Сьвяшчэнным Пісаньнем Новага Завету.

Першай кнігай Новага Завету ёсьць **Евангельле паводле Мацьвея,** напісанае Апосталам каля восьмага году па ўшесьці Госпада на неба. У ёй вылажана гісторыя зямнога жыцьця і вучэньня Ісуса Хрыста.

Пасьля гэтага напісаны яшчэ тры падобныя Евангельлі Евангелістымі **Маркам, Лукою і Іоаннам,** званым **Багасловам,** дзеля таго, што ў яго кнізе пераважна гаворыцца аб спрадвечным нараджэньні Госпада Ісуса Хрыста, Бога-Слова, як і выходжаньні Сьвятога Духа ад Бога Айца.

Апрача таго Апосталы **Якаў, Пётр, Іоанн, Юда і Па-**

vytoki.net

**вал** напісалі дваццаць адно пасланьне аб вучэньні Хрыста і асновах Хрысьціянскага жыцьця.

**Пасланьні** інакш можна назваць **пісьмамі, лістамі.** Апрача таго, Апостал Іоанн Багаслоў, ў кніжцы, званай **„Адкрыцьце“**, або **„Апокаліпсіс“**, напісаў прароцтва аб лёсах Хрысьціянскай Царквы да канца сьвету.

Памяць Сьв. Іоанна Багаслова абходзіцца 8 траўня і 26 верасьня старага стылю.

### Сьвятыя Першавярхоўныя Апосталы Пётр і Павал.

«Першавярхоўнымі» называюцца яны за асаблівую старанасьць пры распаўсюджаньні Веры Хрыстовай. **Ап. Пётр** быў сын Іоны, беднага рыбака. Пакліканы Хрыстом, Пётр стаў Яго найбліжэйшым вучнем. Абвяшчаў ён слова Божае ў розных краёх, творачы многа чудаў, як уваскрашэньне мёртвых, аздараўленьне хворых словам і нават ценем сваім. Дзеля навучэньня людзей напісаў, па надыхненьню ад Духа Сьвятога, два Саборныя Пасланьні. Быў першым Епіскапам Рымскім. У Рыме-ж, за веру Хрыстовую, прыняў сьмерць, будучы расьпяты на храсьце ўніз галавою, ў 67 г. па Нараджэньні Хрыста.

**Ап. Павал** да апостальства зваўся Саўлам; паходзіў з заможнай фарысэйскай сям'і і зацята прасьледваў хрысьціян. Потым чудоўна быў прызваны Самым Госпадам да апостальскай працы, якую праводзіў сярод многіх, асабліва паганскіх народаў. За пропаведзь веры Хрыстовай выцярпеў многа мукаў і быў сьцяты ў Рыме ў 67 годзе. Напісаў, пад надыхненьнем ад Духа Сьвятога, 14 Пасланьняў з глыбокім зьместом.

Памяць Сьвв. Апп. Пятра і Паўла сьвяткуецца 29 чэрвеня—12 ліпня.

### Сьв. Ап. Андрэй Першазваны.

Сьв. Ап. Андрэй Першазваны—брат Сьв. Ап. Пятра. Ён першы з Апосталаў быў прызваны Ісусам Хрыстом і пашоў за Ім. Шырыў веру Хрыстову сярод мно-... іншым, ёсьць прыпушчэньне, што быў

vytoki.net



сярод рускіх славянаў і паставіў Сьв. Хрэст на горах Кіеўскіх. За распаўсюджаньне веры Хрыстовай быў расьпяты на косым храсьце (на ўзор буквы **Х**), блізка 62 году.

Памяць яго сьвяткуецца 30 лістапада—13 сьнежня.

### Сьв. Раўнаапостальная Марыя Магдаліна.

Сьв. Марыя Магдаліна (з гор. Магдалы) — адна з жанчын, якія пайшлі за Ісусам Хрыстом. З яе Сын Божы выгнаў 7 бесаў, пасьля чаго яна не пакідала Хрыста. Марыя першая з верных даведалася аб уваскрасеньні Хрыстовым, ад яе-ж пашоў звычай хрыстосавацца на Вялікдзень словамі: «Хрыстос уваскрос» і дарыць чырвонае яечка, на знак вечнага жыцьця, дарованага нам уваскрасеньнем Хрыстовым.

Па ўшэсьці Хрыста на неба Марыя Магдаліна прапаведала сьв. веру паганцам і памёрла ў м. Эфэсе, ў 1 сталецьці.

Памяць сьвяткуецца 22 ліпеня—4 жніўня.

### Сьвв. Мучаніцы Вера, Надзея, Любоў і матка іх Софія.

Сьвв. сёстры — Вера 12-цёх год, Надзея 10-цёх і Любоў—9-х,—адна за другою, як хрысьціянкі, на вачох маткі былі абязглаўлены. На трэці дзень па іх сьмерці, ад тугі, на магіле іх, сканала матка Софія. Было гэта ў Рыме ў 137 годзе.

Сьвяткуецца іх памяць 17—30 верасьня.

### Сьв. Вялікамучаніца Варвара.

Сьв. Вялікамучаніца Варвара — дачка радавітага і заможнага язычніка; за вызнаньне веры Хрыстовай выцярпела вялікія мукі спачатку ад бацькі, а потым ад начальніка гораду; ўрэшце сьцяў ёй галаву родны бацька каля 306 г. Сьв. Мошчы мучаніцы знаходзяцца ў Кіеўскім Міхайлаўскім манастыры.

Сьв. Вялікамучаніцы Варвары моляцца аб збаўленьні ад нечаканай сьмерці.

Памяць яе сьвяткуецца 4—17 сьнежня.

### Сьв. Раўнаапостальныя Цар Канстантын і Царыца Алёна.

Сьв. Канстантын быў спачатку паганцам. У 313 годзе, па волі Божай, бачыў ён на небе Сьв. Хрэст з напісам: «Гэтым пераможаш», і паверыў у Ісуса Хрыста. Сьв. Канстантын першы з цароў падтрымаў веру Хрыстовую, распаўсюджваючы яе ў сваім царстве, будуючы храмы, бароначы веру ад паганцаў і гэрэтыкоў. У 325 г. ён склікаў першы Сусьветны Сабор, на якім Сьв. Айцы напісалі 7 першых артыкулаў нашага Знаку веры. Памёр Сьв. Канстантын у 337 годзе.

Сьв. Алёна, маці Цара Канстантына, ў 326 г. знайшла ў Ерусаліме Жыцьцятворчы Хрэст Гасподні, пабудавала многа цэркваў, шчодра памагала бедным. Сканала ў 327 г.

Памяць іх сьвяткуецца 21 траўня—3 чэрвеня.

### Сусьветныя Саборы.

Царква пасьля Апосталаў у сваім унутраным жыцьці кіравалася Сьв. Пісаньнем, пераказамі вуснай апостальскай навукі (Апостальскім Паданьнем). У асаблівых выпадках, калі трэба было асудзіць ілжывую навуку, або вырашаць сумлiўнае пытаньне, скліканіся **Саборы**. Саборы могуць быць **Сусьветныя**, калі зьбіраюцца Пастыры і Вучыцялі з усіх Цэркваў сьвету, або **Памесныя**, скліканыя асобнай Царквой у пэўным гаспадарстве. **Дзевяць** такіх Памесных Сабораў і **сем** Сусьветных злажылі і пераказалі патомству свае правілы для кіраўніцтва жыцьцём царкоўным.

На двох першых Сусьветных Саборах, Нікейскім і Канстантынопальскім, быў уложаны Сімвал (знак) Веры, г. зн. кароткая навука веры Хрысьціянскай.

### Сьв. Іоанн Залатавусны, Архіепіскап Канстантынопальскі.

Сьв. Іоанн Залатавусны рос сіратою і быў выхаваны ў веры Хрысьціянскай сваёю багабойнаю маткай Анфусаю. Скончыўшы навуку, ён, для загартаваньня духа, нейкі час правёў у пустыні. Потым, за набожнае

vytoki.net



жыцьцё і знаньне Сьв. Пісаньня быў высьвячаны на Епіскапа. Праходзячы яшчэ перад гэтым служэньне сьвяшчэньніцкае, як і ў сане Епіскапскім, Іоанн часта і красамоўна гаварыў пропаведзі, заклікаючы ў іх слухачоў сваіх да цьвёрдай веры, вымагаючы міласэрдзя і іншых добрых дзел. Сьмела ганячы грахі сучаснага грамадзянства — прагавітасьць (лакомасьць) і скупасьць багатых, пыху, ганарыстасьць, роскаш, ахвоту да гулянак — Сьв. Іоанн нажыў сабе ворагаў, якія зрабілі яму шмат прыкрасьцяў, дабіўшыся высылкі яго, на старасьць, у глухі далёкі край; па дарозе ён у 407 г. аддаў Богу душу.

Сьв. Іоанн напісаў многа карысных кніжак; працаваў таксама над складаньнем малітваў царкоўных і песьняў. Злажыў Сьв. Літургію. За красамоўства ў пропаведзях званы «Залатавусным».

Памяць сьвяткуецца 30 студня і 13 лістапада ст. ст.

### Сьв. Мікалай, Архіепіскап Мірлікійскі, Чудатворац.

Сьв. Мікалай, Архіепіскап Мірлікійскі, Чудатворац, з дзяцінства і да сьмерці праводзіў набожнае і строгае жыцьцё. Стаўшы Епіскапам, быў ціхі, міласьцівы і спагадлівы; і яўна і тайна памагаў бедным і бараніў нявінна пакрыўджаных. Быў прысутным на 1 Сусьветным Саборы, зацята бароначы Праваслаўную веру. Па малітвах яго тварылася многа чудаў. Памёр ў 342 г. Мошчы Сьвяціцеля знаходзяцца ў месьце Бары ў Італіі. Праваслаўныя людзі шчыра паважаюць Сьв. Мікалая, лічачы яго заступнікам ў падарожах на сушы і на моры.

Памяць сьвяткуецца 9 мая і 6 сьнежня ст. ст.

### Сьвв. Раўнаапостальныя Кірыл і Мяфод, Асьветнікі Славянаў.

Сьвятыя Раўнаапостальныя Кірыл і Мяфод, Вучыцелі Славянаў, родныя браты, славянскага паходжаньня. Яны злажылі славянскую азбуку, пераклалі з грэцкай на славянскую мову Сьвяшчэннае Пісаньне і царкоўныя кнігі, завялі ў славян багаслужэньне на іх роднай мове.

Сьв. Кірыл памёр ў 869 годзе ў Рыме, а Сьв. Мяфод — ў 885 годзе, будучы Архіепіскапам Мараўскім. За малітвамі Сьвв. Кірыла і Мяфода, ў дзень іх сьвяткаваньня, ў 1875 г. Холмскія грэка-уніяты злучыліся з Праваслаўнаю Царквою.

Памяць іх сьвяткуецца 11—24 траўня.

## Хрышчэньне Русі і пашырэньне ў ёй Хрысьціянства.

Хрысьціянская вера дасталася на Русь у дзевятым сталецьці*). Княгіня Вольга, гледзячы на чыстае і набожнае жыцьцё хрысьціян, палюбіла іх веру і хрысьцілася ў Канстантынопалі. Але асьвяціць Русь верею хрысьціянскаю суджана было толькі яе ўнуку, князю Уладзіміру. Уладзімір бачыў недарэчнасьць паганскай веры і стаў думаць аб іншай, лепшай. Татары, жыды, немцы і грэкі прысылалі да яго сваіх прапаведнікаў. Князь каб даведацца на месцы, чыя вера лепшая, выправіў да іх пасланцоў. Вярнуўшыся, яны сказалі: «Закон татарскі брыдкі; ня бачылі хараства мы і ў немцаў; калі-ж былі ў царкве ў грэкаў, дык ня ведалі, дзе мы знаходзімся; на небе ці на зямлі, бо няма на зямлі такой прыгожасьці. Хто скаштуе салодкага, не захоча горкага, так і мы — ня хочам іншай веры». Князь і баяры парашылі прыняць веру грэцкую, Праваслаўную.

На другі год пасьля гэтага (ў 988 г.) Уладзімір пайшоў вайною на грэкаў, забраў іх горад Хэрсанес і дамагаўся ад грэцкіх цароў аддачы за яго замуж сястры іх Ганны. Яны абяцалі, пад ўмоваю, калі Уладзімір прыме іх веру. Уладзімір хрысьціўся і ажыніўся з Ганнай. Ён атрымаў ад Грэкаў Мітрапаліта, шэсьць Епіскапаў, шмат сьвяшчэньнікаў і ўсё патрэбнае для багаслужэньня.

Вярнуўшыся ў Кіеў, Уладзімір хрысьціў сваіх сыноў, а пасьля і народ. Ідалаў паганскіх казаў ён зьнішчыць, а на мясцох, дзе яны стаялі, загадаў будаваць хрысьціянскія храмы.

---

vytoki.net рускіх хрысьціліся князі Аскольд і Дір у 867 годзе.



Пасьля хрышчэньня Уладзімір зрабіўся вельмі набожным і памагаў бедным і пакрыўджаным. Дбаў ён і аб пашырэньні хрысьціянства. З Кіева Уладзімір пасылаў сьвяшчэньнікаў да іншых местаў і сёлаў, каб хрысьцілі народ. З помаччу Божай вера Хрыстова распаўсюджылася на ўсёй Русі.

Памяць Раўнаапостальнай Княгіні Вольгі (па хрышчэньні Алены) сьвяткуецца Царквою нашаю 11—24 ліпеня, а памяць Раўнаапостальнага Князя Уладзіміра—15—28 ліпеня.

## Прападобныя Антоні і Хвядос Пячэрскія.

Сьв. Антоні радзіўся ў месьце Любечы (мястэчка ля Чарнігава) і зваўся Анціпам. З маладу пачуў Антоні імкненьне да Бога і, шукаючы набожнасьці, дастаўся на Афон. Тут ў адным з манастыроў пастрыгся ён у манахі, і пасяліўшыся ў пячоры, пачаў труднае падвіжніцкае жыцьцё. Калі пазнаў ён сэнс жыцьця духоўнага, ігумен манастыра запрапанаваў яму ісьці да Кіева і там упарадкаваць манашаства. Антоні паслухаў. У Кіеве ў той час было некалькі манастыроў, заснаваных, на жаданьне князя, грэкамі. Антоні, аднак, не пашоў да іх, але пасяліўся ў глыбокай пячоры, выкапанай прасьвітэрам Гілярым (Іларыёнам). Тут Антоні далей вёў сваё падвіжніцкае жыцьцё. Еў ён толькі чорны хлеб і піў ваду, і то што-другі дзень. Чуткі аб подвігах яго разышліся ня толькі па Кіеве, але дайшлі і да іншых гарадоў. Многа людзей ішло да яго за парадай, многія прасілі яго багаслаэеньня, а шмат хто і труд яго жыцьця хацёў падзяліць. Неахвотна Антоні браў да сябе таварышоў, усё-ж прымаў некаторых. Першым з прынятых быў нейкі Нікан, другім—Хвядос.

**Прападобны Хвядос.** Прападобны Хвядос быў родам з Васільева, Кіеўскай акругі, але змалку жыў у Курску. Быў ён ціхі і багабойны, штодня хадзіў у царкву і шчыра маліўся Богу. Аднаго разу пачуў ён у царкве словы Божыя: «Хто любіць айца або матку больш, як Мяне, недастойны Мене» (Мац. 10, 37). Словы гэтыя так узварушылі хлапца, што ён пакінуў матку сваю (тады ўжо ўдаву) і прышоў у Кіеў да Прападобнага Антонія.

Калі лік супрацоўнікаў Антонія павялічыўся да

12-цёх, Прападобны адышоў ад іх і пасяліўся пры суседняй гары. Хвядос застаўся на старым месцы і быў выбраны ігуменам. Тут давялося яму выканаць вялікую працу — ўпарадкаваць жыцьцё манастырскай брацi на ўзор царгародзкага студыйскага манастыра. Установы гэтага манастыра вымагалі, каб у манахаў усё было агульнае, час-жа праходзіў у малітве і працы, паводле загаду старшага. Прападобны Хвядос строга даглядаў раз устаноўленага парадку. Ён часта хадзіў па кельлях (пакоях), пільнаваў, ці няма ў манахаў чага непатрэбнага, сачыў чым яны займаюцца. Сам Прападобны быў прыкладам для братоў-манахаў. Ён насіў ваду, сёк дровы, працаваў у пякарні. Апрача гэтага Прападобны шырока займаўся справамі міласэрдзя, дбаў і аб духоўнай асьвеце, да чаго заклікаў і іншых манахаў.

З твораў яго ведамы два казаньні да народу, дзесяць навучаньняў да кіева-пячэрскіх інокаў (манахаў), два пісьмы (пасланьні) да князя Ізяслава і дзьве малітвы.

Прападобны Антоні памёр 10 ліпня 1073 году, а Хвядос—3 траўня 1074 году.

Заснаваны Прападобным Антоніем і ўпарадкаваны Прападобным Хвядосам Кіева-Пячэрскі манастыр стаў узорам для іншых манастыроў і асяродкаў асьветы сярод славянскіх плямёнаў. З манастыра гэтага выходзілі багабойныя Архіпастыры, вялікія праведнікі і вучыцялі царкоўныя.

### Прападобная Афрасіньня, Князёўна Полацкая.

Прападобная Афрасіньня (да манашаства — Прадслава), дачка Полацкага князя Сьвятаслава-Юрыя, радзілася ў Полацку ў 1102 годзе. З дзяцінства любіла чытаць сьвятыя кнігі і 12 гадоў цішком (тайна) ад бацькоў, стала манашкай. Заснавала пазьней у Полацку жаночы манастыр і збудавала каменную царкву Сьв. Спаса, якая існуе да апошняга часу разам з кельляю (пакоем), дзе малілася Прападобная. У кельлі гэтай перахаваўся да нашых дзён каштоўны хрэст, як дар Прападобнай Афрасіньні, зроблены полацкім майстрам.

П... астыром і царквой у Полацку Прападобная заснавала яшчэ цэлы рад цэркваў і манастыроў у зямлі Полацкай. Памёрла 1177 г. ў Ерусаліме, куды паехала на паклон Гробу Гасподняму. Мошчы знаходзяцца ў Полацку.

vytoki.net



Памяць сьвяткуецца 23 траўня—5 чэрвеня.

### Сьв. Кірыл, Епіскап Тураўскі.

Сьв. Кірыл, Епіскап Тураўскі, паходзіў з Турава (Менскай акругі). Быў ён заможным чалавекам, але маемасьць сваю аддаў бедным і ўступіў у Барысаглебскі Тураўскі манастыр, дзе адзначыўся як вялікі падвіжнік і красамоўца. Над просьбу князя і народу быў высьвечаны на Тураўскага Епіскапа. У служэньні сьвяціцельскім уславіўся пісаньнем прыгожых малітваў, песьняў царкоўных і асабліва пропаведзяў. За красамоўства прызывалі яго «Залатавусным». Памёр ў 1183 годзе.

Памяць сьвяткуецца 28 красавіка—11 траўня.

### Сьв. Багаверны Князь Аляксандар Неўскі.

Сьв. Багаверны Князь Аляксандар Неўскі з маленства адзначаўся набожнасьцяй, любіў чытаць сьв. кнігі і сьпеў царкоўны. Князем быў мудрым і міласэрным. За перамогу (швэдаў над Нявою) празываецца «Неўскім». Ён адмовіўся ад прапазыкі Рымскага Папы прыняць каталіцтва. Княжыў у першыя гады татарскай няволі і сваім тактам выратаваў Русь ад многіх прыкрасьцяў. Перад сьмерцяй прыняў пастрыжэньне ў манахі з імем Аляксея. Памёр ў 1263 годзе.

Памяць сьвяткуецца 30 жніўня і 23 лістапада ст. ст.

### Сьвв. Віленскія мучанікі і дзіватворцы Антоній, Іоанн і Евстафій — патроны Беларусі.

Сьвв. мучанікі Антоній, Іоанн і Евстафій да хрышчэньня зваліся: Няжыла, Кумец і Круглец. Былі яны любымі слугамі вялікага князя Альгерда літоўскага і займалі пры яго двары высокія пасады. Прыняўшы Праваслаўную веру, Антоній і Іоанн зракліся сваіх паганскіх звычаяў і пачалі зусім новае жыцьцё, як таго

вымагаў хрысьціянскі закон. Тады паганскія жрацы абвінавацілі іх перад вялікім князем у здрадзе веры бацькоў. Антоній і Іоанн адважна і сьмела выспаведалі сябе хрысьціянамі. Па дамаганьню жрацоў, якія мелі яшчэ ў народзе і пры двары вялікі ўплыў, Альгерд, ня хочучы наражаць сябе на небясьпеку, загадаў кінуць братоў у турму, а пасьля і павесіць. Павешаны яны былі (14—24 красавіка 1347 г.) на тым самым мейсцы, дзе цяпер стаіць манастыр Сьв. Тройцы. Тады там быў дубовы гай, у якім прыносіліся ахвяры паганскім багом.

Хутка пасьля таго далучыўся да сьв. братоў іх сваяк Евстафій, адзін з Альгердавае дружыны—чалавек малады, прыгожы, разумны,—яго вельмі любіў Альгерд. Прыняўшы Праваслаўную веру, ён ня толькі сьмела выспавядаў сябе хрысьціянінам, але пачаў і князевую дружыну пераконваць, каб прынялі веру Хрыстову. Тады пачалі яго катаваць, а напасьледак павесілі на тым самым дубе, дзе нядаўна былі павешаны Сьвв. Антоній і Іоанн (13.XII. 1347 г.).

Пахаваны былі Сьвв. Мучанікі ў Мікалаеўскай царкве, скуль мошчы іх з працягам часу былі перанесены у царкву, якую пабудавала на мейсцы іх мучанічаскае канчыны другая жонка Альгерда, вял. княгіня Юльяна Цьверская. Царква гэтая была прысьвечана ў імя Сьв. Тройцы, на ўспамін «Сьвятой Тройцы раўналічных» мучанікаў. У палове XVII веку мошчы іх былі перанесены ў манастыр Сьв. Духа, дзе і заставаліся да самае Вялікае вайны 1914 г. Вайною мошчы вывезены ў Маскву, дзе і знаходзяцца да гэтага часу.

Сьв. Мучанікі — спадарожнікі ўсяе гістарычнае мінуўшчыны Беларусі, нашы заўсёдныя і запраўдныя заступнікі перад Богам і абаронцы веры Праваслаўнай, таму памяць аб іх для нас памяць сьвятая, імя іх — імя багаславеннае.

Памяць Сьв. Віленскіх Мучанікаў сьвяткуецца 14—27 красавіка.

### Прападобны Сяргей Раданежаскі.

Прападобны Сяргей Раданежаскі (з гор. Раданежа, каля Масквы) з маленства задзіўляў усіх вялікай набожнасьцю і ўстрыманасьцю; стараніўся пустой гульні

vytoki.net



і забаваў, шчыра маліўся Богу, жывіўся толькі хлебам і вадою. Па малітвах атрымаў ад Бога здольнасьць да кніжнай навукі і мудрасьці. Заснаваў Траецка-Сяргееўскую Лаўру (60 вёрст ад Масквы) і быў у ёй ігуменам. Будучы вельмі пакорным, адмовіўся ад пасьвячэньня на Епіскапа. За жыцьцё сьвятое і вялікія подвігі манашескія спадобіўся Прападобны чудоўнага зьяўленьня яму ў кельлі Мацеры Божай з Сьвв. Апосталамі Пятром і Іоаннам. Малітвамі сваімі памагаў людзям і тварыў чуды. Памёр 1392 г. Сьв. мошчы яго знаходзіліся ў Траецка-Сяргееўскай Лаўры.

Памяць сьвяткуецца 5 ліпеня і 25 верасьня ст. ст.

### Сьвяшчэннамучанік Мітрапаліт Макары.

Сьвяшчэннамучанік Мітрапаліт Макары паходзіў з Беларусі. У манашастве адзначыўся набожнасьцю, за што быў вызначаны настаяцелем Віленскага Сьвята-Траецкага манастыра (1481—1495 г.), а потым Мітрапалітам Кіеўскім і ўсяе Русі. На Мітрапаліта пастаўленьне прыняў у Віленскім Прачысьценскім саборы. Па дарозе з Вільні ў Кіеў, дзе была кафедра Мітрапаліта, замучылі яго татары блізка м. Скрыгалава, Менскай губ. ў 1497 г. Сьв. мошчы знаходзяцца ў Кіева-Пячэрскай Лаўры. У Віленскім Прачысьценскім саборы ёсьць прыдзел, прысьвечаны яго імені.

Мітрапаліт Макары — моцны абаронца Праваслаўнае веры і мудры будаўнічы царкоўнага жыцьця. Ён пільна сачыў, каб захоўваліся ў Праваслаўнай Царкве ўсе ўставы і абрады царкоўныя і каб праваслаўныя храмы (ў Вільні было тады больш за 15 храмаў) мелі адпаведны ўнутраны і вонкавы выгляд. Ён дапускаў шырокае ўчасьце міран у справах царкоўных: у той час па ўсёй Беларусі і Украіне шмат закладалася царкоўных брацтваў, бо паўстала вялікая небясьпека для праваслаўнае царквы з боку яе ворагаў.

Памяць сьвяткуецца 1—14 траўня.

### Зьяўленьне Божай Мацеры на Гары Пачаеўскай.

Аб гэтым існуе такое паданьне: каля 1240 году Божая Маці зьявілася на скале Пачаеўскай гары ў агнявым стаўпе і пакінула на камені сьлед правай

нагі, з якога сьцякала чыстая вада, што памагала ад хваробаў. Вада гэтая і цяпер зьбягае каплямі ў сярэдзіну гары, у пячору, і тут зьбіраецца ў асаблівую судзіну, скуль раздаецца багамольцам.

### Чудатворная Ікона Пачаеўскай Божай Мацеры.

Ікону гэтую прынёс ў 1559 годзе з Канстантынопаля Мітрапаліт Нэафіт і багаславіў ёю праваслаўную памешчыцу Ганну Гойскую, што жыла недалёка Пачаева. Гэтая набожная жанчына, пераканаўшыся вачавідкі, што ікона чудатворная, палічыла недастойнай сябе трымаць гэты скарб ўдому, і аддала яе ў дар манастыру Пачаеўскаму.

Памяць яе абходзіцца 8—21 верасьня.

### Прападобны Іоў Пачаеўскі.

Прападобны Іоў (з паходжаньня Іван Жалеза) радзіўся ў Галіцыі ў палове 16 стагодзьзя ад праваслаўных багабойных бацькоў. На 12 годзе прыняў ён пострыг манашаскі ў Вугорніцкім манастыры, а пазьней даслужыўся сьвяшчэньніцкага званьня. Багаверны князь Канстантын Астрожаскі запрасіў Прападобнага Іова на Валынь для абароны і ўмацаваньня Веры Праваслаўнай і вызначыў яго ігуменам Дубенскага манастыра. Давёўшы да парадку Дубенскі манастыр і навучыўшы ваколічны народ любіць і шанаваць сваю Праваслаўную веру, Прападобны адышоў на Гару Пачаеўскую, дзе інокі ўпрасілі яго быць у іх ігуменам. Тут Прападобны Іоў яшчэ больш палажыў трудоў, малітваю і заступленьнем сваім баронячы Сьв. Лаўру Пачаеўскую ад усіх ворагаў. Памёр Угоднік Божы 28 кастрычніка 1651 году, а цераз 8 гадоў, 28 жніўня 1659 году, былі адкрыты яго нятленныя мошчы, якія да апошняга часу знаходзяцца ў Пачаеўскай Лаўры ў царкве Імя Сьв. Іова.

Дзень Прападобнага Іова сьвяткуецца 6 траўня, 28 жніўня і 28 кастрычніка ст. ст.



### Віленская Ікона Божай Мацеры (Одігітрыі).

Як перадаюць, ікона гэтая намалёвана Сьв. Евангелістым Лукою. Ёю багаславіў Маскоўскі цар Іван III дачку сваю Алёну, аддаючы ў 1494 г. замуж за літоўскага князя Аляксандра. Сьпярша яна знаходзілася ў Прачысьценскім Саборы ў Вільні, потым перанясьлі яе (ў 1715 г.) ў Сьв.-Траецкі манастыр, адкуль вывязьлі ў 1915 г. ў Маскву. Там яна й цяпер. У Вільні ёсьць толькі копія гэтай глыбока шанаванай праваслаўнымі беларусамі іконы.

Сьвята Божай Мацеры Одигітрыі 15—28 красавіка.

### Жыровіцкая Ікона Божай Мацеры.

Жыровіцкая Ікона Божай Мацеры аб'явілася ў 1470 годзе на дрэве ў яркім агнявым зьяньні і была аддана пастухамі, што яе заўважылі, свайму гаспадару, Аляксандру Солтану, які схаваў яе, каб паказаць родзічам і знаёмым. Калі, аднак, склікаў іх, ня было чаго паказваць — ікона зьнікла. Потым яе знайшлі на старым месцы ў лесе і йзноў прынясьлі Солтану. Лічачы сябе недастойным трымаць такую сьвятую ікону дома, Солтан збудуваў на месцы яе зьяўленьня храм. Па пэўным часе храм згарэў, але ікона чудоўна засталася цэлай і пазьней многімі чудамі, ад яе паходзячымі, стала ведамай праваслаўнаму народу, што й да апошняга часу шчыра да яе моліцца, асабліва-ж сьвяткуючы ёй 7—20 траўня.

### Прападобнамучанік Афанасі Берасьцейскі.

Сучасьнікам ведамага Мітрапаліта Пятра Магілы і Прападобнага Іова Пачаеўскага быў вялікі сьветач Праваслаўя Прападобнамучанік Апанас Берасьцейскі. Паходзіў ён з добрай сям'і і атрымаў высокую асьвету. У 1627 годзе прыняў Апанас манашаства ў Вільні і хутка стаў намесьнікам Дубайскага манастыра пад Пінскам, а потым Ігуменам Берасьцейскага Сымонавага манастыра. Прападобны вельмі часта і горача маліўся

vytoki.net

аб захаваньні Праваслаўнай веры, заступаўся за праваслаўных і перад грамадзкімі ўладамі. За адданасьць Веры Праваслаўнай давялося Прападобнаму Апанасу шмат пацярпець уціску, зьняваґі і нават адсядзець у вастрозе.

Вясною 1648 г., калі падняў вайну процiў Польшчы казацкі гэтман Багдан Хмяльніцкі, Прападобны Апанас прыняў мучаніцкую канчыну, няспраўядліва абвінавачаны ў здрадзе Польскаму каралю. Цела яго ляжала непахаваным восем месяцаў (ад 5 верасьня да 8 мая) і засталося нятленным, чаму скора па сьмерці Прападобны быў прызнаны Сьвятым. У 1666 годзе ў Берасьці было зложана апісаньне жыцьця яго, дзе Апанас завецца «Сьвятым і Прападобнамучанікам».

У 1816 годзе мошчы Сьв. Апанаса згарэлі разам з дзеравянай царквой Сымона Стоўпніка. Рэшткі іх перахаваліся аднак да апошніх дзён.

Памяць Прападобнамучаніка Афанасія сьвяткуецца 20 ліпеня і 5 верасьня ст. ст.

---

# Праваслаўная Вера на Беларусі.

## Пачатак Веры Праваслаўнай на Беларусі.

На Беларусі Праваслаўная Вера пашыралася з Кіева ў XI—XIII сталецьцi ўва ўсіх галаўнейшых асяродзях тагачаснае Беларусі, населенай крывічамі, дрыгвічамі і радзімічамі (прэдкі беларусаў), былі ўжо праваслаўныя цэрквы, духавенства, дзе-ня-дзя манастыры пры іх школы. Так, у Полацку была школа, у якой вучылася 300 дзяцей. Багаслужэньне адбывалася на славянскай мове, якая тады была вельмі блізкая да жывой народнай гутаркі. На славянскай-жа мове чыталі і кнігі Сьвяшчэннага Пісаньня: яны былі ўжо перакладзены на гэтую мову сьв. братамі Кірылам і Мяфодам, Асьветнікамі славянаў. Адначасна засналіся і Епіскапскія кафэдры ў Полацку, Пінску ці Тураве і Смаленску. Духавенства было пераважна выбранае, з мясцовых людзей, якія добра зналі жыцьцё і рэлігійныя патрэбы сваіх прыхаджанаў. Наагул народ прыймаў шырокае ўчасьце ў жыцьці царкоўным. Ужо з XII веку пачынаюць закладацца пры цэрквах брацтвы: так у 1167 г. заснавалася брацтва пры саборнай царкве ў Полацку. У склад брацтваў уваходзілі праваслаўныя людзі розных станаў грамадзянства — ад багатых і знатных, на чале з князямі, да самых бедных і простых. Брацтвы будавалі і падтрымлівалі храмы, выбіралі духавенства, клапаціліся аб дапамозе бедным свайго прыходу і г. д. Кіравалася царква на Беларусі сваімі Епіскапамі, якія падпарадкаваліся Кіеўскім Мітрапалітам, а праз іх Канстантынопальскаму Патрыярху. У важных выпадках, як напр. выбары Мітрапаліта, Епіскапы зьбіраліся на Сабор. Так, у 1411—1414 г.г. быў Сабор у Навагрудку; яшчэ пазьней, імення ў 1509 г. быў Сабор Епіскапаў у Вільні для ўпарадкаваньня тагачаснага царкоўнага жыцьця.

vytoki.net

## Праваслаўная Вера ў злучанай Літоўска-Беларускай Дзяржаве.

Калі Беларусь (па тагачаснаму «Русь») знаходзі
лася ў складзе Літоўска-Беларускае Дзяржавы (XIV—XV
в.в. і пазьней), яна ня толькі захоўвала Веру Права
слаўную, родную мову і культуру, але пашырала гэты
сваё ўплывы і на самую Літву. Шмат літвіноў з бега
часу прыняло Праваслаўную Веру. Вялікія князі літоў-
скія Гэдымін і Альгерд, пры якіх Літоўска-Беларуская
Дзяржава дасягнула найбольшай магутнасьці, былі па
веры праваслаўныя. Падчас кіраваньня Альгерда больш
як 50 удзельных князёў літоўскіх былі Веры Праваслаў-
най. Літоўскія князі жаніліся з праваслаўнымі князеў-
намі, і дзеці іх заставаліся праваслаўнымі. У палацы
вялікіх князёў маліліся па Праваславнаму, а гаварылі
пабеларуску, бо і дзяржаўная мова ў Літве была **бела-
руская** (аж да самага канца XVII сталецьця). Наколькі
было пашырана тады Праваслаўе, сьведчыць тое, што
ў сталіцы Літоўска-Беларускае Дзяржавы—Вільні ў дру-
гой палове XV веку было больш за 15 праваслаўных
храмаў, пабудованых пераважна з пачыну і пры пад-
трыманьні вялікіх княгіняў.

## Пашырэньне Праваслаўнае Царквы на Беларусі у XV—XVI в. в.

XV –XVI векі і першая палова XVII в., ня гледзя-
чы на пашырэньне на Беларусі каталіцтва і некаторыя
праўныя абмежаваньні праваслаўных з боку вялікіх кня-
зёў, цяпер ўжо каталікоў, былі вякамі шырокага росквi-
ту праваслаўнае царквы. У гэтым пэрыядзе заснавалася
шмат новых манастыроў, шырока йдзе будаўніцтва хра-
маў па вёсках; беларускіе магнаты, баяры і шляхта не
шкадуюць коштаў на іх падтрыманьне. Вялікія князі
асобнымі граматамі вызначаюць цэрквам і манастыром
багатыя фундацыі — зямлю, лясы, вазёры і г. д. Блізу
кожная царква мела свайго патрона ці апякуна, пера-
важна з багатых і знатных мясцовых людзей, які браў
на сябе абавязак падтрымліваць і прыходзкі храм і ду-
хавенства. Пад канец гэтага пэрыяду ўся Беларусь па-
...ткаю брацтваў (у 1458 г. заснавалася
...), якія выходзяць цяпер пераважна на

vytoki.net



абарону Веры Праваслаўнай, бо зьявілася вялікая не-
бясьпека і з боку каталіцтва і вуніі, і з боку пратэстан-
ства ды розных пратэстанцкіх сэктаў, ішоўшых праз
Польшчу з Захаду. Гэтая небясьпека высоўвае што раз
болей і болей патрэбу духоўнае асьветы, і яна на Бе-
ларусі пашыраецца і паглыбляецца. Каб здаволіць гэ-
тую патрэбу, закладаецца шмат друкарняў. Друкарні
раскідаліся па ўсёй Беларусі, па вялікіх і малых гара-
дох, як Вільня, Полацак, Магілёў, Віцебск, Менск, Ня-
сьвіж, Любча, Слуцак, Пінск, Заблудава, Заслаўе, Су-
прасьль, Еўе і г. д. Друкуюцца пераважна духоўныя ці
царкоўныя кнігі, бо наагул асьвета таго часу носіць
такі характар. А д-р Юры—Францішак Скарына з По-
лацку перакладае на сучасную яму беларускую мову
амаль усе кнігі Сьв. Пісаньня, каб яны былі даступны ня
толькі вучоным, але і простым людзям.

## Заняпад Праваслаўнае Царквы на Беларусі ў XVII—XVIII в. в.

У XVII—XVIII веку Праваслаўе на Беларусі пасту-
пова заняпадае. З часу вядомай Берасьцейскай царкоў-
най вуніі (1596 г.) Праваслаўная Царква фармальна
траціць права існаваньня. Яе месца павінна заступіць
і часткова заступіла вунія, г. зн. царква, якая, пры за-
хаваньні праваслаўнага багаслужэбнага абраду на сла-
вянскай мове, падпарадкавалася папе рымскаму,
які стаіць на чале каталіцкага касьцёлу. На падставе
каралеўскага загаду, да вуніятаў адна за аднэй пера-
ходзяць Праваслаўныя Цэрквы і манастыры, са ўсёй
іхнай маемасьцяй. Пераходзіць у вунію і частка духа-
венства, хто пад прымусам, а хто і дабравольна, спа-
кушаны больш забясьпечаным і спакойным жыцьцём.
Епіскапскія кафэдры праваслаўныя ўсе былі скасованы.
Ад 1710 году блізу да канца XVIII ст. засталася толькі
адна праваслаўная епіскапская кафэдра ў Магілёве на
Дняпры. У той час на Беларусі была паншчына і на-
род быў паняволены, дзеля гэтага часта здараліся пе-
раходы праваслаўных у вунію. За два сталецьці перай-
шло ў вунію больш за 1½ мільёны праваслаўных бела-
русаў. Шмат хто з іх, асабліва людзі заможнейшых кля-
саў, страцілі з працягам часу ня толькі веру сваю, але
мову і ўсё аблічча сваё народнае.

Ад усяе гэтае небясьпекі праваслаўныя, як маглі, бараніліся. Бараніліся праз суды, праз паслоў у Сойме польскім і г. д. Асабліва доўга і моцна бараніліся царкоўныя брацтвы, апіраючыся перш за усё на беларускае селянства і вернае Праваслаўнай Царкве вясковае духавенства. Ня гледзячы на прыгон, беларуская вёска выказала найбольшую цьвёрдасьць і адданасьць веры сваіх дзядоў і прадзедаў.

## XIX і XX век у гісторыі Беларускае Праваслаўнае Царквы.

З пачаткам XIX веку Праваслаўе на Беларусі ізноў патроху ажывае і набіраецца сілы: узнаўляюцца епіскапскія кафэдры, зварочваюцца перайшоўшыя да вуніятаў цэрквы і манастыры, з іхняю маемасьцяй. Народ масамі — калі дабравольна, а калі пад прымусам варочаўся з вуніі ў Царкву Праваслаўную, як-то было ў 1791—1792 г.г., у 1839 г. і інш. Да самай вялікай вайны (1914 г.) Праваслаўнай Царкве на Беларусі нішто не перашкаджала існаваць і разьвівацца. Адно толькі — было забаронена друкаваць на беларускай мове кніжкі, ужываць беларускую мову ў пропаведзях, пры выкладаньні ў школах Закону Божага і інш. Пасьля вайны, якая Рыскім трактатам падзяліла Беларусь на дзьве часьці, Праваслаўе спаткаў неаднолькавы лёс: ува Усходняй Беларусі Праваслаўная Вера, як і наагул усялякая рэлігія, прасьледуецца, хаця ёсьць там і цэрквы і духавенства (пазбаўленае правоў), а ў Заходняй Беларусі (пад Польшчай) Праваслаўная Царква існуе свабодна. Ёсьць пяць Праваслаўных епархіяў, ёсьць с... віні і вышэйшая школа для падгатоўкі маладых ... шчэньнікаў. Духавенства карыстаецца правамі і мае матар'яльнае падтрыманьне ад ураду. У апошнія гады набывае сабе больш і больш прызнаньня ў царкоўным жыцьці беларуская мова.

З 1925 году Праваслаўная Царква ў Польшчы, раней падпарадкаваная Маскоўскаму Патрыарху, ўрачыста была аб'яўлена Аўтакефальнай, г. зн. незалежнаю ў сваім унутраным жыцьці і кіраўніцтве, аднак у пэўных ... падпарадкаванаю Канстантынопальскаму Пат... але сучаснай Праваслаўнай Іерархіі ў Поль... ...го Блажэнства, **Мітрапаліт Дзіянісі.**

vytoki.net



Стр.


Прытча аб міласэрным самараніне . . . . . 108
Прытча аб блудным сыне . —
Прытча аб багатым і ўбогім . . . . . . . 109
Прытча аб мытару і фарысэі . . . . . . 110
Багаславеньне дзяцей . —
Уваскрашэньне Лазара . 111
Урачысты уваход Ісуса Хрыста ў Ерусалім . . 113
Запаведзі аб любові да Бога і да бліжняга . . 114
Ахвяра беднае ўдавы . . —
Вобраз страшнага суду Божага . . . . . 115
Пастанова Сынэдрыёну аб тым, каб забіць Ісуса Хрыста. Здрада Юды . 116
Тайная вячэра . . . . —
Маленьне аб чашы ў садзе Гэфсіманскім . . 118
Узяцьце Ісуса Хрыста . —
Ісус Хрыстос на судзе ў першасьвяшчэньнікаў . . 119
Суд над Ісусом Хрыстом у Понтыя Пілата. Суд Ірада . . . . . . . —
Расьпяцьце Ісуса Хрыста і сьмерць Яго . . . . 121
Пахаваньне Госпада . . 123
Уваскрасеньне Хрыста . 124
Зьяўленьні ўваскросшага Хрыста-Спасіцеля Апосталам . . . . . . 126
Узьнясеньне Госпада на неба . . . . . . . 127
Зыходжаньне Сьвятога Духа на Апосталаў . . 128
Усьпеньне Божай Мацеры 130
Узьвіжаньне Храста Госпадняга . . . . . . 131
Малітва Храсту . . . . 132


**Праваслаўная Вера.**


Праваслаўная навука аб Богу ў Тройцы Сьвятой 134


Стр.


Праваслаўная навука аб Царкве . . . . . 135
Праваслаўная навука аб Сьвятых Таінствах . 136
Пасты Праваслаўнай Царквы . . . . . . . 137
Храм Божы . . . . . 138
Багаслужэньне . . . . —
Літургія (Абедня) . . . 139


**З царкоўнай гісторыі.**


Прапаведзь Апосталаў . 143
Сьвяшчэннае Пісаньне Новага Завету . . . —
Сьвятыя Першавярхоўныя Апосталы Пётр і Павал 144
Сьв. Ап. Андрэй Першазваны . . . . . . —
Сьв. Раўнаапостальная Марыя Магдаліна . . . 145
Сьвв. Мучаніцы Вера, Надзея, Любоў і матка іх Софія . . . . . . . —
Сьв. Вялікамучаніца Варвара . . . . . . . —
Сьвв. Раўнаапостальныя Цар Канстантын і Царыца Алёна . . . . . 146
Сусьветныя Саборы . . —
Сьв. Іоанн Залатавусны, Архіепіскап Канстантынопальскі . . . . . —
Сьв. Мікалай, Архіепіскап Мірлікійскі, Чудатворац 147
Сьвв. Раўнаапостальныя Кірыл і Мяфод, Асьветнікі Славянаў . . . . —
Хрышчэньне Русі і пашырэньне ў ёй Хрысьціянства . . . . . . 148
Прападобныя Антоні і Хвядос Пячэрскія . . . 149
Прападобная Афрасіньня, Князёўна Полацкая . . 150
Сьв. Кірыл, Епіскап Тураўскі . . . . . . 151

Стр.
Сьв. Багаверны Князь Аляксандар Неўскі . . . 151
Сьвв. Віленскія мучанікі і дзіватворцы Антоній, Іоанн і Евстафій—патроны Беларусі . . . . —
Прападобны Сяргей Раданежаскі . . . . . . 152
Сьвяшчэннамучанік Мітрапаліт Макары . . . . 153
Зьяўленьне Божай Мацеры на Гары Пачаеўскай —
Чудатворная Ікона Пачаеўскай Божай Мацеры 154
Прападобны Іоў Пачаеўскі —
Віленская Ікона Божай Мацеры (Одігітрыі) . . 155
Жыровіцкая Ікона Божай Мацеры . . . . . . —

Стр.
Прападобнамучанік Афафанасі Берасьцейскі . 155

**Праваслаўная вера на Беларусі.**

Пачатак Веры Праваслаўнай на Беларусі . . . 157
Праваслаўная Вера ў злучанай Літоўска-Беларускай Дзяржаве . . . 158
Пашырэньне Праваслаўнае Царквы на Беларусі у XV—XVI в. в. . . —
Заняпад Праваслаўнае Царквы на Беларусі у XVII—XVIII в.в. . . . 159
XIX і XX век у гісторыі Беларускае Праваслаўнае Царквы . . . . 160

---

## ЗМЕСТ:

Стр.

**Да дзяцей.**

Беларускі альфабэт (азбука) і практыкаваньні ў чытаньні . . . . . . 3
Практыкаваньні ў чытаньні і пісаньні . . . . . 23
Літары слав. і беларускія 24
Уступная гутарка з дзяцьмі 26
Гутарка аб Богу . . . . 27

**Навучаньне малітваў.**

Аб малітве . . . . . . 28
Аб вонкавых знаках малітвы . . . . . . . 29
Аб малітве дома перад абразамі і ў царкве . . 30
Аб багаславеньні сьвяшчэньніка . . . . . 31

**Штодзенныя малітвы.**

Малітвы пачатковыя . . 32
Малітва Сьвятому Духу . 33
Ангельская песьня . . . 35
Праслаўленьне Бога . . —
Малітва да Прасьв. Тройцы 36
Малітва Гасподняя . . . 37
Ангельскае прывітаньне Мацеры Божай . . . 39
Малітва за бацькаўшчыну 40
Малітва Праведнага Іова Многапакутнага . . . 41
Малітва багабойнага разбойніка . . . . . . 42
Сімвал (вызнаньне) Праваслаўнае Веры . . . —
Дзесяць запаведзяў Закону Божага . . . . . . 47
Дзьве галоўныя запаведзі Божыя . . . . . . 50

Стр.
Малітва ранічная . . . 51
Малітва вячэрняя . . . —
Малітва ангелу-храніцелю 52
Малітва за жывых . . . —
Малітва за памёршых . . 53
Пахвала Божай Мацеры . —
Малітва Багародзіце . . 55
Малітвы канцовыя . . . —
Малітвы на пачатку і пры канцы добрага дзела . 56
Малітва перад абедам і вячэраю . . . . . . —
Малітва па абедзе і вячэры —
Малітва перад вучэньнем 57
Малітва пасьля вучэньня 58
Малітва сьвятому, імя якога носіш . . . . . . —
Малітва Багародзіце . . 59
Малітва перад прычашчэньнем . . . . . —

**Стары Завет.**

Паняцьце аб ангелах. Стварэньне сьвету . . . . 61
Стварэньне чалавека . . 62
Жыцьцё першых людзей у раі. Грэхападзеньне прабацькоў нашых. Кара за грэх. Абяцаньне Збавіцеля . . . . . —
Жыцьцё першых людзей па-за раем. Дзеці Адама і Эвы . . . . . . 63
Патрыархі . . . . . . —
Сусьветны патоп . . . 64
Паяўленьне ідалапаклонства . . . . . . . . 65
Аўраам. Зьяўленьне Бога Аўрааму . . . . . . —
Прынашэньне Ісаака ў

vytoki.net

Стр.
ахвяру Богу . . . . 66
Сон Якава, сына Ісаака . —
Гісторыя Іосіфа . . . . 67
Іосіф у Эгіпце . . . . —
Падарожа ў Эгіпэт братоў Іосіфа . . . . 68
Перасяленьне Якава ў Эгіпэт. Яўрэі ў Эгіпце . . 69
Майсей. Узгадаваньня Майсея. Уцёк яго з Эгіпту . 70
Прызваньне Майсея. Паварот Майсея ў Эгіпэт. Майсей перад фараонам (царом) . . . . . . 71
Пасха і выхад яўрэяў з Эгіпту . . . . . . —
Пераход яўрэяў цераз Чырвонае мора . . . . 72
У гары Сінайской. Дараваньне 10 запаведзяў . 73
Скінія Майсеева . . . . —
Вандраваньне яўрэяў па пустыні . . . . . . 74
Уваход яўрэяў у Зямлю Абяцаную . . . . . 75
Судзьзі. Прарок Самуіл . —
Саул, першы цар яўрэйскі 76
Памазаньне Давіда на царства. Узвышэньне Давіда . . . . . . . 77
Зацараваньне Давіда (1060 г. да Хр. Нар.) Заваяваньне Ерусаліму. Новая скінія . . . . . —
Цар Саламон (1020—980 г.г. да Хр. Нар.). Яго мудрасьць . . . . . 78
Будова і асьвячэньне храму Ерусалімскага (1017—1010 г.г. да Нар. Хр.) . 79
Разьдзяленьне яўрэйскага царства на ізраільскае і юдэйскае (980 г. да Нар. Хр.). . . . . . 80
Царства Ізраільскае і Юдэйскае. Іх разбурэньне. Палон Вавілонскі . . . . —
Прарокі . . . . . 81

Стр.
Паварот юдэяў з палону. 85
Юдэі пасьля палону вавілонскага . . . . . —
Мучанікі за веру і бацькаўшчыну. Элеазар і сем братоў Макавеяў . . . 86
Барацьба яўрэяў за веру і свабоду . . . . . 87
Юдэя пад Рымскім панаваньнем. Чаканьне Мэсіі —
Спаўненьне абяцаньня Божага аб пасланьні ў сьвет Спасіцеля . . . 88

## Новы Завет.

Ражаство Прасьвятой Багародзіцы . . . . . 89
Уводзіны ў храм Прасьвятой Багародзіцы . . . 90
Дабравешчаньне Прасьвятой Багародзіцы . . . 91
Ражаство Хрыстова . . 92
Пакланеньне валхвоў (магаў) . . . . . . . 93
Стрэчаньне Гасподняе . 95
Хрышчэньне Госпада . . 96
Першыя вучні Ісуса Хрыста . . . . . . . . 97
Першае чудо ў Кане Галілейскай . . . . . —
Выгнаньне гандляроў з храму . . . . . . . 99
Сьцішэньне буры . . . —
Аб чудах Хрыстовых . . 101
Нагорная пропаведзь . . —
Аб дараваньні крыўдаў і любові да ворагаў . . 102
Аб міласьціне . . . . . 103
Прытча аб сяўбіце . . . 104
Заклік да спрацованых і гаротных . . . . . 105
Чудоўнае насычэньне І. Хрыстом пяцёх тысячаў людзей . . . . . . —
Прэабражэньне Ісуса Хрыста на гары Фавор . . 106.

vytoki.net

У продажы ёсьць кнігі С. Паўловіча:

1. **Праваслаўны малітваслоў на царкоўна-славянскай і беларускай мове** — Сынадальнае выданьне 1933 г. — 48 стр. Цана 50 гр.

Кніжка дапушчана школьнымі ўладамі для ўжываньня ў школах.

2. **Сьвяшчэнная Гісторыя Старага Завету.** — Выданьне аўтара. — Вільня, 1926 г., 160 стр. Цана 1 зл. з перасылкай.

3. Друкуецца Сынадальнай Друкарняй „Сьвяшчэнная Гісторыя Новага Завету“ таго-ж аўтара.

Выпісваць можна з беларускай кнігарні у Вільні, вул. Вострабрамская № 1.

vytoki.net